№ 29 (333) 20 чэрвеня 2003

www.nn.by

Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

Ядомае слова ты, роднае слова!

старонка 12

КамАЗ, дай 500 тысячаў!

Сакрэты беларускай эканомікі.

старонка 5

Кучма піша кнігу

І рыхтуе Януковіча.

старонка 6

Чарнуха ў Опэрным тэатры

Артыкул Юліі Андрэевай.

старонка 14

Сакрэтная місія Мясьніковіча



IREX-PROMEDIA

Немагчымае здарылася. У Вашынгтоне адбыліся сакрэтныя беларуска-амэрыканскія перамовы. Вёў іх ад імя афіцыйнага Менску Міхаіл Мясьніковіч.

Кантакты на дыпляматычным узроўні працягваюцца як у Менску, так і ў Вашынгтоне. Такую інфармацыю, з спасылкаю на дыпляматычныя крыніцы, падаюць расейскія і амэрыканскія СМІ.

Працяг на старонцы 3.

Баптысты пачынаюць грамадзянскае непадпарадкаваньне

Саюз эвангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў зьвярнуўся да старшыні Камітэту па справах рэлігіяў і нацыянальнасьцяў Станіслава Бука зь лістом, у якім паведамляе, што ня можа прыняць на сябе абавязкі, устаноўленыя законам «Аб свабодзе сумленьня і рэлігійных арганізацыях». Фактычна, баптысты — найбольшая пратэстанцкая канфэсія Беларусі — абвесьцілі аб пачатку грамадзянскага непадпарадкаваньня, накшталт таго, якое праславіла вернікаў гэтай канфэсіі ў савецкі час.

Баптысты занепакоеныя тым, што закон «неправамерна абмяжоўвае права грамадзянаў на свабоду сумленьня і веравызнаньня, а таксама перашкаджае рэалізацыі права свабодна распаўсюджваць свае рэлігійныя перакананьні і дзейнічаць у адпаведнасьці зь імі». У законе закладзеная «дыскрымінацыя рэлігійных грамадаў і грамадзянаў паводле прыналежнасьці іх да традыцыйнай і нетрадыцыйнай рэлігіі, што зьяўляецца антыканстытуцыйным. ...Некаторыя нормы, закладзеныя ў законе, несумяшчальныя з рэлігійнымі перакананьнямі вернікаў», — падсумоўваецца ў звароце. Найбольш турбуе баптыстаў абмежаваньне мінімальнае колькасьці грамады 20 асобамі. Саюз ЭХБ просіць С.Бука знайсьці прымальны шлях да вырашэньня гэтае праблемы.

СМ

«Спадчына» today

На зьмену часопісу з рэвалюцыйна-нацыяналістычнымі настроямі пачатку 90-х прыйшло «бюргерскае» выданьне. Дзеячоў Заходняе Беларусі ды паваенных эмігрантаў у ролі культурных герояў замянілі першыя беларускія бізнэсоўцы, вытворцы й прадпрымальнікі. Гэтак выглядае першы нумар абноўленага часопісу «Спадчына».

Зьмена афармленьня, спосабу падачы матэрыялаў і зьместу — з акадэмічна-архіўнага ў папулярна-гістарычны — павялічыла і наклад да 1200 асобнікаў. Галоўны рэдактар «Спадчыны» Аляксей Хадыка запэўнівае, што шмат у часопісе застанецца і ад старой канцэпцыі: «Мы будзем працягваць зьмяшчаць архіўныя матэрыялы, але толькі першасныя публікацыі, а не надрукаваныя БІНіМам, як гэта практыкавалася раней».

Першы абноўлены нумар рэпрэзэнтуе бачаньне беларускай гісторыі праз прызму прыватнае ўласнасьці. І далейшае разьвіцьцё «Спадчыны» пойдзе гэткім шляхам: праз паказ тых набыткаў нашае гісторыі, якія й сёньня будзяць цікавасьць. «Задача часопісу — фармаваць новыя стэрэатыпы беларускага жыцьця на аснове нашых набыткаў. Мы будзем браць усё самае цікавае за ўсю тысячагадовую гісторыю Беларусі, не абмяжоўваючыся нейкім часам ці сацыяльнай групай», — кажа сябар рэдкалегіі Алесь Белы. Гэта ён, аўтар гістарычнага бэстсэлеру «Хроніка Белай Русі», стаў натхняльнікам першага абноўленага нумару.

Новы нумар «Спадчыны» вылучаецца адмысловым дызайнам. У часопісе заўважна пабольшала ілюстрацыяў; апроч асноўнага тэксту, старонкі маюць глосы-вынаскі зь «неабавязковымі», але надзвычай цікавымі камэнтарамі.

Працяг на старонцы 13.

23 чэрвеня — апошні дзень падпіскі на другое паўгодзьдзе. Нагадваем чытачам, што сёлета «НН» праводзіць розыгрыш прызоў між падпісчыкамі. Галоўныя прызы — паездка на Балтыйскае мора і мабільны тэлефон «Siemens». Умовы конкурсу Вы можаце прачытаць на стронцы 8.

«Наша Ніва» запрашае на працу фотарэдактара/макетавальніка — палавека беларускага і настроенага на доўгатэрміновую супрацу. Зьвесткі пра сябе падаваць на эл. адрас nn@promedia.by

Выйшла факсымільнае выданьне «Наша Нівы: Першая беларуская газэта з рысункамі. 1911 г.» Цяпер «Наша Ніва» пачатку стагодзьдзя даступная ня толькі ў бібліятэчных падшыўках, але і ў факсыміле. Чытаецца як захапляльны раман выхаваньня. Пытайцеся ў кнігарнях.

Слоўнік абясцэненых паняткаў

ДЗЯНІС НОСАЎ

Словы, якія за апошняе дзесяцігодзьдзе набылі спэцыфічнае значэньне, усё множацца. Хутка іх стане на цэлы слоўнічак. Ад тых набытых значэньняў нам прыйдзецца доўга адвыкаць. Так, «патрыятызм» будзе трывала асацыявацца зь сьлізкімі хлопчыкамі-бэпэ(эр)эсэмаўцамі ды іхным «Я за бацьку» («...і за матку!», як хтосьці дапісаў на лукамольскай улётцы на койданаўскім вакзале). А бяскрыўднае школьнае слова «вэртыкаль» шмат у каго, асабліва на пэрыфэрыі, абудзіць успаміны пра навязьлівыя тэлефанаваньні з раёну ды «адзіны палітдзень» — ёсьць ужо дзе-нідзе і такая забаўка. Сказаўшы «інтэграцыя», згадаем малінавы звон пабітых чарак ды тэлепацалункі зь Ельцыным і Аляксіем II, а таксама фразу аднаго генэрала: «Беларусы не адседзяцца». «Інтэграцыя» — слова настолькі зацяганае, што працэс аб'яднаньня з Эўразьвязам давядзецца называць неяк іначай.

А колькі трэ будзе адмываць паняткі «дзяржава» і «ўлада»! Бо першае ў разуменьні многіх грамадзянаў азначае «дыктатура», а другое — «рэжым». Гэткае ўспрыманьне можа аўтаматычна перайсьці і на наступную ўладу. Нельга ж чакаць, што яна прынясе нам рай зямны. Наадварот — той уладзе давядзецца ісьці на непапулярныя меры, падвышаць тарыфы, здымаць ільготы, зьнішчаючы рэцыдывы папулісцкага жыцьця не па сродках. Ня ўсім гэта спадабаецца. Тым больш што, «дзякуючы» ўладзе сёньняшняй, у краіне зьявіўся электарат, пратэставы да дзяржавы як такой, — гэткія неўсьвядомленыя анархісты.

Зладзім невялікі экспэрымэнт. Скажэце «Ўкраіна». Ніякіх эмоцыяў? Скажэце «Латвія». Тое самае. А цяпер скажэце «Расея»... Прабрала аж да костак! Цяжка будзе навучыцца вымаўляць гэтае слова спакойна. Навучыцца асацыяваць яго з паняткам «істотны эканамічны партнэр», або «сябры езьдзілі ў Суздаль — вельмі спадабалася». Прыбалты ўжо бязь лішніх эмоцыяў ставяцца да свайго колішняга «славянскага молата» — прэзыдэнт Эстоніі раз нават выступаў па-расейску. З акцэнтам. Зрэшты, нас гэтым ня зьдзівіш.

Трэба доўгі час, каб беларус прывык думаць, што «Канстытуцыя» — рэч трывалая і нязьменная, якую нельга перакрэсьліць дэкрэтам ці рэфэрэндумам. Дарэчы, пра апошні: гэта ці ня самы дыскрэдытаваны з усіх паняткаў. Можа, нават давядзецца замяняць яго на які «плебісцыт», іначай у выніку ніхто па старой завядзёнцы верыць ня будзе.

Яшчэ давядзецца прывыкаць, што «праваахоўныя органы» — гэта ня тыя, якія хапаюць ды сьведчаць у судзе, што ты «лаяўся зь незарэгістраванай сымболікай і рваў форменную вопратку». Прывыкаць, што «органы» бароняць цябе і тваю маёмасьць ад зладзеяў, бо існуюць за кошт падаткаў, якія ты сплачваеш. Як і «спэцслужбы», якія маюць змагацца з наркамафіяй, шукаць зьніклую кнігу Скарыны ды рассакрэчваць архівы.

Самі міліцыянты ды кадэбісты, цяпер загружаныя ідэалягічна пад завязку, павінны будуць звыкнуцца з думкай, што «апазыцыя» — утварэньне легальнае, карыснае і ў абсяг іх прафэсійных зацікаўленьняў не ўваходзіць. Некаторым апазыцыянэрам таксама цяжка будзе звыкнуць да легальнага становішча і адсутнасьці ўвагі з боку праваахоўных органаў.

І чым хутчэй мы ўсьвядомім гэтыя простыя рэчы, вызвалім ды цывілізуем самі сябе, тым бліжэйшы будзе момант, ад якога пачнецца звыканьне да новых рэаліяў. А пасьля нават самі зьдзівімся: «Як усё зьмянілася!» І, адкладаючы мэмуары Шчукіна, уключым тэлевізар — пачынаюцца парлямэнцкія дэбаты пра плюсы і мінусы Эўразьвязу.

Андрэй Скурко

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

Успомнім пра Беласточчыну

Сталі вядомыя вынікі польскага перапісу. 50 тыс. чалавек залічылі сябе да беларускай нацыянальнасьці. Болей, чым чакалася. Болей, чым украінцаў і літоўцаў у Польшчы разам узятых. Але меней, чым лічылася ў савецкі час. Нямала беларусаў, трэба думаць, знайшлося сярод найбольшай нацменшасьці ў Польшчы — 775 тыс. чалавек «ніякай нацыянальнасьці», што не дэкляравалі ніякай этнічнай прыналежнасьці. І зь сьвечкаю беларусаў ня знойдзеш цяпер у каталіцкай і яшчэ сто гадоў таму суцэльна беларускай Сакольшчыне — асыміляваныя цалкам. Лапік беларускасьці ў Польшчы сьціснуўся да праваслаўных паветаў. І ўсё ж 50 тыс. сьведамых беларусаў — гэта сіла. Ня йдзе на глум праца «Нівы», «Czasopisu», БАСу, Беларускага саюзу ў Польшчы etc.

Ня так даўно і «НН» купілася на чутку, што, маўляў, беларусамі запісаліся толькі 20 тыс. Папрасілі камэнтару ў Сакрата Яновіча, а ён адказаў болем на боль: у нас кожны дзясяты прызнаецца ў беларускасьці, а і ў вас такая самая доля беларусаў, беларускіх па культуры, а не па пашпарце.

Хопіць нам недаацэньваць сілу беларускай сьвядомасьці. Зацісьнутыя нефартуннымі акалічнасьцямі, беларусы застаюцца супольнасьцю, вернай сваёй нацыі. Шкодзіць толькі слабасьць дзяржавы — Рэспублікі Беларусі. Бо ад каго беларусы Беласточчыны маюць найменш падтрымкі, дык гэта ад суайчыньнікаў з-за мяжы. Калі не лічыць дэпутата Сычэўскага, якога ў Менску прымаюць ня столькі як беларуса, колькі як мэнтальнага лепэраўца, хто яшчэ заслужыў увагу менскага ўраду і пасла Латушкі? Сакрат Яновіч атрымаў прэмію імя Дравіча з рук Квасьнеўскага, а не «За духоўнае адраджэньне». Бо інакш прыйшлося б прыслухоўвацца і да меркаваньня беларусаў замежжа — ня толькі да пункту гледжаньня Сычэўскага, але і Гэніка Вапы, напрыклад, які імкнецца зрабіць зь Беласточчыны беларускі П'емонт.

Падтрымка беластоцкіх беларусаў, у адрозьненьне ад разьмяшчэньня гандлёвага прадстаўніцтва дзесьці ў Благавешчанску, ня дасьць імгненнага эканамічнага зыску, але гэта цярплівая выбудова тае супольнасьці, безь якой ня будзе трывалай дзяржавы.

Хто ў Менску займаецца вывучэньнем Беласточчыны? Інстытуту беларускіх дасьледаваньняў у Акадэміі навук няма, як і Інстытуту Беларусі пры МЗС. Выходзіць, усе і ніхто. Зрэшты, у Акадэміі навук няма ні Інстытуту расейскіх дасьледаваньняў, ні Інстытуту эўрапейскіх дасьледаваньняў, хоць як можна выбудоўваць доўгатэрміновую расейскую палітыку без стратэгічнага вывучэньня Расеі? Лукашэнкава адміністрацыя робіць стаўку на ведамасныя аналітычныя цэнтры. Мо гэта і эфэктыўна для кароткатэрміновага прагнозу ці душэньня, але які ад іх плён там, дзе трэба ўкладаць і тварыць. Гэтая дробязь — адзін з адломкаў большага выбару — як разбудоўваць дзяржаву: праз дзяржапарат ці праз супольнасьць, замкнёна ці адкрыта, і ці будаваць увогуле.

Андрэй Дынько

Няшчырасьць

За апошнія дваццаць гадоў колькасьць сьведамых беларусаў павялічылася ў сотні разоў. Ужо даўно ня скажаш, што ведаеш усіх прысутных на Купальлі або прэзэнтацыі кнігі сябра. Аднак ад усяго гэтага ня стала большае пэўнасьці ў тым, што нацыя ёсьць, што яна «адрасла» пасьля ўсіх масавых «высечак» XX ст. Чаму так адбываецца? І што магло б даць тую пэўнасьць? І што, урэшце, было б галоўным паказьнікам таго, што нацыя ёсьць?

У нас быў досьвед ці ня ўсіх формаў ды мэтадаў адраджэньня. Пераглядаючы вынікі, я бачу, што адзін прынцып пакуль што так і не прыжыўся. Гэта беларуская мова дома. Ня ў краме, не на вуліцы і не на сцэне — Бог зь імі, гэтага мы ўжо навучыліся. Дома. З жонкаю, з мужам, зь дзецьмі. Там, дзе правілы ўсталёўвае не палітычны рэжым, а ты сам.

Пачынаю згадваць сваіх калегаў, вядомых у Беларусі беларусаў, і аказваецца, што ці ня большасьць зь іх, якія ўсё жыцьцё публічна супрацьстаяць русіфікацыі, дома і зь дзецьмі гавораць па-расейску. Не кранаю старых — мы ня ведаем іхных страхаў, думаю пра сваё пакаленьне. Адкуль жа возьмецца нацыя?

Беларуская нацыя возьмецца зь беларускамоўнага дому.

Згадайце досьвед балтыйскіх краінаў пад саветамі. У іхным вонкавым жыцьці нічога магло й не нагадваць, што яны літоўцы ці латышы. Але дома, зь дзецьмі гаварылі па-свойму. Сукупнасьць гэтых дамоў і была нацыяй, ім самім давала адчуваньне нацыі. На вуліцы ці ў кавярні гавары як хочаш — гэта для чужога вока важна. А вось у беларускім доме па-беларуску — гэта толькі для сябе, для нас. Інакш мы адзін аднога руйнуем горш, чым любая русіфікацыя.

Згадайце, як зьдзівіла многіх у апошнім перапісе, што гэтак шмат беларусаў гавораць дома па-беларуску. Людзі інтуітыўна адчуваюць, што калі дома не па-свойму — якія ж яны беларусы?

Некалі Барыс Сачанка казаў, што ня так важна, у якую школу пойдуць ягоныя дзеці — беларускую ці расейскую, — як тое, на якой мове яны будуць размаўляць дома. Школу, як і ўсе нацыянальныя грамадзкія інстытуцыі, можна зачыніць. І калі яна — апошняе, на чым трымалася нацыя, дык ня будзе і нацыі. Дому не закрыеш. Прынамсі, давялося б фізычна зьнішчыць ягоных насельнікаў.

Не магу сказаць, што маё пакаленьне ўвасобіла ў жыцьцё ідэю беларускага дому. Не ўзмацнілася адчуваньне таго, што мы нацыя. Іншы раз заўважаю, што лягчэй беларускі дом ствараецца ў асяродку людзей, якія маюць негуманітарныя прафэсіі, у людзей непублічных. У іх няма падставаў адчуць няшчырасьць.

Застаецца надзея на пакаленьне сёньняшніх маладзёнаў. Яны мысьляць больш прагматычна і больш прагматычна будуюць свой побыт. Застаецца надзея таксама на пакаленьне нашых дзяцей, якім належыць паўтарыць наш ня вельмі ўдалы досьвед зь лепшым вынікам.

Сяргей Дубавец

Праз пару тыдняў у нас ужо будзе «рубль». Пакуль безнаяўны й паралельны тутэйшаму, але расейскі. Наўзамен — 20 млрд крэдыту, што характэрна, у тых самых рублях. Рыгоравіча ціснуць з Масквы: аддавай «зайчыка», нафтахімію, «Белтрансгаз». Трэба рэфэрэндум і Канстытуцыйны акт? Аддавай. Размова кароткая: званок Пуціна з Крамля, прыяжджаюць міністар і банкір — дахаты, у суботу! — і амаль адразу кантрольны залп з расейскіх СМІ. Прадаючы фінансавую незалежнасьць за рубель дваццаць, улада прадавала б сама сябе. Значыць, плянуюць прадаць нешта іншае. Або зрабіць выгляд, што прадаюць.

Прадацца за рубель дваццаць

Лукашэнка ў цяжкай сытуацыі: за што бароўся, на тое й напароўся. Цяпер давядзецца гуляць паводле рызыкоўнага сцэнару «Расейскія горкі». З разьлікам, што Пуцін перад выбарамі не пачне скандалу, ня будзе адключаць газ і не падтрымае апазыцыі, — абяцаць Расеі ўсё аддаць. Атрымаць «ярлык» на канстытуцыйны рэфэрэндум і пасьля знайсьці спосаб нічога ня выканаць. У 2001-м гэта было зроблена «элегантна». Але ж за гэтыя два гады і ў Крамлі гульцы што-нішто засвоілі.

Падзеі апошняга году — ціхае замяшчэньне расейскіх тэлеканалаў, праект «Ідэалёгія», таямнічыя паездкі кур'ераў рэжыму на захад і рэдакцыйныя артыкулы ў «Советской Белоруссии» — быццам паказваюць, што Лукашэнка канчаткова здавацца не плянуе. Але…

Але дажыліся, спадарства! Мусім хварэць за Лукашэнку, каб адстаяў хоць якую беларускую незалежнасьць. За таго самага Лукашэнку!

Адзіная карысьць, якую дае беларусам гістарычны эпізод з рублём, — можа, урэшце, на хвалі дыскусіі, вызначым для сябе, якая валюта насамрэч павінна быць у незалежнай Беларусі: «зайчык», талер, даляр, эўра?

Дзесяць гадоў таму мы ўжо нешта чулі пра «рублёвую зону». Прэм'еру Кебічу трэ было выйграваць прэзыдэнцкія выбары. Дзе Кебіч? Дзе тыя рублі? Праўда, «зону» за гэты час нам зрабіць пасьпелі.

Рубель ставіць пытаньне рубам. Рубель — гэта крытычны пункт. Раз дайшло да рубля, значыць, стаўка — лёс рэжыму. Бо, у адрозьненьне ад Скарыны, Лукашэнка друкуе ў асноўным рублі — і трымаецца коштам эмісіі.

У гэтай сытуацыі супакойвае толькі адно. Рэжым, які сваім апірышчам мае рубель — ды хай сабе нават даляр з эўра, — непазьбежна рухне. Бо ніякая краіна ня можа трымацца на грошах. Сіла ня ў іх. Ёсьць рэчы, якія нельга купіць ці прадаць, — і таму Беларусь жыве.

Павал Севярынец

Сакрэтная місія Мясьніковіча

Працяг са старонкі 1.

11 чэрвеня маскоўская «Независимая газета» надрукавала артыкул свайго менскага карэспандэнта Рамана Якаўлеўскага «Пасланьнік Лукашэнкі ў ролі генэрала Вольфа». Місія Мясьніковіча, на думку Якаўлеўскага, была задуманая афіцыйным Менскам у процівагу «сур'ёзнаму псыхалягічнаму ціску на прэзыдэнта Лукашэнку». Таму, пры таямнічым антуражы, былі арганізаваныя «акуратныя ўцечкі інфармацыі», якія мусілі дайсьці да адрасата. «Менск хоча стварыць у Крамля ілюзію «сэпаратных перамоваў» з ЗША», — падводзіць рысу «НГ».

16 чэрвеня, напярэдадні ўрадавай нарады па пытаньні аб грашовым саюзе з Расеяй, амэрыканскае аналітычнае выданьне «Stratfor Strategic Forecasting» зьмясьціла падрабязны аналіз вынікаў нядаўняй «сакрэтнай місіі Міхаіла Мясьніковіча», як назвала яе. Паводле гэтай публікацыі, Мясьніковіч знаходзіўся ў Вашынгтоне 7—10 чэрвеня. Ён нібыта меў там сустрэчы з супрацоўнікамі Дзярждэпартамэнту (дыпляматычныя пытаньні), Міністэрства гандлю (інвэстыцыі ў беларускую прамысловасьць), а таксама Рады нацыянальнай бясьпекі (пытаньні стратэгічнае бясьпекі й супрацы). Паведамляецца, што Менск прапанаваў шэраг саступак (адмова ад гандлю зброяй з «праблемнымі краінамі», спыненьне рэпрэсій супраць мірнай апазыцыі, стварэньне спрыяльных умоваў для амэрыканскіх інвэстыцыяў), але прасіў амэрыканцаў за гэта зьмяніць стаўленьне да беларускага рэжыму ды адмовіцца ад падтрымкі апазыцыі.

«Кантакты між беларускімі і амэрыканскімі навуковымі цэнтрамі»

Дык езьдзіў М.Мясьніковіч у Вашынгтон ці не? Амэрыканскі бок ніяк не камэнтуе гэтай сытуацыі. У аддзеле інфармацыі пасольства ЗША ў Менску нам паведамілі, што яны пакуль «не гатовыя» нешта сказаць наконт гэтага.

Андрэй Савіных, начальнік упраўленьня інфармацыі і прэс-службы беларускага Міністэрства замежных справаў, лічыць тыя публікацыі «інсінуацыямі, якія ня маюць нічога супольнага з рэчаіснасьцю». Таму іх нельга разглядаць як «сур'ёзную публіцыстыку», гаворыць Савіных.

Яшчэ больш заблытвае сытуацыю тлумачэньне прэсавай сакратаркі Мясьніковіча **Тацяны Арэшкі**. Паводле яе словаў, візыт кіраўніка Акадэміі навук у ЗША адбываўся 26 красавіка — 5 траўня сёлета, але ніяк не 7—10 чэрвеня, і справаздача пра яго зьявілася тады ў афіцыйных СМІ. «Так што ніякай інфармацыйнай блякады адносна візыту не было», — заключыла Арэшка.

Сапраўды, 20 траўня БелТА распаўсюдзіла справаздачу пра візыт М.Мясьніковіча ў ЗША. Паводле яе, галоўная мэта паездкі — усталяваньне наўпроставых кантактаў паміж беларускімі і амэрыканскімі навуковымі цэнтрамі. Былі падпісаныя мэмарандумы аб супрацоўніцтве, у тым ліку і з Каледжам харчаваньня, сельскай гаспадаркі і навук аб навакольным асяродзьдзі. Пра наведаньне Мясьніковічам Вашынгтону нічога не паведамлялася. Затое адзначалася, што на працягу 2003—2004 г. у Беларусь прыедуць для ўсталяваньня дзелавых сувязяў амэрыканскія навукоўцы.

Высьветліць, дзе знаходзіўся 7—10 чэрвеня М.Мясьніковіч, не ўдалося. Вядома, што 5 чэрвеня ён браў удзел у прэзэнтацыі кнігі «Нацыянальны атлас Беларусі», а ўжо 10 чэрвеня прысутнічаў на паседжаньні прэзыдыюму Саўміну па пытаньнях разьвіцьця геалёгіі. Зрэшты, сама дата візыту Мясьніковіча ў ЗША не такая важная. Важна, што афіцыйны Менск гатовы шукаць інвэстыцый у ЗША. Або (гэта ўжо якая інтэрпрэтацыя каму даспадобы) адзін з эмісараў Лукашэнкі абвёў Вашынгтон вакол пальца.

Дэмакратычна настроены інтэлектуал

Былы намесьнік міністра замежных справаў **Андрэй Саньнікаў** бачыць прычыну актыўнасьці беларускіх уладаў у абмеркаваньні Кангрэсам ЗША Акту аб дэмакратыі ў Беларусі. «Яны нават спрабавалі пагражаць спыненьнем адносінаў з ЗША», — кажа Саньнікаў. Ён лічыць, што беларускія ўлады нічога не маглі прапанаваць амэрыканскаму боку, а кангрэсмэны і сэнатары «ніколі ня пойдуць на перамовы і паляпшэньне адносінаў з рэжымам Лукашэнкі» без істотных зьменаў сытуацыі з станам правоў чалавека і дэмакратыі ў нашай краіне. Тэза, дарэчы, спрэчная. А.Саньнікаў высунуў вэрсію, што калі перамовы сапраўды мелі месца, то тэмай іх магло быць «незадавальненьне сытуацыяй значнай часткі беларускай намэнклятуры». Але падаецца малаверагодным, каб Мясьніковіч у перапынках паміж чытаньнем лекцый і падпісаньнем мэмарандумаў вёў ад імя намэнклятуры перамовы з амэрыканцамі. «Уцечкі інфармацыі» гавораць, што ягоныя сустрэчы з афіцыйнымі амэрыканскімі асобамі маглі адбыцца толькі з санкцыі Лукашэнкі. І ў якасьці пасланца — добры выбар. Чалавек безь вялікай пасады, асабістых кар'ерных амбіцый, канал сувязі зь беларускай намэнклятурай. Да таго ж, як выказваецца аналітык «Стрэтфару», «дэмакратычна настроены інтэлектуал».

Высновы «Стрэтфару» досыць пэсымістычныя для Беларусі, а аналіз нібыта пісаўся расейскай рукой. А вось факты — беспрэцэдэнтныя і ў пэўным сэнсе супярэчаць высновам.

Пробны шар

Калі пададзеная вышэй інфармацыя адпавядае рэчаіснасьці, дык беларускія ўлады вырашылі забіць двух зайцоў: паспрабаваць прадухіліць інфармацыйную атаку на рэжым з боку ЗША, паабяцаўшы шэраг саступак у пытаньнях гандлю зброяй ды правоў чалавека, і паказаць Маскве, што ў выпадку далейшага ціску Менск можа павярнуцца тварам на Захад. Паводле «Stratfor-Strategic Forecasting», і амэрыканскі, і беларускі бакі мусілі трымаць у сакрэце факт перамоваў як самастойнай гульні Лукашэнкі, які апынуўся пад жорсткім прэсынгам Масквы і змушаны зрабіць жэст «добрай волі» ў бок Захаду.

Варта адзначыць, што названыя публікацыі зьявіліся ў двух спэцыфічных выданьнях. «НГ» набліжаная да колаў паліттэхнолягаў, якія абслугоўваюць Крэмль і маюць доступ да інфармацыі спэцслужбаў. «Strategic Forecasting» («Стрэтфар») — гэта адна з найбуйнейшых сусьветных прыватных выведных кампаніяў, якая пастаўляе сваёй кліентуры зьвесткі геапалітычных аналізаў.

Падобна на тое, што публікацыі пра перамовы Мясьніковіча — нягледзячы на супярэчлівасьць выкладзеных зьвестак — гэта не дэзінфармацыя. Цалкам магчыма, што мы сталіся сьведкамі, як мінімум, распрацоўкі новай стратэгіі стаўленьня ЗША да Беларусі. І ня важна, з чыёй ініцыятывы адбылася ўцечка інфармацыі — Менску, які хоча шантажаваць Маскву, Вашынгтону, які хоча сапсаваць адносіны Беларусі й Расеі, ці Масквы, якая хоча прадэманстраваць, што яна ў курсе падзеяў. Важна, што ЗША пагадзіліся на гэты візыт, на перамовы, якія раней былі проста немагчымыя, а беларускія ўлады пайшлі на крок, які яшчэ нядаўна здаваўся таксама немагчымым.

Сяргей Ёрш

Аляксандар Лукашэнка на нарадзе па валютным саюзе: "Ніякіх падставаў для пагадненьня"

18 чэрвеня на ўрадавай нарадзе Аляксандар Лукашэнка дэзавуяваў чуткі пра вырашаны пераход Беларусі на расейскую валюту. "Няма эканамічных падставаў", — такім быў вэрдыкт Лукашэнкі. "Такое пагадненьне супярэчыла б нашай Канстытуцыі", — туравалі свайму лідэру дэпутаты палаты прадстаўнікоў у інтэрвію Беларускаму радыё. Калі дамоўленасьці з Расеяй парушаныя канчаткова, беларускі ўрад чакаюць цяжкія перамовы аб пастаўках газу ў краіну. Магчыма, з гэтым зьвязаная прапанова перадаць праект валютнай дамовы на разгляд апазыцыі, тым, "хто апазыцыйна настроены да ўлады, да тых, каму ёсьць што сказаць".

Стрэтфарскі інстытут стратэгічнага прагназаваньня:

«Вашынгтон хацеў бы бачыць адносіны паміж Менскам і Масквой халоднымі»

Беларускі прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка паслаў свайго спэцыяльнага прадстаўніка Міхаіла Мясьніковіча сустрэцца з высокапастаўленымі афіцыйнымі асобамі ЗША 7—10 чэрвеня ў Вашынгтоне. Паводле крыніцаў «Стрэтфару» ў беларускім урадзе, гэты візыт стаўся пачаткам беларуска-амэрыканскага дыялёгу.

Дагэтуль ніводзін з бакоў нічога афіцыйна не паведаміў адносна прадмету перамоваў. Яны маюць падставы для маўчаньня. У супольных інтарэсах — каб расейскае кіраўніцтва як найменш ведала пра перамовы, што пасьпяхова йдуць за сьпінаю Масквы. Апроч таго, чыноўнікі з Вашынгтону хацелі б пазьбегнуць нэгатыўнага розгаласу пра тое, што ЗША вядуць дыялёг з краінай, якую вінавацяць у падаўленьні дэмакратыі, падтрымцы Садама Хусэйна і спачуваньні іншым краінам-«ізгоям».

А Менск не жадае, каб грамадзяне Беларусі ведалі пра перамовы кіраўніцтва з краінай, якую тое самае кіраўніцтва вінаваціць у падкопах. Вашынгтон і Менск маюць процілеглыя геапалітычныя погляды на Беларусь. Вашынгтон хоча, каб Беларусь зрабілася часткай «новай Эўропы» — групы ўсходнеэўрапейскіх краінаў, якія падтрымліваюць Злучаныя Штаты насуперак Нямеччыне, Францыі і Расеі. Лукашэнка ж бачыць Беларусь у саюзе з Расеяй і свабоднай ад уплыву ЗША. Гэта плюс нацягнутыя адносіны з Эўразьвязам, што незадаволены становішчам з правамі чалавека ў краіне, прывяло Беларусь да ізаляцыі з боку сусьветнай супольнасьці.

Урад у Менску прывык нэўтралізаваць ціск з боку ЗША праз супрацоўніцтва з Расеяй. Беларусь і Расея зблізіліся ў эканамічнай, палітычнай і вайсковай сфэрах. Але Расеі і Беларусі не ўдалося стварыць саюзную дзяржаву, што абвяшчалася першапачатковай мэтай. Больш за тое, пасьля перамогі Ўладзімера Пуціна на прэзыдэнцкіх выбарах у Расеі ў 2001 г. працэс саюзнага будаўніцтва істотна затармазіўся. Пэўную ролю ў гэтым адыгралі нацягнутыя адносіны Пуціна і Лукашэнкі.

Як сьведчаць крыніцы «Стрэтфару» ў адміністрацыі расейскага прэзыдэнта, Пуцін баіцца, што Лукашэнка можа выйграць прэзыдэнцкія выбары ў саюзнай дзяржаве. Страхі Пуціна небеспадстаўныя: згодна з шэрагам сацыялягічных дасьледаваньняў (вынікі якіх не былі апублікаваныя) расейскія выбаршчыкі працяглы час аддавалі перавагу Лукашэнку перад усімі іншымі магчымымі кандыдатамі, якія ім прапаноўваліся, — уключна з Пуціным. Прычына гэтага, відаць, у тым, што многія расейцы бачаць у Лукашэнку абаронцу бедных, здольнага рашуча паводзіцца ў адносінах з ЗША, чаго, на іх думку, ня можа Пуцін.

Вайна ў Іраку ўзмацніла страхі Менску наконт амэрыканскай гегемоніі і разгубленасьць перад вялаcьцю Масквы ў дачыненьні да інтэграцыі. Лукашэнка таксама зразумеў, што, незалежна ад жаданьня Пуціна захаваць цяперашні рэжым у Менску, той нічога ня зможа зрабіць, калі зьмяніць яго захочуць ЗША. Спроба Расеі процістаяць вайне ў Іраку ў надзеі ўратаваць рэжым, які мусіў быць скінуты, правалілася. І хоць Лукашэнка разумее, што Беларусь не зьяўляецца наступнай цэльлю ЗША, ён не сумняецца, што яна таксама ў сьпісе.

Улічваючы ўзровень сваіх адносін з адміністрацыяй Буша, Лукашэнка вырашыў пайсьці шляхам, прабітым да яго тымі, хто спрабаваў адвесьці гнеў Вашынгтону: уключыць адміністрацыю Буша ў дыялёг, каб высьветліць, ці нельга дамагчыся разрадкі. Вось у чым сакрэт візыту Лукашэнкавага эмісара.

Лукашэнка выбраў добры час для спробы ажывіць адносіны з Вашынгтонам, — і выбраў добрага пасланца. Мясьніковіч — прэзыдэнт Нацыянальнай акадэміі навук і былы сябар як апазыцыйных, так і ўрадавых структур — вядомы на Захадзе як інтэлектуал з дэмакратычным ухілам. Як сьцьвярджаюць беларускія крыніцы «Стрэтфару», ён таксама падтрымлівае сувязі зь некаторымі сябрамі амэрыканскай Рэспубліканскай партыі і нават асобнымі чыноўнікамі Бушавай адміністрацыі.

Яшчэ перад вайной у Іраку і зьвязаным зь ёй ахаладжэньнем амэрыканска-расейскіх адносінаў Вашынгтон ня меў бы справы зь якімі б там ні было прадстаўнікамі Беларусі. Але цяпер, пасьля спробаў Масквы збудаваць альянс з Бэрлінам і Парыжам, каб заблякаваць намаганьні ЗША, адміністрацыя Буша глядзіць на Лукашэнкавы спробы зблізіцца больш прыхільна.

Калі крыніцы «Стрэтфару» ў беларускіх дыпляматычных колах дакладныя, Мясьніковіч сустракаўся ня толькі з чыноўнікамі Дзярждэпартамэнту і Міністэрства гандлю, але і зь некалькімі прадстаўнікамі Рады нацыянальнай бясьпекі, імёны якіх высьветліць нам не ўдалося.

Працяг на старонцы 4.

Паляцім на «пяцісотым»

Ад 1 красавіка над Эўропай трэба лётаць ціха: самалёты, якія не адпавядаюць патрабаваньням на ўзровень шуму, мусяць быць зьнятыя зь лініяў. Ту-134 і Ту-154Б, якімі карысталася «Белавія», цяпер у ЭЗ не пускаюць. Кампаніі даводзіцца перабівацца самалётамі «Як-40» ды «Ан-24», якія шумавым патрабаваньням адпавядаюць. «Боінга-737/500», пра які столькі гаварылася, «Белавія» дагэтуль не набыла: удзельнікі тэндэру папрасілі авіякампанію працягнуць яго да 25 чэрвеня. Беларускі «Боінг» будзе лётаць на Франкфурт, Рым, Лёндан ды Парыж. Самалёт гэтай мадэлі каштуе сама меней 32—34 млн даляраў. Да 2006 г. «Белавія» плянуе набыць яшчэ дзьве такія машыны, кожная зь якіх бярэ на борт 138 пасажыраў.

Сэрыя 737 — сапраўдны бэстсэлер карпарацыі «Боінг», якая прадала ўжо 5200 такіх самалётаў. Яны прызначаныя для палётаў на малыя і сярэднія адлегласьці — здольныя праляцець 5500 км на крэйсэрскай хуткасьці 910 км/г. Самалёт складаецца з 367 тысячаў дэталяў, ня ўлічваючы шрубоў ды гаек. Штохвіліны ў небе знаходзіцца каля 1200 «Боінгаў-737». Яны налёталі столькі, што маглі б перавезьці 7 млрд чалавек 260 разоў да Сонца і назад.

З праблемай шумавых нормаў сутыкнуўся некалі і сам «Боінг». У 1988 г. зрабілася зразумела, што мадэль 737/200 задужа гудзіць. Праект «Боінга-737/500» задумваўся як замена састарэлай мадыфікацыі. Першы такі «Боінг» выйшаў на лінію ў 1990 г. Апошні новы самалёт гэтай мадэлі набыла японская авіякампанія «Air Nippon». Цяпер «Пяцісотых» больш не вырабляюць, іх можна набыць толькі з другіх, а то і з трэціх рук. Хочацца спадзявацца, што нам дастанецца ня дужа абадраны: на тое, каб цалкам пафарбаваць мадэль «737/500», патрэбна 190 л эмалі.

Алесь Кудрыцкі

IREX-PROMEDIA

Міністэрства па надзвычайных сытуацыях атрымала ў сваё распараджэньне першыя гелікоптэры, што будуць базавацца пад Менскам на аэрадроме Ліпкі. На фота: перад паказальнымі палётамі не абышлося безь сьвятара.

ЭКАНАМІЧНАЯ ХРОНІКА

Доля бедных зьнізілася

Доля бедных у структуры насельніцтва Беларусі зьнізілася, мяркуе Сусьветны банк. Паводле ягоных зьвестак, цяпер толькі 19% беларусаў маюць даходы, ніжэйшыя за рысу беднасьці, тады як у 1996 г. на мяжы жабрацтва балянсавала 50% насельніцтва краіны. Адна з прычынаў гэтага — «шчодрая сыстэма сацыяльных выплатаў». Цяпер Сусьветны банк усяляк заахвочвае ўрад пераходзіць на адрасную сыстэму сацыяльнай дапамогі.

«Прыёрбанк» набывае бровары

Буйныя пакеты акцыяў «Крыніцы» (80,57%), «Берасьцейскага піва» (85%), «Белсоладу» (75%) ды Полацкага бровару перададуць «Прыёрбанку» ў даверчае кіраваньне на пяць гадоў. Ва ўрадзе спадзяюцца, што «Прыёрбанк» здолее дамовіцца з «Балтыкай» пра рэструктурызацыю крэдыту, які «Крыніца» дагэтуль ня можа вярнуць. «Прыёрбанк» належыць аўстрыйскаму «Райфайзэн-банку».

Піва падаражэла

На чвэрць падскочылі цэны на беларускае піва. Урад дазволіў броварам вольна падвышаць іх. Раней гэта можна было рабіць толькі сынхронна з інфляцыяй. На цэны ўплывае і акцыз на піва — 4 эўрацэнты за літар. Вось і выходзіць, што піва даражэе разам з эўра.

Інвэстар для «Кастрычніка»

На віцебскае ААТ «Чырвоны Кастрычнік», дзе робяць абутак, прыйшоў расейскі інвэстар — фірма «Мадарама». Яна паабяцала інвэставаць у фабрыку ад 2 да 3 млн даляраў. «Чырвоны Кастрычнік» ужо ўваходзіць у склад сумеснага абутковага прапрыемства «Сан-Марка», заснаванага разам зь беларускай фірмай «Марка» ды нямецкім «Эвімэксам».

Інстытут інвэстуе ў банкі

Нацбанк дазволіў расейскаму Інстытуту эканамічных стратэгіяў набыць больш за 10% акцыяў «Джэм-Банку» ды «Атам-Банку». Паводле статуту, інвэстар зьяўляецца некамэрцыйнай арганізацыяй, што займаецца навуковымі дасьледаваньнямі пад кіраўніцтвам Расейскай акадэміі навук. «Джэм-Банк» існуе з 1991 г., «Атам-Банк» быў зарэгістраваны ў 2001 г. у свабоднай эканамічнай зоне «Менск».

Прыватызацыя Гомельскага мясакамбінату

«Гомельаблмаёмасьць» выстаўляе на конкурс дзяржаўную долю акцый Гомельскага мясакамбінату (10% ад статутнага фонду). Прыярытэт будзе аддавацца пакупнікам, здольным інвэставаць 2 млн даляраў у разьвіцьцё прадпрыемства.

АК

МЭДЫІ

Барановічы таймз

Первая барановичская газета на английском языке для знатоков и изучающих английский язык, школьников и студентов, учителей и преподавателей, переводчиков и иностранцев.

He who knows no foreign language does not know his own one. (Goethe)

THE BARANOVICHI TIMES

Local Monthly

No. 1, June 2003

Headlines

Read in the newspaper:

Page 2: NEWS OF THE MONTH

Page 3: WALK ABOUT THE CITY

Page 4: LET'S STUDY ENGLISH

Page 5-6: FOR YOU, ENTRANTS

Page 7: A POPULAR SONG

Да шэрагу баранавіцкіх газэт (5 незалежных і дзяржаўная) далучылася яшчэ адна. Вылучаецца яна тым, што выдадзена на ангельскай мове. «The Baranovichi Times» мае 8 старонак фармату А4 і прызначаная для «знаўцаў і тых, хто вывучае ангельскую мову, навучэнцаў школ і студэнтаў, настаўнікаў, перакладчыкаў і замежнікаў». Наклад першага нумару 299 асобнікаў.

У газэце зьмешчаны матэрыялы на ангельскай і расейскай мовах. Пра самі Баранавічы ў ёй пішацца мала (экскурсія па горадзе і караценькая гісторыя). Большая палова тэкстаў — парады абітурыентам, асноўныя выразы па-ангельску для пачаткоўцаў, крыжаванка і тэкст знакамітай песьні «Yesterday» па-ангельску з двума перакладамі на расейскую — падрадковым і літаратурным.

Каб не паведамленьне ў адным з артыкулаў, што Баранавічы знаходзяцца ў Беларусі, у Берасьцейскай вобласьці, ніводзін замежнік ніколі б не зразумеў, дзе ён апынуўся. А ў адным расейскамоўным артыкуле, дзе чытачоў пераконваюць вывучаць замежныя мовы, ставіцца ў прыклад Ўладзімер Пуцін, які гутарыць з замежнікамі безь перакладчыкаў.

Дзівіць і назва гораду ў газэце, напісаная па-расейску лацінкай. Усё ж гэтулькі гадоў жывём у незалежнай краіне, замежныя мапы выдаюцца ў беларускай транскрыпцыі... А ў нас — як пяецца ў песьні: «тут паўсюду Масква, тут Масква ў галаве, тут Масква ў тэлевізары і ў газэце...» Зрэшты, у Баранавічах дагэтуль яшчэ няма ніводнага цалкам беларускамоўнага выданьня.

Руслан Равяка, Баранавічы

«Наша Ніва»

запрашае ўсіх ахвотных прадаваць газэту на вуліцах Менску і ў электрычках. Зьвяртацца на тэлефон 284-73-29; e-mail: nn@promedia.by (пытацца Насту Бакшанскую). «НН» выходзіць у чацьвер а 15-й, продажам найлепш займацца ў чацьвер—суботу.

«Вашынгтон хацеў бы бачыць...»

Працяг са старонкі 3.

Прычым гэтая сустрэча не была асобным эпізодам. Згодна з крыніцамі ў беларускім урадзе, перамовы, распачатыя Мясьніковічам, працягваюцца па дыпляматычных каналах як у Вашынгтоне, так і ў Менску.

Як кажуць крыніцы «Стрэтфару», Менск прапанаваў шэраг саступак у абмен на аслабленьне ціску з боку ЗША. Лукашэнка паабяцаў спыніць гандаль зброяй з краінамі, да якіх «неабыякавыя» ЗША, надаць інвэстыцыйныя прэфэрэнцыі амэрыканскім кампаніям, якія захочуць працаваць у Беларусі, а таксама не душыць апазыцыю, пакуль яе дзеяньні ня будуць набываць радыкальны характар. Узамен ён папрасіў Вашынгтон выключыць Беларусь са сьпісу патэнцыйных цэляў, адмовіцца ад антыбеларускай прапаганды, а таксама спыніць як прыхаваную, так і адкрытую падтрымку беларускай апазыцыі.

Амэрыканска-беларускі дыялёг наўрад ці выкліча грандыёзны прагрэс ва ўзаемаадносінах дзьвюх дзяржаваў, але магчыма, што працяг перамоваў паспрыяе часоваму спаду напружаньня між Вашынгтонам і Менскам. Адзіная важкая прычына для пацяпленьня паміж гэтымі двума — Масква. Менавіта праз прызму адносінаў кожнага боку з Расеяй і да Расеі трэба разглядаць гэты дыялёг.

Вашынгтон хацеў бы бачыць адносіны паміж Менскам і Масквой халоднымі — і лепей за ўсё незваротна халоднымі. Бязь цеснага супрацоўніцтва зь Беларусяй Расея страціць свае стратэгічныя пазыцыі на заходнім кірунку, дзе Менск — апошні хаўрусьнік Масквы. Безь беларускага войска (якое застаецца наймацнейшым сярод іншых цэнтральна- і ўсходнеэўрапейскіх) абараназдольнасьць Расеі, хутчэй за ўсё, панясе значны ўрон. Беларусь здолела захаваць найлепшыя кадры, вывучку, веды і многія арсэналы, якія назапасіла савецкае войска да распаду СССР.

Такім чынам, бязь Менску Масква ня здолее стварыць цеснага альянсу з Бэрлінам і Парыжам альбо з Пэкінам, а значыць — і процістаяць амэрыканскай магутнасьці. Больш за тое, безь Беларусі Расея нават у геаграфічным сэнсе зробіцца далейшай ад сваіх эўрапейскіх партнэраў.

Менск таксама бярэ Маскву ў разьлік. Лукашэнка спадзяецца, і, магчыма, не без падстаў, што Масква заўважыць дыялёг, які можа зрабіць Беларусь бліжэйшай да Вашынгтону, аслабіўшы расейскі ўплыў на краіну. Лукашэнка, апроч таго, мае надзею, што гэта пераканае Маскву ставіцца да свайго хаўрусьніка з большай павагай і лепей бараніць яго ад заходняга ціску. Як паведамляюць крыніцы, Лукашэнка таксама думае, што Пуцін нарэшце зразумее: маючы Беларусь на сваім баку, ён можа з большым посьпехам прасоўваць свой новы праэўрапейскі курс.

Але ў стратэгічным пляне і ў далёкай пэрспэктыве амэрыканска-беларускія перамовы хутчэй за ўсё зойдуць у тупік. Хоць пэўны нязначны прагрэс у дыялёгу між Вашынгтонам і Менскам можа быць дасягнуты, ёсьць пэўныя межы, якіх ніводзін з бакоў не пераступіць. Менск ніколі ня згодзіцца на ролю амэрыканскага сатэліту, чаго дамагаецца Вашынгтон. Ня пойдзе ён і на лібэральныя рыначныя рэформы, якія, як здаецца шмат каму ў Беларусі, прывядуць краіну да катастрофы. Хоць большасьць беларусаў бедныя, яны не галадаюць, як насельніцтва ўсіх былых савецкіх краінаў (акрамя балтыйскіх), што ўсталі на шлях рыначных пераўтварэньняў. Урэшце, Беларусь ніколі не пакіне спробаў зблізіцца з Расеяй, незалежна ад таго, што з гэтай нагоды будзе думаць расейскі ўрад.

Вашынгтон хутчэй за ўсё застанецца нездаволены другараднымі саступкамі Менску. Апроч таго, наўрад ці ён палічыць абавязкам плаціць за іх, беручы пад увагу свой статус супэрдзяржавы.

Тайныя амэрыканска-беларускія перамовы, напэўна, выклічуць раздражненьне ў Пуціна, але канчатковым вынікам будзе ўпэўненасьць, што і без сакрэтных перамоваў Масква будзе працаваць зь Менскам цясьней, чым раней.

Урэшце, будучыня расейска-беларускіх адносінаў будзе залежаць не ад кароткатэрміновага флірту са Злучанымі Штатамі, а ад таго, ці вырашыць расейскае кіраўніцтва адраджаць Расею ў якасьці магутнай дзяржавы, ствараючы пры гэтым саюз зь Беларусяй. Расею падштурхоўвае да саюзу зь Беларусяй само геаграфічнае становішча апошняй: Масква разьмешчана занадта блізка ад межаў Расеі, і безь Беларусі, якая служыла б бар'ерам перад патэнцыйнай атакай, Расея будзе занадта прыступнай у геастратэгічных адносінах.

Перакладзена зь нязначнымі скаротамі

Адкуль грошы на пасяўную

Ліст мяне прымусіла напісаць паперка, прыкладзеная цяпер да гэтага пасланьня. Зірніце: «адзін з найбуйнейшых вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі Менскай вобласьці» сёлета ня ў стане пасьпяхова правесьці «вяснова-палявую кампанію».

Таму Менскі райвыканкам зьвяртаецца да прадпрыемстваў раёну з просьбай «аказаць разавую фінансавую дапамогу». Гэтак, у яўна прыватнага прадпрыемства — ТАА «Аўтацэнтар КаМАЗ», што месьціцца ў Калядзічах пад Менскам, — раённая «вэртыкаль» просіць 500 тыс. рублёў. З рэзалюцыі на лісьце відаць, што кіраўніцтва ТАА спрабуе пралічыць фінансавыя магчымасьці фірмы. На жаль, незразумела, ці змаглі адрасаты ліста нешта ахвяраваць раённым калгасам, ці не.

Цікава: колькі такіх адрасатаў атрымалі афіцыйныя просьбы дапамагчы «найбуйнейшаму вытворцу сельгаспрадукцыі»? Якім прынцыпам кіравалася «вэртыкаль», адбіраючы прадпрыемствы, каб зьвярнуцца па грошы? І якая ўсё ж частка пасяўной легла на плечы тых, хто ня мае паводле роду дзейнасьці ніякіх адносінаў да сельгаспрадукцыі?

Доказы таго, што айчынная сыстэма сельскай гаспадаркі, прабачце, пайшла па сьвеце з торбай, ужо валяюцца проста пад нагамі. Гэты афіцыйны дакумэнт, якому няма падставаў не даваць веры, знайшоў на прыпынку транспарту мой муж.

Яшчэ цікавая рэч: у многіх сельсаветах Менскага раёну ніякае даведкі атрымаць няможна, пакуль ня сплаціш падаткаў на зямлю… да канца бягучага году. Звычайна апошні тэрмін аплаты гэтых падаткаў — 1 лістапада. Супрацоўнікі сельсаветаў кажуць, што іх прысьпешвае вышэйшае начальства. Самі ж органы мясцовай улады бедныя, некаторыя ня маюць нават кампутараў, заробкі супрацоўнікаў — проста сьмешныя. Напрыклад, у Юзафоўскім сельсавеце (Меншчына) раней працаваў землямер, які займаўся ўсімі пытаньнямі прыватных зямельных участкаў. Але звольніўся, бо атрымліваў 90 тысяч у месяц. Ягоныя абавязкі леглі на плечы старшыні сельсавету, які й так ледзь дае рады: калгасу ў Юзафове даўно няма, і абсалютна ўсе пытаньні мусіць вырашаць адзін чалавек. Вось старшыня і разрываецца паміж падаткамі, прарывам водаправоду, пагрозай закрыцьця паліклінікі, сэлектарнымі нарадамі. У гэтай і суседніх вёсках ёсьць каму працаваць, на маіх вачах людзі нават купляюць дамы і пераселяюцца сюды з гарадоў. Але на працу амаль усе езьдзяць у Менск. Гэта ёсьць прыкладам беларускай вёскі без калгасаў у пэрыяд паўраспаду апошніх.

Тацяна Сьнітко



МИНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
220073, г. Минск, ул. Ольшевского, 8
тел. 254-70-35

25.03.2003 № 1-91
на №

Руководителю
ООО "Автоцентр КАМАЗ"

Минский район является одним из крупнейших производителей сельскохозяйственной продукции Минской области.

Несмотря на принимаемые исполкомом и предприятиями агропромышленного комплекса района меры, финансовое положение совхозов и колхозов остается сложным.

С целью успешного проведения весенне-полевой кампании и выполнения прогнозных показателей социально-экономического развития, утвержденных на 2003 год в части производства сельскохозяйственной продукции, Минский райисполком просит Вас оказать разовую финансовую помощь в размере 500,0 тыс.руб.

Средства просьба перечислить на р/с 3732204630016 в МОУ АКБ Белагропромбанка г.Минска, код 942. Получатель: Управление сельского хозяйства и продовольствия Минского райисполкома, УНН 600208253.

Надеемся на понимание и заранее благодарим Вас за содействие.

Председатель исполкома Л.В.РУСАК

Зак. 1162

БРСМ — палёгка для гультаёў

Праўрадавы Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі набірае ўсё большае вагі ў дзяржаўнай машыне. Прымаюць у БРСМ, як колісь у камсамол, «добраахвотна-прымусовым» чынам. Студэнт пэдагагічнага ўнівэрсытэту распавёў «НН», што на лекцыю да першакурсьнікаў папросту прыходзіў дэкан і раздаваў анкеты: усім трэба запоўніць і ўступіць у БРСМ. Пытаньне «хачу/не хачу» ў такой сытуацыі не абмяркоўваецца.

2000 рублёў уступных складак — не адзіная цана, якую даводзіцца плаціць за чырвона-зялёную значку з надпісам «БРСМ». Студэнты Нацыянальнага тэхнічнага ўнівэрсытэту на сабе адчулі, што прэсынг за нежаданьне ўступіць у «лукамол» можа быць досыць жорсткім.

Праблемы пачаліся ў БНТУ яшчэ ў зімовую сэсію. Студэнтам, якія не былі сябрамі БРСМ, не выдавалі ведамасьці на пераздачу. А за два тыдні да пачатку летняе сэсіі на факультэце зьявіўся малады чалавек (гадоў 25—27), які заклікаў усіх студэнтаў запісвацца ў «лукамол». Галоўным яго аргумэнтам быў той самы: у сяброў арганізацыі праблемаў зь пераздачамі іспытаў ня будзе. У «лукамол» актыўна пайшлі двоечнікі й аматары лёгкага жыцьця.

Праз нейкі час пасьля агульнай сустрэчы адбылася спатканьне «камсамольца» з старастамі акадэмічных групаў. Тады быў агучаны й «плян набору» ў арганізацыю: на факультэце, дзе навучаюцца блізу 2000 чалавек, мусіць быць 500 сяброў БРСМ.

Да тых, хто «не зразумеў падобраму», былі ўжытыя больш жорсткія меры. За тыдзень да пачатку сэсіі высьветлілася, што да яе не дапушчаныя некалькі навучальных групаў з розных курсаў («НН» вядомыя групы з 2-га й 3-га курсаў). Не дапушчаныя цалкам, дарма што студэнты паздавалі ўсе залікі. Прадстаўнік моладзевай арганізацыі загадкава пасьміхаўся. Дэкан толькі паціскаў плячыма, замест таго каб паставіць на месца нахабнага «лукамольца». «Карныя меры» былі зьнятыя пасьля таго, як у БРСМ увайшлі па некалькі (4—5) чалавек з кожнае групы.

Студэнт А. з «акадэмічна непасьпяховай» групы ў гутарцы з карэспандэнтам «НН» зазначыў: «Я ў «лукамол» не пайду ні ў якім разе. Хай хоць выганяюць». Да адлічэньня за «нячленства» ўнівэрсытэцкае начальства мо і не дадумаецца, але адзнакі студэнтам за «паліткарэктнасьць», а не за веды, ужо ставіць.

Адны хлопцы славу для Бацькаўшчыны здабываюць, другія грошы зарабляюць, трэція рупліва вучацца. А чацьвертыя, гультаі, толькі і ўмеюць у жыцьці — у БРСМ заганяць.

Аркадзь Шанскі



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

КАМЭНТАР

І Калугін як бонус

12 чэрвеня было падпісанае пагадненьне паміж Беларускай праваслаўнай царквой і дзяржавай. Усе намаганьні грамадзкае думкі давесьці, што ня можа быць «галоўнага» веравызнаньня ў гістарычна шматканфэсійнай Беларусі, выявіліся марнымі.

Цяпер у Беларусі дэ-факта ёсьць дзяржаўная рэлігія. Сьвятароў іншых хрысьціянскіх канфэсіяў (ня кажучы пра іншыя рэлігіі) ужо не дапускаюць да іхных вернікаў у войска і турмы. Пратэстанты бясконца скардзяцца й падаюць у суд на органы ўлады, якія перашкаджаюць ім зьбірацца разам для чытаньня Бібліі (!) і супольнай малітвы. Крышнаітаў саджаюць на «суткі» за «несанкцыяваныя шэсьці» ды называюць у школьных падручніках дэструктыўнай сэктай.

Кіраўніцтва краіны імкнецца да поўнага кантролю за грамадзянскай супольнасьцю: адзін прафсаюз, адна моладзевая арганізацыя. Цяпер яшчэ — адна царква. Толькі ня будзе гэта на карысьць самой царкве. А.Лукашэнка паказаў, што гэтая царква мусіць стаць такім самым дзяржаўным органам, як і БРСМ або Акадэмія навук М.Мясьніковіча. Яшчэ крыху — і біскупаў будзе зацьвярджаць асабіста кіраўнік Беларусі, як цяпер ён зацьвярджае судзьдзяў. Нібы каб паказаць царкве на яе месца, канкардат ад імя дзяржавы падпісваў нават ня сам А.Лукашэнка, а прэм'ер-міністар Г.Навіцкі. Яўнае прыніжэньне для мітрапаліта Філарэта…

Што праўда, улада, прынізіўшы БПЦ, у дзень цырымоніі абвесьціла пра амністыю «дбайніку» аб праваслаўнай веры, былому дырэктару заводу «Атлянт» Л.Калугіну. Мітрапаліт заступаўся за Л.Калугіна адразу пасьля арышту — вынік быў толькі цяпер. БПЦ атрымала гэткі «бонус» за добрую гульню.

Адам Воршыч

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Тры месяцы на нелегальным становішчы

16 чэрвеня міліцыянты затрымалі прафэсара Юр'я Хадыку, завочна засуджанага за арганізацыю ў сакавіку народнага маршу «За лепшае жыцьцё!». На працягу амаль трох месяцаў намесьнік старшыні БНФ «Адраджэньне» пасьпяхова хаваўся ад праваахоўных органаў.

Ня часта беларускія палітыкі пераходзяць на нелегальнае становішча, пазьбягаючы адседкі на Акрэсьціна за апазыцыйную дзейнасьць. Хадыка гэтым хацеў прыцягнуць увагу грамадзтва да арыштаў, якія паралізуюць дзейнасьць палітыкаў.

Юр'я Хадыку затрымалі каля яго дому 17 сакавіка, на пяты дзень пасьля Народнага маршу. Але суд над ім тады не адбыўся, бо супрацоўнікі Савецкага РУУС няправільна склалі пратакол. Хадыка ня стаў чакаць новага паседжаньня і перайшоў на нелегальнае становішча. Зразумела, ён не сядзеў у схованцы, а хадзіў на працу, пісаў у газэты (у тым ліку і «НН»). Тым часам 19 траўня судзьдзя Руслан Казадаеў завочна засудзіў прафэсара на 15 ночаў арышту. Міліцыя нарэшце затрымала Хадыку 16 чэрвеня — высадзіла з машыны, якой ён меўся ехаць на працу. Цяпер яму пагражае яшчэ адна адміністрацыйная справа — зьнявага да суду. Разгледзяць яе 2 ліпеня. А 23 чэрвеня ў зьняволеньні Ю.Хадыка сустрэне свой 65-гадовы юбілей.

АТ

Школьніцу арыштавалі на экзамэне

18-гадовая Тацяна Ялавая была затрымана, як толькі выйшла з кабінэту пасьля пасьпяховай здачы экзамэну па гісторыі Беларусі — яе апошняга экзамэну ў школе. Супрацоўнікі міліцыі паказалі актывістцы «Зубра» Ялавой рашэньне суду Цэнтральнага раёну Менску ад 19 траўня, паводле якога яна была завочна асуджаная на 10 сутак арышту. Прычына — удзел у акцыі «Далоў тыранаў», якой «зуброўцы» выказвалі салідарнасьць зь дзеяньнямі ЗША ў Іраку. Акцыя адбылася 3 красавіка ля амэрыканскай амбасады.

БТ

Кучма піша кнігу

пад назваю «Украіна не Расея»

На запрашэньне Беларускага ПЭН-цэнтру ў Менску й Полацку пабываў украінскі літаратар Аляксандар Ірванец. Паэт («ARCHE» — украінскі нумар), празаік, драматург («НН» №52—53'2001, «Дзеяслоў», №1) Ірванец, якога ахвотна запрашаюць у этэр усе ўкраінскія ток-шоў, уяўляе сабой тып творцы, у Беларусі пакуль рэдкі, — экспансіўны, адкрыта палітызаваны, ахвочы да публічнага чытаньня ўласных вершаў экстравэрт у чырвонай кашулі. Ён смудзіць «Галюаз» цыгарку за цыгаркай і ўжо адной сваёй прысутнасьцю ператварае самую эўраадрамантаваную кватэру ў дзот усходнеэўрапейскай багемы.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

«НН»: Што яшчэ яднае Беларусь і Ўкраіну, акрамя Чарнобылю?

Аляксандар Ірванец: Для Ўкраіны засталіся тры дзяржавы — Расея, Беларусь і Малдова, — куды яшчэ можна ехаць бязь візаў. Гэта таксама пэўны паказьнік. Украінцы пра беларусаў, а беларусы пра ўкраінцаў думаюць: яны там жывыя ці ўжо нежывыя? Ва Ўкраіне націскаюць на палітычны момант, а ў Беларусі — на эканамічны: вы, маўляў, зарабляеце свае «сярэднія» 100 даляраў, а ўкраінцы зарабляюць 50. Хоць статыстыка гэтая вельмі адносная.

«НН»: У нас любяць шкадаваць украінскіх «зюдарбайтэраў»...

А.І.: Гэта таксама паказьнік. Да вас прыяжджаюць на працу найбольш валынцы і мае землякі з Роўеншчыны — з двух рэгіёнаў, дзе найвышэйшы ўзровень беспрацоўя.

«НН»: Чаму?

А.І.: Заходняя Ўкраіна ў савецкія часы спэцыяльна рабілася эканамічна слабейшай, каб ня рыпаліся ўкраінцы. Таму цяпер, калі ўсходні індустрыяльны цэнтар мае значныя праблемы, Заходняя Ўкраіна папросту «ляжыць». І зь яе едуць ня толькі ў Беларусь — самыя энэргічныя прарываюцца ў Польшчу, Чэхію, Італію, Партугалію. У нас багата было і публікацыяў пра ўкраінскіх гастарбайтэраў, і тэлевізійных праграм: зь Міляну, Лісабону, Парыжу. Там існуюць цэлыя рынкі нелегальнае працы, дзе зьбіраюцца пераважна ўкраінцы. І яны там знаходзяць працу: хто — на дзень, хто — на месяц.

«НН»: Мы колісь пісалі, што ў Італіі прызначаны адмысловы грэка-каталіцкі біскуп для ўкраінскіх вернікаў. Колькі наагул украінцаў сёньня працуе ў Заходняй Эўропе?

А.І.: Там ня тысячы, там — мільёны. Мільёны найбольш энэргічных, працаздольных людзей. Мільёны тых, хто хоча жыць лепш. Сытуацыя, ведама, ня дужа суцяшальная. Яны прыяжджаюць, прывозяць грошы, якіх дастаткова, каб купіць кватэру, аўто, заплаціць за асьвету дзяцей. А каб адкрыць уласную справу — недастаткова.

Але ж ня ўсё так блага. Людзі жывуць за мяжой, вывучаюць чужую мову, чужыя звычаі, бачаць, як можна жыць. І гэта ўжо няблага. Нядаўна ў Партугаліі быў выпадак, калі ўлады захацелі надаць украінцам-нелегалам афіцыйны статус. І з тых 180—200 тысячаў прыйшлі зарэгістравацца толькі тысячаў дваццаць. Рэшта не прыйшла, бо ня бачыць сябе назаўжды ў Партугаліі. Яны плянуюць вярнуцца, яны ведаюць, што вернуцца, і таму ім гэта непатрэбна. Гэта пазытыўны фактар.

«НН»: На гэтым тыдні Менск наведаў украінскі прэм'ер Віктар Януковіч, якога шмат хто ў Беларусі бачыць наступнікам Кучмы. Як Вы ацэньваеце яго й ягоныя палітычныя пэрспэктывы?

А.І.: Януковіч быў вядомы падчас свайго данецкага губэрнатарства як прыхільнік рашучых і часам жорсткіх мэтадаў кіраваньня. Відавочна, ён праводзіць такую самую лінію і на вышэйшай дзяржаўнай пасадзе.

Застаецца менш як паўтара году да выбараў, палітычнае жыцьцё актывізуецца. В.Януковіч — адзін з значных прэтэндэнтаў. Але важкі прэтэндэнт і Віктар Юшчанка з блёкам «Наша Ўкраіна», і кіраўнік Адміністрацыі прэзыдэнта Віктар Медзьвядчук, і тыя «меншыя» апазыцыянэры, якія ўваходзяць у «чацьвёрку» зь Юшчанкам: Юлія Цімашэнка, Аляксандар Мароз.

«НН»: За каго Вы самі будзеце галасаваць?

А.І.: На папярэдніх парлямэнцкіх выбарах ва ўсіх была думка: «Юшчанка пераможа й так. Гэта страшэнна папулярная асоба, прыгожы, самавіты чалавек. Яго любяць жанчыны пэнсійнага і перадпэнсійнага веку. Ён свае 5% набярэ». І ён набраў іх зь вялікаю перавагай. А галасавалі многія за Ю.Цімашэнку альбо за А.Мароза — больш радыкальных апанэнтаў Кучмы. Я асабіста, маючы павагу да Юшчанкі, аддаў голас за Цімашэнку. І, на маё шчасьце, ейны блёк таксама пераадолеў 5-адсоткавы бар'ер. На прэзыдэнцкіх Юшчанка зьбярэ болей галасоў ужо ў першым туры.

«НН»: Ці можа пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2004 г. рэалізавацца той сцэнар, які Вы апісалі ў рамане «Роўна/Ровно», — краіна распадзецца на заходнюю і ўсходнюю паловы? Маскоўскія палітэхнолягі актыўна праводзілі такую лінію на апошніх парлямэнцкіх выбарах.

А.І.: Кардынальнага расколу няма, і я ня думаю, што ён магчымы. Але процістаяньне Захаду і Ўсходу ёсьць — на мэнтальным узроўні. Яно існуе пачынаючы з показак і сканчаючы ўзроўнем барацьбы ў найвышэйшых палітычных эшалёнах. Чаму Ўкраіна ня можа падзяліцца? Таму што ў нас ёсьць цэнтралізаваная ўлада. Кучма рыхтуе новую рэформу, ён правёў ужо яе «ўсенароднае абмеркаваньне», у якім узялі ўдзел некалькі мільёнаў людзей. І хоць гэта рыса, якой ня варта хваліцца, — вы ня думайце, што наш прэзыдэнт слабейшы за вашага. Ваш вельмі дэманстрацыйна паказвае сваю сілу, а наш дзейнічае ціхаю сапаю.

«НН»: Але ж у вас ёсьць пэўнасьць, што будучыня ўкраінскай мовы ня будзе пастаўленая пад сумнеў, што яна ня страціць статусу дзяржаўнай. Ва Ўкраіне ўжо сфармавалася плюралістычная палітычная эліта. І відаць, што Кучма, нягледзячы на сваю адыёзнасьць, ня будзе пераглядаць гэтую базу.

А.І.: Наколькі мне вядома, Кучма цяпер піша кнігу (ну, вы разумееце, як ён яе «піша»). Назва гэтай кнігі ўжо згадвалася на старонках украінскіх газэтаў, яна называецца «Ўкраіна — не Расея». Гэта, можа, і ёсьць паказьнік. Ці здолее беларускі прэзыдэнт напісаць кнігу з такой назвай?

«НН»: Кучма хоча застацца ў гісторыі як «гетман»?

А.І.: Дзяржаватворца!.. Дзяржава абыякавая да ўкраінскамоўных. Прынамсі, яны на гэта заўжды наракаюць. А вось прафэсар Юры Шавялёў, патрыярх украінскае гуманітарыстыкі з амэрыканскай дыяспары (ён памёр нядаўна), прыехаўшы ў Кіеў, сказаў: «Кіеў нагадвае горад пад акупацыяй; улада, начальства гавораць па-ўкраінску, а гараджане — па-расейску».

«НН»: Але ж гэта не трасянка, а паўнавартасная ўкраінская мова!

А.І.: Найгорш з усяго начальства гаворыць па-ўкраінску сам Кучма. Ён вывучыў мову, але ў яго яна настолькі штучная і натужлівая... Затое расейскамоўны Януковіч дужа добра авалодаў мовай зь першага дня свайго прэм'ерства. Усе міністры гавораць па-ўкраінску, за адным выняткам: віцэ-прэм'ер Азараў, расеец, адзін з герояў стужак маёра Мельнічэнкі, падкрэсьлена скрозь гаворыць па-расейску.

«НН»: Такі дэманстратыўны расеец для расейскага электарату?

А.І.: Ён не прадстаўнік расейскага лобі. Хутчэй рэпрэзэнтуе данецкі клан.

«НН»: Ці ўсьведамляюць украінскія колы беларускі досьвед? Ці ведаюць яны, наколькі беспрынцыповай можа быць крыміналізаваная бюракратыя ў сваім змаганьні за ўладу?

А.І.: Бясспрэчна, разумнейшыя намагаюцца вучыцца на чужых памылках. Хаця, бадай, усе людзі вучацца на сваіх уласных — прычым кепска і слаба.

Гутарылі
Павал Абрамовіч
і Мікола Бугай

За мяжу да землякоў

Штогод каля дзесяці чэскіх настаўнікаў ад'яжджаюць у розныя куткі сьвету, каб вучыць дзяцей эмігрантаў роднай мове. Пэтар Скоржапа, які працуе ў вёсцы Свата Гелана (румынская правінцыя Банат), зрабіўся для тутэйшых чэхаў галоўным мясцовым аўтарытэтам — разам з старастам і ксяндзом.

Маладога настаўніка пасялілі ў доме мясцовага гаспадара, у якога было дзьве дачкі. Далей падзеі разгортваліся як у апавяданьнях з календароў XIX ст. Вясельле й нараджэньне дачкі не прымусілі сябе доўга чакаць. Цяпер Пэтар Скоржапа да абеду вучыць дзяцей чэскай мове й інфарматыцы, выдае школьны часопіс ды вядзе музычны гурток. Па абедзе ён правярае сшыткі на лузе, а ўвечары дапамагае цесьцю рабіць авечы сыр. Яшчэ Пэтар загадвае мясцовай бібліятэкай, дзе каля чатырох тысячаў чэскіх кніг. Адзінае, чаго троху ён пабойваецца, — ужо блізкага вяртаньня на бацькаўшчыну. Пэтар ясна разумее, што такога жыцьця, як у Банаце, там яму ня будзе.

Скоржапа не адзіны, хто паехаў «у місію». Чэскія настаўнікі працуюць сярод суайчыньнікаў у Румыніі, Харватыі, Сэрбіі, Чарнагорыі, ва Ўкраіне, у Польшчы ды Расеі. Раней мелі і сваю настаўніцу эмігранты ў Аўстраліі, а цяпер плянуецца паслаць настаўніка да чэхаў, што жывуць у Аргентыне. Аддзел замежных сувязяў пры Мінадукацыі штогод атрымлівае ад эмігранцкіх асяродкаў па сорак просьбаў прыслаць пэдагога.

Маючы такую заяву, аддзел наймае настаўніка. Кантракт складаецца на год, але яго можна працягнуць, калі вучні ды іх бацькі ня супраць. Больш за пяць гадоў місія доўжыцца ня можа, каб чалавек не адарваўся зусім ад чэскіх рэаліяў. Хто звычайна жадае паехаць у місію? Нейкага адназначнага тыпу не існуе: зьвяртаюцца як маладыя настаўнікі (так што хуткае Скоржапава жанімства — не адзіны такі выпадак), так і пэдагогі перадпэнсійнага веку. Больш заяваў падаюць жанчыны, але сярод тых, хто ад'яжджае, жанчын і мужчын прыблізна пароўну.

Кандыдат мусіць мець добрае здароўе (як фізычнае, так і псыхічнае), быць самастойным, актыўным, камунікатыўным і глядзець на жыцьцё з аптымізмам. Пажадана мець досьвед жыцьця ў эміграцыйных асяродках, на вёсцы ды ўвогуле ў неспрыяльных умовах. Як маеш два гады пэдагагічнай практыкі, ведаеш мову краіны, дзе будзе місія, здаў іспыт па чэскай мове — дык і паедзеш. Добра, калі кандыдат умее граць на якім музычным інструмэнце ці мае досьвед у аматарскім тэатры, — тады ён будзе больш запатрабаваны ў эміграцкім асяродку. Заробак пэдагогу налічаецца на рахунак у Чэхіі, а ў місіі ён мае кішэнныя грошы — да тысячы даляраў у месяц. Чаму ж ня ехаць?

Пераклаў Ільля Глыбоўскі
паводле «Lidove noviny»

Кадафі будуе капіталізм

Мода на сацыялізм скончылася. Лібійскі правадыр Муамар Кадафі ў суботу скасаваў у краіне грамадзкую і дзяржаўную формы ўласнасьці ды абвесьціў пра пачатак эры народнага капіталізму.



«Пры дзяржаўнай уласнасьці ўсё толькі раскрадаюць, а знайсьці сумленных і самаадданых мэнэджэраў немагчыма», — заявіў кіраўнік Джамахірыі. У «новай» Лібіі ўсё будзе прыватызавацца: банкі, аэрапорты, чыгункі, аўтадарогі і, перш за ўсё, нафта, што дае краіне 90% прыбытку. Разам зь лібійцамі ў прыватызацыі змогуць удзельнічаць замежныя бізнэсоўцы. Каб ажыцьцявіць радыкальныя пераўтварэньні, Кадафі правёў чысткі ва ўрадзе, а прэм'ерскі фатэль аддаў ранейшаму міністру эканомікі Шокры Ганэму. Пераходны пэрыяд «рынкавага сацыялізму» Кадафі не спатрэбіўся.

Кадафі, які ў 80-я быў сымбалем антызаходняга фанатызму, выракся рэвалюцыі. Апошнія гады ён спрабуе паразумецца з Амэрыкай і Эўропай — сваімі ранейшымі ворагамі. У студзені 2002 г. Кадафі адкрыў сьвету аўтаркічную лібійскую гаспадарку, а цяпер чакае, калі ЗША здымуць санкцыі, накладзеныя на яго за падтрымку міжнароднага тэрарызму.

Кадафі разьвітаўся і зь летуценьнямі пра аб'яднаную Афрыку пад яго загадам. Радыкальны плян неадкладнага скасаваньня межаў і дзяржаваў не атрымаў падтрымкі ў іншых афрыканскіх прэзыдэнтаў, напалоханых інтэрвэнцыямі лібійскага спэцназу ў Тога, Чадзе і Цэнтральнаафрыканскай Рэспубліцы. У суботу зьнявераны Кадафі загадаў ліквідаваць Міністэрства афрыканскага адзінства ды ўключыць яго на правах дэпартамэнта ў склад МЗС.

Украінская дыяспара супраць «Нью-Ёрк Таймз»

Не сканчаецца паласа скандалаў вакол амэрыканскай газэты «Нью-Ёрк Таймз». Новы выпадак: украінская дыяспара ў ЗША патрабуе пазбавіць нябожчыка-журналіста Вальтэра Д'юранці Пулітцэраўскае прэміі.

Савецкая ўлада наўмысна выклікала ва Ўкраіне голад, каб задушыць сялянскі супраціў калектывізацыі. Д'юранці ж паведамляў 31 сакавіка 1933 г. з Кіева: «Ніякага голаду няма». Праз паўгоду ў наступнай дэпэшы з украінскай сталіцы ён сьцьвярджаў, што «ўсе паведамленьні наконт голаду — гэта перабольшаньне ці наўмысная прапаганда». І гэта праз год пасьля таго, як Д'юранці атрымаў самую прэстыжную журналісцкую ўзнагароду — прэмію Пулітцэра — за «бесстароннія і аб'ектыўныя рэпартажы з СССР». Асаблівую славу прынесла яму інтэрвію з Сталіным, узятае ў 1929 г. Амэрыканскі журналіст назваў крамлёўскага тырана «найвялікшым палітыкам».

Нават сучасьнікі Д'юранці не пагаджаліся зь ягоным аптымізмам. Так, карэспандэнт брытанскай газэты «Манчэстэр Гардыян» Малькальм Магерыдж, рызыкуючы жыцьцём, сам зьезьдзіў ва Ўкраіну і апісаў жахі галадамору, пасьля чаго назваў Д'юранці «найвялікшым хлусам сярод журналістаў».

Калі Д'юранці ўдасца пазбавіць прэміі, гэта будзе першы такі выпадак з часу яе заснаваньня ў 1917 г.

Не схаваўся ў Польшчы

У Варшаве затрыманы мянчук Сяргей Дзёўкш. Сярод ахвяраў гэтага кончанага наркамана — супрацоўнік Камітэту па барацьбе з арганізаванай злачыннасьцю маёр Ігар Кашкан. Затрымлівалі злачынца беларускі «Алмаз» і польскае Цэнтральнае бюро вышукаў. Цяпер вырашаецца пытаньне аб экстрадыцыі С.Дзёўкша ў Беларусь.

Званы Дыстомы

Жыхары спаленай у вайну грэцкай вёскі патрабуюць кампэнсацыяў ад ураду Нямеччыны.

Дыстома — назва гэтай вёскі гучыць для грэкаў таксама, як для беларусаў Хатынь. 10 чэрвеня 1944 г. карнікі з 7-га танкавага полку СС уварваліся ў вёску, наўгад схапілі 228 сялянаў — спрэс кабет ды дзяцей — і расстралялі іх, пасьля чаго спалілі ўсе хаты. Гэта была помста за партызанскі напад. Для нешматлікіх жыхароў Дыстомы, якія здолелі схавацца ад карнікаў, вайна працягваецца.

Зь сярэдзіны 90-х жыхары Дыстомы патрабавалі кампэнсацыяў ад нямецкага ўраду. Адказам было: «Вы ўжо ўсё атрымалі». На канфэрэнцыі ў Парыжы ў 1945 г. Грэцыя запатрабавала ад Нямеччыны 7,5 млрд даляраў ды 7,5 млрд райхсмарак, але атрымала толькі вартыя сьмеху 115 млн марак, падпісаўшы ў 1961 г. зь Нямеччынай пагадненьне аб кампэнсацыях.

Зразумеўшы марнасьць сваіх высілкаў, жыхары Дыстомы зьвярнуліся ў 1997 г. у суд грэцкага гораду Лівадыі. Той пастанавіў, што ўрад Нямеччыны мусіць сплаціць кампэнсацыю жыхарам Дыстомы ў памеры 26,5 млн эўра. Арэапаг, найвышэйшы суд краіны, падтрымаў гэтае рашэньне. Нямецкі ўрад падаў апэляцыю, аднак прайграў, пасьля чаго сума, якую патрабавалі да кампэнсацыі, паднялася да 50 млн эўра.

Калі ўрад Нямеччыны зноў адмовіўся выплачваць грошы, жыхары Дыстомы праз суд паспрабавалі сканфіскаваць нямецкую нерухомасьць у Атэнах, у прыватнасьці будынак, дзе знаходзіцца Інстытут імя Гётэ — дзяржаўная ўстанова, якая пашырае за мяжой веды пра культуру Нямеччыны. Судовы прыстаў у суправаджэньні паліцыі нават наведаў той дом, каб ацаніць яго для продажу. Над нямецкімі школамі ў Атэнах і Салёніках ды Нямецкім археалягічным інстытутам таксама навісла пагроза экспрапрыяцыі.

Амбасадара Грэцыі ў Бэрліне тэрмінова выклікалі ў міністэрства замежных справаў ФРН па тлумачэньні. Канцлер Шродэр патэлефанаваў свайму грэцкаму калегу. У справу ўмяшаўся міністар юстыцыі Грэцыі, які заявіў, што адмовіцца ставіць свой подпіс пад загадам аб канфіскацыі. Урэшце, калі МЗС Нямеччыны падало сустрэчную позву ў Арэапаг, той зьмяніў сваю думку і адхіліў патрабаваньне ў кампэнсацыях.

Нязломныя жыхары Дыстомы зьвярнуліся ў Страсбурскі суд па правох чалавека. І зноў параза. Паводле меркаваньня суду, толькі дзяржавы, а не прыватныя асобы, могуць выстаўляць падобныя прэтэнзіі да іншых дзяржаваў — гэтага патрабуе канцэпцыя дзяржаўнага імунітэту.

Здавалася, Нямеччына на гэты раз перамагла. Аднак грэкі пайшлі ў апошнюю атаку — падалі скаргу ў нямецкі Вярхоўны суд. Слуханьні па справе павінны скончыцца 26 чэрвеня. Калі суд пастановіць, што адказчыкам павінен быць урад Нямеччыны, справу перададуць на разгляд нямецкага Вярхоўнага канстытуцыйнага суду.

Нямецкі ўрад, які з палёгкай сустрэў заканчэньне перамоваў пра выплаты тым, хто быў гвалтам вывезены на працу ў Нямеччыну, цяпер з жахам чакае на прэцэдэнт, які дасьць магчымасьць патрабаваць ад яго новых кампэнсацыяў. Няма сумневу, што ацалелыя жыхары іншых спаленых вёсак ва ўсёй Эўропе таксама пачнуць судзіцца зь Нямеччынай. Аднак шанцы на перамогу ў жыхароў Дыстомы невялікія. Хутчэй за ўсё, ім давядзецца канчаткова пераканацца, што вайна сапраўды скончылася.

Алесь Кудрыцкі

Сто інтэлектуалаў супраць вайны

Большасьць расейскіх артыстаў і інтэлектуалаў змагаюцца за ласку новага асьвечанага цара-Пуціна і, нібы Пушкін ці Дастаеўскі ў XIX ст., падтрымліваюць палітыку сілавога ўціхамірваньня ўскраінаў. Толькі сотня расейскіх праваабаронцаў выйшла ў Маскве на дэманстрацыю пад лёзунгам «Чачэнія, даруй нам!». «Далоў вайну!», «Пуцін бараніў Ірак ад Буша, хто абароніць Чачэнію ад Пуціна?», «Досыць бессэнсоўнай вайны, дзе загінулі 100 000 чачэнцаў і 10 000 жаўнераў!» — можна было прачытаць на іншых плякатах. Арганізатарам пратэсту быў сатырык Віктар Шандаровіч. Да яго далучыліся пісьменьнік Віктар Ерафееў, паэтка Бэла Ахмадуліна, удава акадэміка Сахарава Алена Бонэр. «Сустракаемся на такіх акцыях кожныя пару месяцаў. Паказваем, што ня ўся Расея падтрымлівае вайну. Больш нічога зрабіць немагчыма», — тлумачыць Шандаровіч. Людзі на вуліцы амаль не зважалі на дэманстрацыю, а міліцыянты непрыхавана зь яе кпілі. Міліцыі было амаль столькі ж, колькі дэманстрантаў.

Інтэрнэт у паветры

Нямецкая авіякампанія «Люфтганза» зьбіраецца падключыць да Інтэрнэту ўсе самалёты, што лётаюць па доўгіх маршрутах.

Распрацаваную канцэрнам «Боінг» інтэрнэт-сыстэму выпрабоўвае таксама авіякампанія «Брытанскія авіялініі».

Згодна з дамовай паміж «Люфтганзай» і «Боінгам», авіяканцэрн усталюе сыстэму «Канэкшн» на 80 самалётах, прычым ня толькі сваіх, але і на «Аэробусах», сваіх адвечных канкурэнтах. А да пачатку наступнага году Інтэрнэт будзе даступны ва ўсіх самалётах «Люфтганзы».

Нямецкая авіякампанія выпрабоўвае сыстэму «Канэкшн» з пачатку году. Першымі бясплатны Інтэрнэт атрымалі пасажыры бізнэс-клясы маршруту «Франкфурт—Вашынгтон». Аднак па меры павелічэньня колькасьці самалётаў з Інтэрнэтам карыстацца ім на дурня змогуць толькі пасажыры вышэйшай клясы ці тыя, хто мае права на скідкі. Усім астатнім давядзецца плаціць за доступ да сеткі. Цана на паслугу пакуль невядомая.

Пасажырам будзе прапанаваная неблагая хуткасьць злучэньня (да 20 мБ/с у выпадку прыёму дадзеных), а таксама выбар паміж кабэльным і бяздротавым спосабамі падлучэньня.

Аб укараненьні сыстэмы «Канэкшн» пачынаюць думаць таксама японскія і скандынаўскія авіяперавозчыкі. Амэрыканскім авіякампаніям, зьнясіленым фінансавымі праблемамі, пакуль не да таго.

Матэрыялы паласы падрыхтаваў Франц Субель

20 чэрвеня пятніца

● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10 Сэрыял «Агенцтва НЛС».
9.10, 17.15 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.05 Сад мары.
10.30 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.55 Падарожжа дылетанта. «...І ўзьняўся з попелу Мазыр».
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.15 Добры дзень, Беларусь!
13.05 «Дзяржаўная мяжа». Сэрыял. Фільм 5-ы «Год 41-ы» («Беларусьфільм»). 1-я сэрыя.
14.35 «Сцэнары мастацтва». Дак. сэрыял.
15.15 «Далікатны ўзрост». Сэрыял.
15.50 Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі. «Непаседа», «Дыназаўрык», «Дзед і жораў». Мультфільмы.
16.15 «Руіны страляюць...». Сэрыял («Беларусьфільм»). 3-я сэрыя.
18.15 Маст. фільм «Дзікія зьвяры сьвету» («Беларусьфільм»).
18.40 Драма «Паўночная зорка» (Францыя).
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Маст. фільм «Малы д'ябал».

● СТВ

6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.05 «Менск і менчукі».
8.10, 22.50 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: баявік «Замкнёнае кола». ЗША, 2001.
10.00 «Турпаход».
10.10, 23.15 Праект «Адлюстраваньне»»: «Палата №6». Дак. фільм.
11.00, 20.30 «Аўтапанарама».
11.15 «Тэатральныя гісторыі».
11.30 «Вар'яцкі сьвет». Дак. фільм.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Чыста па жыцьці». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Клетка». Тэлесэрыял.
14.45 Мультфільм.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.15 Кіно: «Вечны покліч», 14-я сэрыя.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.20 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Рэактыўны бокс».
20.20 «Добры вечар, маленькі...».
20.50 Кіно: камэдыя «Мае самыя шчасьлівыя сьвітанкі».
23.00 «Навіны СНД».
0.00 Кіно: камэдыя «Хлопчыкі-дзяўчынкі». ЗША, 2001.

● Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
9.00, 16.00 Рухач.
14.00 «V.I.P.онія».
17.00, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
23.30 МэгаМікс.

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.05 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.05 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 «Ня толькі пра футбол».
10.10 «Сэрцы трох». 4-я сэрыя.
10.40 Сэрыял «Твінісы».
11.00 Прэс-канфэрэнцыя прэзыдэнта Расеі У.У.Пуціна.
13.00 Крылы. «Найвышэйшы пілятаж».
16.00 Камэдыя «Фаталісты».4-я сэрыя (заключная).
16.55 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Самі з вусамі».
18.35 «Жарт за жартам».
20.00 Час.
21.00 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
22.05 Шматсэрыйны фільм «Пяты вугал».
23.20 Адкрыцьцё XXV Маскоўскага міжнароднага кінафэстывалю.
0.00 Маст. фільм «Інтэрвію з вампірам» (ЗША).

● РТР

7.45 Тэлесэрыял «Галоўныя ролі».
8.40, 19.55 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Забіць крумкача».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 13.00, 19.00 Весткі.
10.20 «Кароткае замыканьне». Ток-шоў Фёдара Паўла-Андрэевіча.
11.00 Прэс-канфэрэнцыя прэзыдэнта РФ У.У.Пуціна для расейскіх і замежных журналістаў.
12.30 Мусульмане.
12.45 Весткі—Масква.
13.20 Прыгодніцкі фільм «Мяцеж на «Баўнці» (ЗША). 1962 г.
14.10 Тэлесэрыял «Маскоўскія вокны».
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
22.00 Сустрэча У.Пуціна з удзельнікамі конкурсу «Мой дом. Мой горад. Мая Краіна».
22.45 Вячэрні сэанс. Фантастычны фільм «Яны жывыя» (ЗША). 1988 г.

● Культура

15.10 «Партрэт».
16.05 «Са столі».
16.35 «Вайна стагодзьдзя». Дак. фільм. 3-я сэрыя. «Вучымся перамагаць».
17.30, 23.00 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 «Хто мы?». «Хроніка смутнага часу». Перадача 10-я.
18.25 «Містыка лёсу».
18.55 Ток-шоў «Аркестравая яма».
19.35 «Эндзі Пэндзі». Мультсэрыял.
19.45 «Тайны расейскай зброі». «Праект БМ-13».
20.10 «Дзямідавы». Маст. фільм. 2-я сэрыя.
21.25 «Лінія жыцьця».
22.20 Блеф-клюб.
23.25 «Хто там...».

● НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Зусім сакрэтна».
10.15 «Без рэцэпту».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога»..
17.25 «Каманда.ru».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Баявік «Агністы ліс».
22.25 Супэрбокс. Заб Джуда супраць Джуніёра Вітэра.

● Эўраспорт

9.30 Сучаснае пяцібор'е. Вугоршчына.
10.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Турцыя—ЗША. Паўтор.
11.45 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Бразылія—Камэрун. Паўтор.
13.30 Ралі. Кіпр. Паўтор.
14.00 Тэніс. Турнір АТР. Паўфінал. Хертагенбош. Жывая трансьляцыя.
15.30 Тэніс. Турнір WTA. Паўфінал. Істбарн. Жывая трансьляцыя.
17.00 Трыятлён. Чэмпіянат Эўропы. Жанчыны. Чэхія. Жывая трансьляцыя.
19.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Агляд матчаў. Францыя.
19.30 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Калюмбія—Новая Зэляндыя. Жывая трансьляцыя.
22.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Францыя—Японія. Жывая трансьляцыя.
0.15 «Формула». Часопіс.
0.30 Аўтагонкі. 24 гадзіны Ле Ману. Агляд.
1.30 «Фэрары». Часопіс.
2.00 Ралі. Кіпр.

21 чэрвеня субота

● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 «Не зявай!». Тэлеканал для дзяцей.
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.50 «Усё нармальна, мама!».
9.30 Маст. фільм «Маленькі сяржант» («Беларусьфільм»).
11.00 Здароўе.
11.30 Тэлевізійны Дом кіно. «Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі». Частка 2-я.
12.20 Вясёлая сямейка.
12.50 Падарожжа дылетанта. «Юравіцкія цікавосткі».
13.00 Сола для дэбютанта. Людміла Сідаркевіч (актрыса).
13.15 Плянэта АРТ.
13.40 «Ёсьць толькі міг...».
14.10 «Другая сусьветная вайна ў колеры». Дак. фільм.
15.15 «Жывы тавар. Стоп: трафік!» Відэафільм АТН.
15.40 Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі. «Не шарахцець», «Квака-задавака». Мультфільмы («Беларусьфільм»).
16.00 Драма «Яны ішлі на Ўсход».
18.35 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
19.00 «Мікалай Яроменка-старэйшы. Пасьлыслоўе». Дак. фільм.
19.30 Мэлядрама «Сын за бацьку».
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 «Маладэчна-2003». Нацыянальны фэстываль беларускай песьні і паэзіі.
0.50 Футбол. Кубак Інтэртота. «Шахцёр» (Беларусь) — «Ома Таўн» (Паўночная Ірляндыя).

● СТВ

7.25 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
7.50 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.15, 19.55 «СТВ-спорт».
8.25 «Рэактыўны бокс».
8.40 «Запрашаем паскардзіцца...».
8.50 «Плянэта людзей».
9.10 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.35 «Кіно — дзецям»: тэлефільм «Прыгоды Электроніка». СССР, 1979.
10.55 «Разам».
11.25 «Рамонт».
11.40, 20.15 Кіно: тэлесэрыял «Варыянт «Амэга». СССР, 1975.
13.05 Кіно: камэдыя «Ішоў сабака па раялі». СССР, 1978.
14.30 Праект «Адлюстраваньне»: «Подыюм». Дак. фільм.
15.25 «Клюб «Белы папугай». Найлепшае.
16.20 «Вовачка-2». Сэрыял.
16.55 «Найлепшыя шоў сьвету з Урмасам Отам».
17.50 Кіно: камэдыя «Жандар з Сэн-Трапэ».
19.30 «24 гадзіны».
21.40 Кіно: камэдыя «Беражыце мужчын». СССР, 1982.
23.00 «Навіны СНД».
23.15 Кіно: драма «Хлопцы з раю». Японія, 2000.

● Першы музычны канал

8.00 Рухач.
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00 Навіны.
8.05 Маст. Фільм «Пастарайся застацца жывым».
9.10 «Тайна неўміручасьці». Дак. фільм.
9.35 Мы робім «Ералаш»-2.
10.05 «Падводны сьвет Андрэя Макарэвіча».
10.30 «Сэрцы трох». 5-я сэрыя, заключная.
11.25 Прэм'ера. «Крэмль-9».
12.05 «Сьмешныя людзі».
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.00 Навіны (з субтытрамі).
14.20 «Слабае зьвяно».
15.15 «Ералаш».
15.25 Юбілейны канцэрт У.Шаінскага «Калі мае сябры са мной».
17.25 «Ідалы».
17.50 «Гісторыя Маскоўскага кінафэстывалю».
18.20 Маст. фільм «Уварваньне». СССР, 1980 год.
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
21.00 «Поле цудаў».
22.05 Творчы вечар Аляксандра Абдулава.
23.35 Трылер «Прэзумпцыя невінаватасьці». ЗША.

● РТР

8.05 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Забіць крумкача».
10.00, 16.00, 19.00 Весткі.
10.20 Дэтэктыў «Пуаро Агаты Крысьці. Забойства Роджэра Акройда».
12.15 «Клюб сэнатараў».
13.00 Весткі.
13.20 «Мая сям'я».
14.15 «Пакой сьмеху».
15.15 «Сынэманія».
15.45 «Экспэртыза».
16.20 «Сам сабе рэжысэр».
17.20, 19.30 Мясцовы час. Весткі—Масква.
17.50 «Аншляг».
18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
19.55 Камэдыя «Уваход праз вакно». 2002 г.
22.30 Маст. фільм «Жыцьцё гэтага юнака» (ЗША). 1993 г.

● Культура

10.40 Маст. фільм Л.Шапіцькі «Ўзыходжаньне» паводле аповесьці В.Быкава «Сотнікаў».
12.30 «Запаведная Расея». «Дружба» на разьдзеленай зямлі».
13.00 «Генры Джэймз». Тэлесэрыял.
13.50 «Кліч продкаў». Мультфільм.
14.45 Кіно — дзецям. «Самая кепская ведзьма». Тэлесэрыял.
15.10 Музычная гісторыя ад Ціхана Хрэньнікава.
16.05 «Парыскі часопіс». «Барыс Вільдэ. Чалавек з Музэю Чалавека».
16.35 «Вайна стагодзьдзя». Дак. фільм. 4-я сэрыя. «Помста».
17.30, 23.00 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 Дзёньнік фэстывалю «Зоркі Белых начэй».
18.25 «Містыка лёсу». «Тры містычныя спатканьні Ўладзімера Салаўёва».
18.55 «Сфэры».
19.40 «Прывалаўскія мільёны». Маст. фільм.
22.20 «І даўжэй за стагодзьдзе...».
23.25 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».

● НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Каманда. ru».
10.00 «Кулінарны паядынак».
10.55 Спорт. «Лято 6 з 49».
11.00, 14.00, 16.00 «Сёньня» з Вольгай Бяловай.
11.30 «Краіна Саветаў».
12.30 Баявік «Выпадак у квадраце 36-80».
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Камэдыя «Вялікая няня-2».
18.00 «Найноўшая гісторыя. З камэры сьмяротнікаў на Лубянку».
18.50 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі. Махаон».
20.00 «Асабісты ўнёсак».
21.00 Баявік «Фактар холаду».
23.05 «Усё адразу!».

● Эўраспорт

9.30 Ралі. Кіпр. Паўтор.
10.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Калюмбія—Новая Зэляндія. Паўтор.
11.00 Трыятлён. Чэмпіянат Эўропы. Мужчыны. Чэхія. Жывая трансьляцыя.
13.00 Пляжны валейбол. Сусьветнае турнэ. Паўфінал. Жанчыны. Швайцарыя. Жывая трансьляцыя.
14.00 Тэніс. Турнір АТР. Фінал. Хертагенбош. Жывая трансьляцыя.
15.30 Ралі. Кіпр. Паўтор.
16.00 Лёгкая атлетыка. Кубак Эўропы. Флярэнцыя. Жывая трансьляцыя.
20.00 Футбол. Фэстываль моладзі. Фінал. Тулён. Жывая трансьляцыя.
22.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Бразылія—ЗША. Жывая трансьляцыя.
0.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Камэрун—Турцыя.
1.15 Ралі. Кіпр.
1.45 Тэніс. Турнір WTA. Фінал. Істбарн.

22 чэрвеня нядзеля

● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Дачка камандзіра». Маст. фільм («Беларусьфільм»).
8.20 5 цудаў.
8.30 Арсэнал.
9.05 Алхімія слова.
9.10 «Я, лейтэнант Махнач...». Дак. фільм.
9.40 Драма «Вянок санэтаў» («Беларусьфільм»).
11.10 Сад мары.
11.40 Музэюм. «Партрэты роду Завішаў».
12.15 «Галасы». Відэафільм.
12.55 «Ваша лято».
13.35 Сьвятыні Беларусі. «Менскі абраз Божай Маці».
14.00 «Прыватная хроніка часоў вайны». Дак. фільм. Фільм «Тварам да твару».
15.15 Лёс чалавека.
15.45 Ваенны кінараман «Чорная бяроза» («Беларусьфільм»).
18.00 Сэрыял «Барацьба за выжываньне».
18.55 Маст. фільм «У жніўні 44-га...».
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.50 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.15 Драма «Гадзіньнік спыніўся апоўначы» («Беларусьфільм»).

● СТВ

7.25 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
7.50 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.15 «СТВ-спорт».
8.30 «Філярманічны тыдзень».
8.35 «Менск і менчукі».
8.40 «Партрэт у інтэр'еры».
8.55 «Добры дзень, доктар!».
9.10 «Аўтапанарама».
9.35 «Кіно — дзецям»: тэлефільм «Прыгоды Электроніка». СССР, 1979.
10.50 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
11.15 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
11.30 «Сьвецкая хроніка».
11.40, 20.40 Кіно: тэлесэрыял «Варыянт «Амэга». СССР, 1975.
13.05 Кіно: маст. фільм «У чорных пясках». СССР, 1972.
15.00 Кіно: драма «Ў бой ідуць адны «старыя». СССР, 1973.
16.40 «Мэтафізыка Пецярбургу».
17.40 «Валянцін Елізар'еў. 30 год зь беларускім балетам».
18.15 «168 гадзін».
19.10 «Пакуль гарыць сьвечка...».
19.40 «Аўтапанарама».
20.00 «Асабісты інтэрас».
22.00 «Турпаход».
22.10 «Навіны СНД».
22.30 Кіно: маст. фільм «Ішоў чацьверты год вайны». СССР, 1984.

● Першы музычны канал

8.00, 13.45 Рухач.
12.00 «Чарнасьліў».
13.00 «Пра Fashion».
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 Служу Айчыне!
8.45 «Ералаш».
8.55 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Юкі адкрывае Дыснэйлэнд».
10.15 «Падарожныя нататкі».
10.35 Пакуль усе дома.
11.15 Дог-шоў.
11.55 Тайны забытых перамог. «Зброя перамогі. Кацюша».
12.25 «Клюб падарожнікаў».
13.05 Разумніцы й разумнікі.
13.35 Дыснэй-клюб: «Мышыны дом».
14.20 «Валадар смаку».
15.10 Ток-шоў «Выбар».
15.50 Баявік «Разьведчыкі».
17.15 «Вялікія бацькі».
17.50 Жывая прырода. «Прагулкі з дыназаўрамі. Тайна нараджэньня».
18.50 Маст. фільм «Перад сьвітаньнем».
20.30 Контуры.
21.15 Шон Конэры, Нікалас Кейдж і Эд Харыс у баевіку «Скала» (ЗША, 1996).
23.25 Часы.
0.25 Дзёньнік XXV Маскоўскага міжнароднага кінафэстывалю.
0.35 Камэдыя «Мафія» (ЗША).

● РТР

9.15 «Ранішняя пошта».
9.45 «Гарадок». Дайджэст.
10.20 Камэдыя «Матрос з «Камэты». 1958 г.
12.10 «Парлямэнцкі час».
13.00 Весткі.
13.20 «Вакол сьвету».
14.20 «Вайсковыя песьні». Канцэрт Дзьмітрыя Хварастоўскага.
15.15 «Доўгі, доўгі дзень».
16.00 Сьвяточны кацэрт, прысьвечаны 90-годзьдзю Мікіты Багаслоўскага.
17.05 Маст. фільм «Беларускі вакзал».
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Сусьветнае кіно. Прэм'ера. Маст. фільм «Вар'яцкі горад» (ЗША).
22.30 Маст. фільм «Розум і пачуцьці» (ЗША).

● Культура

11.10 Пецярбург-300. «Надзея». Дак. фільм.
11.25 «Рыцары сьмеху». «Дзеці-артысты».
11.55 Нядоўгія гісторыі.
12.10 «Ну, пачакай!». Мультфільмы.
13.00 «Вайна сьвяшчэнная». Дак. сэрыял. Фільм 1-ы. «Берасьце».
13.30 Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
14.25 «Час музыкі». Тэлечасопіс.
14.55 «У сьвеце танцу». «Зялёны стол». Фільм-балет.
15.35 «Людзі 1941 году». Дак. фільм.
16.30 «Кіно, якое было». «Марлен. Разьвітаньне з шасьцідзясятымі».
17.10 «Два Фёдары». Маст. фільм.
18.35 Магія кіно.
19.05 Сьмеханастальгія.
19.30 «Дом актора».
20.15 «Болей чым каханьне». Фільм 1-ы.
20.55 «Замкі жахаў». Дак. сэрыял.
21.20 Культ кіно. «Санаторы пад Клепсыдрай». Маст. фільм.
23.25 Джэм-5.

● НТВ

9.00 Сэрыял у нядзелі. «Каханьне ўдаўца»..
9.55 «Песьні вайны».
10.15 «Расьліннае жыцьцё».
10.50 Гуляем у «Кено».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 14.05 «Сёньня».
11.10 «Уплыў».
12.00 Маст. фільм «Атрад».
13.55 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Экстрэмальны кантакт. Нырцы ў жывёльным сьвеце», 13-я сэрыя, заключная.
15.50 «Жаночы погляд».
16.25 Баявік «Рызыка без кантракту».
18.05 «Калі заўтра вайна?». Фільм Аляксея Паборцава.
18.50 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі. Страсьці па Філонаву».
20.00 «Надоечы».
21.30 Фільм тыдня. Прэм'ера. Баявік «Атрад 10 з Наварону».

● Эўраспорт

9.30 Ралі. Кіпр. Паўтор.
10.00 Пляжны валейбол. Сусьветнае турнэ. Фінал. Жанчыны. Швайцарыя.
11.00 Веславаньне. Кубак сьвету. Мюнхен. Жывая трансьляцыя.
13.00 Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету. Сан Марына. Жывая трансьляцыя.
14.00 Супэрспорт. Сан Марына. Жывая трансьляцыя.
15.00 Лёгкая атлетыка. Кубак Эўропы. Флярэнцыя. Жывая трансьляцыя.
18.00 Пляжны валейбол. Швайцарыя. Жывая трансьляцыя.
19.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Бразылія—ЗША. Паўтор.
20.00 Супэрбайк. Чэмпіянат сьвету. Сан Марына.
20.30 Кік-боксынг. Паўтор.
21.45 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Жывая трансьляцыя.
0.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя.
1.15 Ралі. Кіпр.
1.45 Аўтагонкі сэрыі КАРТ. Сусьветныя сэрыі. Портлэнд.

Конкурс для падпісчыкаў

Рэдакцыя «Нашай Нівы» праводзіць розыгрыш каштоўных прызоў для тых, хто падпішацца на нашу газэту на 2-е паўгодзьдзе. Галоўны прыз — падарожжа на Балтыйскае мора. Дасылайце на адрас Рэдакцыі копіі сваіх падпісных абанэмэнтаў (на ўсё паўгодзьдзе). Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск.

Апошні дзень падпіскі — **23 чэрвеня**. Розыгрыш прызоў — **1 ліпеня**. Падпісны індэкс **63125**. Дык падпісвайся!

23 чэрвеня панядзелак

● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
9.10, 17.05 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.10 Плянэта АРТ.
10.35 Кліп-абойма.
11.15, 19.50 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15 Панарама: падзеі тыдня.
13.20 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
13.35 «Дзяржаўная мяжа». Сэрыял. Фільм 5-ы «Год 41-ы» («Беларусьфільм»). 2-я сэрыя.
14.45 Мультфільм «Шэсьць Іванаў — шэсьць капітанаў».
15.20 «Не зявай!».
15.45 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
16.10 Мультыклюб.
16.50 5 цудаў.
18.15 «Героямі былі ўсе».
18.35 З дакладных крыніц.
18.50 Маст. фільм «Шчасьлівец Люк» (Італія).
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
21.55, 23.15 «Маладэчна-2003». VII Нацыянальны фэстываль беларускай песьні і паэзіі.

● СТВ

6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20 «168 гадзін».
8.05 «Менск і менчукі».
8.10, 22.00 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: камэдыя «Мае самыя шчасьлівыя зоркі».
9.50 «Турпаход».
10.00 «Асабісты інтэрас».
10.40 «Канал гісторыі»: «Невытлумачальнае». Дак. фільм.
11.30 «Шалёны сьвет». Дак. фільм.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Капітан Праўда». Сэрыял.
13.30, 16.00, 19.30, 22.40 «24 гадзіны».
13.50, 18.35 «Ніна». Тэлесэрыял.
14.40, 15.50 Мультфільм.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.20 Кіно: «Вечны покліч».
17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
18.05 «Партрэт у інтэр'еры».
18.20 «Арт-экспрэс». Культурнае жыцьцё сталіцы.
19.55 «СТВ-спорт».
20.15 «Гульнявы рэфлекс».
20.25 «Добры вечар, маленькі».
20.45 Кіно: трылер «Інспэктар і забойца».
23.10 «Навіны СНД».
23.25 «Сталічны футбол зь Юр'ем Вяргейчыкам».
23.50 Хіт-момант. Вынікі месяцу.
0.05 Кіно: фільм жахаў «Крывавая хваля». ЗША, 2000 г.

● Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
9.00, 22.00 «120/80».
9.10, 16.00 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00, 18.45, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
18.00 «Пра Fashion».
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 22.50 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05 Контуры.
9.45, 18.10 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
10.30 Баявік «Скала». ЗША.
12.40 Сьледзтва вядзе Калабкоў.
15.30 Маст. фільм «Чалавек у жалезнай масцы».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
19.00 Чакай мяне.
20.00 Час.
21.00 Ток-шоў «Выбар».
21.45 Сэрыял «Пяты вугал».
23.05 Камэдыя «На кручку».
0.35 Дзёньнік Маскоўскага кінафэстывалю.

● РТР

7.45 Маст. фільм «Гэта жанчына ў акне...». 1993 г.
9.35 «Экспэртыза».
9.40 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00, 22.00 Весткі.
16.55 Футбол. Чэмпіянат Расеі. «Лякаматыў» (Масква) — «Дынама» (Масква). Жывая трансьляцыя са стадыёну «Лякаматыў».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
19.55 Тэлесэрыял «Тэатральны блюз».
21.00 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Небясьпечна для жыцьця».
22.20 Вячэрні сэанс. Баявік «Рака сьмерці» (ЗША). 1989 г.

● Культура

17.30, 23.00 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 Улада факту.
18.25 «Вайна сьвяшчэнная». Дак. сэрыял. Фільм 2-і. «Севастопаль».
18.55 М.Глінка. «Руслан і Людміла».
19.45 «Эндзі Пэндзі». Мультсэрыял.
19.55 Рэтраспэктыва фільмаў Іштвана Сабо. «Бацька». Маст. фільм.
21.25 «Тым часам».
22.05 Ток-шоў «Школа зласлоўя».
23.25 «Начны палёт».

● НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Надоечы» зь Леанідам Парфёнавым.
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўвым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 «Жаночы погляд».
17.10 «Увага. Вышук!».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.15 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў».
19.50 Сэрыял «Дальнабойнікі. Левы груз».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.30 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе».

● Эўраспорт

10.00 Матакрос. Чэмпіянат сьвету. Аўстрыя.
11.00, 20.00 Ралі. Кіпр. Паўтор.
11.30 Лёгкая атлетыка. Кубак Эўропы. Флярэнцыя. Паўтор.
13.00 Алімпійскі часопіс. Спэцыяльны выпуск.
14.00 Веславаньне. Кубак сьвету. Мюнхен. Паўтор.
15.00 Футбол. Легенды кубку сьвету. Швэцыя. Паўтор.
16.00, 17.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Паўтор.
19.00 Футбол. Спэцыяльны агляд.
19.30 Эўрагалы. Футбольны часопіс.
20.30 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат ЗША. Пало-Альто. Спэцыяльны агляд.
22.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Жывая трансьляцыя.
0.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя.

24 чэрвеня аўторак

● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10 «Чароўны сьвет моды». Дак. фільм.
9.10, 17.10 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.05 Існасьць. Духоўная праграма.
10.35 «Ёсьць толькі міг...».
11.00 З дакладных крыніц.
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.15 Добры дзень, Беларусь!
13.05 «Дзяржаўная мяжа». Сэрыял. Фільм 6-ы «За парогам Перамогі» («Беларусьфільм»). 1-я сэрыя.
14.35 «Сцэнар мастацтва». Дак. сэрыял.
15.15 «Далікатны ўзрост». Сэрыял.
15.45 Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі. «Кацяня Філя і...», «Пакаці-гарошак». Мультфільмы («Беларусьфільм»).
16.05 «Руіны страляюць...» Сэрыял («Беларусьфільм»).
18.15 «Агенцтва НЛС». Сэрыял.
19.05 Камэдыя «Ванільна-клубнічнае марозіва».
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Начны этэр.

● СТВ

6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.15 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.10, 22.35 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: трылер «Інспэктар і забойца».
10.10, 14.45 Хіт-момант. Вынікі месяца.
10.25 «Гульнявы рэфлекс».
10.35 «Сталічны футбол зь Юр'ем Вяргейчыкам».
11.00 «Пакуль гарыць сьвечка».
11.30 «Шалёны сьвет». Дак. фільм.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Капітан Праўда». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Ніна». Тэлесэрыял.
15.50 Мультфільм.
16.15 Кіно: «Вечны покліч».
18.05 «Добры дзень, доктар!».
18.20 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
20.05 «Запрашаем паскардзіцца».
20.15 «Добры вечар, маленькі».
20.30 «Закон і крымінал».
20.45 Кіно: дэтэктыў «Двайное забойства, ці Чатыры лісты фанэры».
22.45 «Навіны СНД».
23.00 Хіт-момант. Прэм'ер-выпуск.
23.25 Кіно: трылер «Ноч уцекача». ЗША, 1996.

● Першы музычны канал

7.00, 9.10 Рухач.
9.00 «120/80».
14.00 «ІнтэрАктыў».
16.00 «20-ка Першых».
17.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.35 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 18.55 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Прэм'ера. Шматсэрыйны фільм «Алмазная сьцежка».1-я і 2-я сэрыі.
11.40 Дыснэй-клюб: «Кім 5-з-плюсам».
15.25 Дэтэктыў «Толькі адна ноч» («Беларусьфільм»).
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Чаловек і закон.
20.00 Час.
21.00 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
22.05 «Павуціньне». Дак. фільм.
22.30 Сэрыял «Пяты вугал».
23.50 «На футболе» зь Віктарам Гусевым.
0.20 Дзёньнік Маскоўскага кінафэстывалю.

● РТР

7.45, 19.55 Тэлесэрыял «Тэатральны блюз».
8.45, 21.00 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Небясьпечна для жыцьця».
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00, 22.00 Весткі.
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
22.20 Фільм «Марына Ладыніна. Буйны плян».
22.45 Вячэрні сэанс. Баявік «Палёт захопніка» (ЗША).

● Культура

15.05 «Уладзімер Горавіц. Апошні рамантык». Дак. фільм.
16.35 «Плянэты». Дак. сэрыял. «Месяц».
17.30, 23.00 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 «Палацавыя таямніцы».
18.25 «Вайна сьвяшчэнная». Дак. сэрыял. Фільм 3-і. «Смаленск».
18.55 «Партытуры не гараць».
19.20 «Знакамітыя арыі». Сцэна з опэры В.Моцарта «Выкраданьне з сэралю».
19.35 «Эндзі Пэндзі». Мультсэрыял.
19.45 Рэтраспэктыва фільмаў Іштвана Сабо. «Мэфіста». Маст. фільм.
22.05 «Што рабіць?».
23.25 «Начны палёт».

● НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Увага. Вышук!».
10.10 «Расьліннае жыцьцё».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўвым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога».
17.25 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.15 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў».
19.50 Сэрыял «Дальнабойнікі. Школа дэмакратыі».
21.00 «Краіна і сьвет».
21.30 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе».

● Эўраспорт

9.30 Алімпійскі часопіс. Спэцыяльны выпуск. Паўтор.
11.00, 14.00 Футбол. Паўтор.
11.30, 14.30 Эўрагалы. Футбольны часопіс. Паўтор.
12.00, 16.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Паўтор.
13.30 Ралі. Кіпр. Паўтор.
15.00 Футбол. Легенды кубку сьвету. Германія. Паўтор.
17.30 Лёгкая атлетыка. Кубак Эўропы. Флярэнцыя. Паўтор.
19.00 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат ЗША. Пало-Альто. Спэцыяльны агляд. Паўтор.
20.30 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат сьвету. Прэвію.
21.00 Лёгкая атлетыка. Гран-пры. Атэны. Жывая трансьляцыя.
23.00 Бокс. ТВА. Жывая трансьляцыя.
1.15 Матагонкі. Брно.
1.45 Водна-маторны спорт.

25 чэрвеня серада

● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10 «Агенцтва НЛС». Сэрыял.
9.10, 17.15 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.05 Тэлевізійны Дом кіно. «Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі». Частка 2-я.
10.35 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.00 Сола для дэбютанта. Аляксандар Андрыенка (актор).
11.15, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.15 Добры дзень, Беларусь!
13.05 «Дзяржаўная мяжа». Сэрыял. Фільм 6-ы «За парогам Перамогі» («Беларусьфільм»). 2-я сэрыя.
14.45 «Масква—Менск».
15.15 «Далікатны ўзрост». Сэрыял.
15.45 «Апошні пялёстак». Мультфільм.
16.10 «Руіны страляюць...». Сэрыял («Беларусьфільм»).
18.15 «Агенцтва НЛС». Сэрыял.
19.05 Мэлядрама «Рэпэтытар» («Беларусьфільм»).
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Начны этэр.

● СТВ

6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.25 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.05 «Менск і менчукі».
8.10, 22.45 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: дэтэктыў «Двайное забойства ў бары, ці Чатыры лісты фанэры».
9.55 «Запрашаем паскардзіцца».
10.05, 23.10 Праект «Адлюстраваньне»: «Зладзеі ў законе». Дак. фільм.
10.50, 20.30 «Аўтапанарама».
11.05 «Закон і крымінал».
11.25 «Шалёны сьвет». Дак. фільм.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Капітан Праўда». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Ніна». Тэлесэрыял.
14.45 Мультфільм.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.20 Кіно: «Вечны покліч», 17 -я сэрыя.
18.05 «Плянэта людзей».
18.20 «Проста мама». Дак. фільм цыклу «Агульны дом».
20.10 «Турпаход».
20.20 «Добры вечар, маленькі».
20.45 Кіно: камэдыя «Макасыны Маніту».
22.55 «Навіны СНД».
23.55 «Ілюзіён»: маст. фільм «Адважныя капітаны». ЗША, 1937.

● Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
9.10, 16.00 Рухач.
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «120/80».
22.30 «Пра Fashion».
23.15, 1.00 МэгаМікс.
0.00 «Чарнасьліў».

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.30 Нашы навіны.
8.05, 9.05 Дабрачынны канцэрт да Дня абароны дзяцей.
9.45 Прэм'ера. Казачны баявік «Прынцэса Манаоке». Японія, 1997 г.
11.50 Маст. фільм «Цацка». Францыя.
13.25 Дэтэктыў «Эйс Вэнтура: дэтэктыў па вышуку хатніх жывёл».
14.50 Дэтэктыў «Эйс Вэнтура: кліч прыроды».
16.25 Прэм'ера. Дак. фільм «Птушкі», Францыя, 2001 г.
18.10 Маст. фільм «Пераключаючы каналы».
20.00 Час.
21.00 Ток-шоў «Выбар».
21.45 Прэм'ера. Маст. фільм «Імяніныніца».
23.45 Канцэрт «Поп-улёт!».

● РТР

7.45, 19.55 Тэлесэрыял «Тэатральны блюз».
8.45 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Небясьпечна для жыцьця». 2-я сэрыя.
9.40, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00, 22.00 Весткі.
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
21.00 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Сындыкат кілераў». 1-я сэрыя.
22.20 «Баль выпускнікоў». Жывая трансьляцыя.

● Культура

16.35 «Плянэты». Дак. сэрыял. «Зорка».
17.30, 23.00 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 «Айчына і лёсы».
18.25 «Вайна сьвяшчэнная». Дак. сэрыял. Фільм 4-ы. «Новарасійск».
18.55 «Вакзал мары».
19.35 «Эндзі Пэндзі». Мультсэрыял.
19.40 Рэтраспэктыва фільмаў Іштвана Сабо. «Палкоўнік Родль». Маст. фільм.
22.00 «Апокрыф». Ток-шоў.
22.40 «Фаэтон — сын сонца». Мультфільм для дарослых.
23.25 «Начны палёт».

● НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.30 Надвор'е на заўтра.
9.35 Дак. драма «Злачынства і пакараньне».
10.05 «Калі заўтра вайна?». Фільм А.Паборцава.
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўвым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога».
17.25 «Шчырае прызнаньне».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.15 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў».
19.50 Сэрыял «Дальнабойнікі. Апошняя гульня», 14-я сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет».
21.30 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе».

● Эўраспорт

9.30, 10.00 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.
10.30 Лёгкая атлетыка. Гран-пры. Атэны. Паўтор.
12.30 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат ЗША. Пало-Альто. Спэцыяльны агляд. Паўтор.
14.00 Сынхроннае плаваньне. Кубак Эўропы. Турцыя.
15.00 Лёгкая атлетыка. Гран-пры. Атэны. Жывая трансьляцыя.
17.00 Рэгбі. Кубак сьвету. U-21. Паўфінал. Англія. Жывая трансьляцыя.
18.45 Бокс. Паўтор.
19.30 Снукер. Чэмпіянат Эўропы. Германія.
21.15 Конны спорт. Кубак нацый. Ахен.
22.15 Гольф. US PGA. Спэцыяльны агляд.
23.15 Ветразевы спорт.
23.45 Прыгоды на прыродзе. Часопіс.
0.30 Прыгоды. Часопіс.
1.00 Аўтагонкі сэрыі Наскар. Бруклін.

26 чэрвеня чацьвер

● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.15 «Агенцтва НЛС». Сэрыял.
9.10, 17.10 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.05 Сьвятыні Беларусі. «Менская ікона Божай Маці».
10.35 Лёс чалавека.
11.00 Музэюм. «Партрэты роду Завішаў».
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.10 Добры дзень, Беларусь!
13.05 «Дзяржаўная мяжа». Сэрыял. Фільм 7-ы «Салёны вецер» («Беларусьфільм»). 1-я сэрыя.
14.35 «Сцэнары мастацтва». Дак. сэрыял.
15.15 «Далікатны ўзрост». Сэрыял.
15.40 Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі. «Несьцерка». Мультфільм («Беларусьфільм»).
16.00 «Руіны страляюць...». Сэрыял («Беларусьфільм»). Заключная сэрыя.
19.05 Мэлядрама «Споведзь утрыманкі».
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 Начны этэр.

● СТВ

6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Флінт — дэтэктыў у часе». Мультсэрыял. Заключная сэрыя.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.50 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Тэма дня».
8.10, 23.10 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: камэдыя «Макасыны Маніту».
9.50, 20.10 «Турпаход».
10.00 «Мэтафізыка Пецярбургу». Тэлефільм. Частка 3-я: «Знак вады». Частка 4-я: «Рэха рэвалюцыі».
10.55 «Партрэт у інтэр'еры».
11.10, 20.30 «Фільм, фільм, фільм».
11.25 «Шалёны сьвет». Дак. фільм.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Капітан Праўда». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Ніна». Тэлесэрыял.
14.45, 18.35 Мультфільм.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.15 Кіно: «Вечны покліч», 18-я сэрыя.
18.05 «Тэатральныя гісторыі».
18.20 «Рамонт».
20.20 «Добры вечар, маленькі».
20.50 «Павуціньне». Фільм-расьсьледаваньне.
21.15 Кіно: баявік «Замкнёнае кола-2». ЗША, 2002.
23.20 «Навіны СНД».
23.35 «Валянцін Елізар'еў. 30 год зь беларускім балетам».
0.05 Кіно: камэдыя «Малады Франкенштайн». ЗША.

● Першы музычны канал

7.00, 9.10, 16.00 Рухач.
9.00 «120/80».
14.00 «ІнтэрАктыў».
17.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.30 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.00 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 Шматсэрыйны фільм «Алмазная сьцежка».
11.40 Дыснэй-клюб: «Баз і яго каманда».
15.10 Трылер «Зьзяньне».
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.10 Сьмехапанарама.
20.00 Час.
21.00 «Ня толькі пра футбол».
21.25 «Слабае зьвяно».
22.25, 23.45 Сэрыял «Пяты вугал».
0.50 Дзёньнік Маскоўскага кінафэстывалю.

● РТР

7.45, 19.55 Тэлесэрыял «Тэатральны блюз».
8.45, 21.00 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Сындыкат кілераў».
9.45, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00, 22.00 Весткі.
17.50 «Камісар Рэкс». Тэлесэрыял.
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
22.20 Маст. фільм «Танцорка ў цемры». (ЗША—Францыя). 2000 г.

● Культура

15.15 «Кармэн-сюіта». Выконвае аркестар «Маладая Расея».
16.05 «Пецярбург: Час і месца». «Музэй чыгуначнай тэхнікі».
16.35 «Мая такая доля». Дак. фільм.
17.30, 23.00 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 «Хто мы?». «Хроніка смутнага часу». Перадача 11-я.
18.25 «Вайна сьвяшчэнная». Дак. сэрыял. Фільм 5-ы. «Ржэў».
18.55 «Царская лёжа». Міжнародны музычны фэстываль «Пецярбурская асамблея».
19.35 Рэтраспэктыва фільмаў Іштвана Сабо. «Ханусэн». Маст. фільм.
21.25 «Культурная рэвалюцыя».
22.20 «Эпізоды».
23.25 «Начны палёт».

● НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Шчырае прызнаньне».
10.00 «Кватэрнае пытаньне».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Пазднякоўвым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога».
17.25 «Вочная стаўка».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35, 22.15 Сэрыял «Вуліцы разьбітых ліхтароў».
19.50 Сэрыял «Дальнабойнікі. Самасуд», 15-я сэрыя.
21.00 «Краіна і сьвет».
21.30 Сэрыял «Сэкс у вялікім горадзе».

● Эўраспорт

9.30 Віндсэрфінг. Фэстываль.
10.15 Гольф. US PGA. Спэцыяльны агляд. Паўтор.
11.15 Снукер. Чэмпіянат Эўропы. Германія. Паўтор.
12.45 Сьпідвэй. Гран-пры. Вялікабрытанія.
13.45 Мота Гран-пры. Нідэрлянды. Жывая трансьляцыя.
17.30 Футбол. Бразыльскія Легенды кубку сьвету. Паўтор.
18.30 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Паўфінал. Францыя. Жывая трансьляцыя.
0.15 Футбол. Кубок Лібэртадорэс. Фінал.

27 чэрвеня пятніца

● БТ

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 18.00, 23.00 Навіны.
6.10, 7.10 Добрай раніцы, Беларусь!
8.10, 18.15 «Агенцтва НЛС». Сэрыял.
9.10, 17.15 «Псі-фактар». Сэрыял.
10.05 Сад мары.
10.30 «На скрыжаваньнях Эўропы. Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
10.55 Падарожжа дылетанта. «Юравіцкія цікавосткі».
11.10, 21.55 «Каралева сэрцаў». Сэрыял.
12.15, 14.10 Добры дзень, Беларусь!
13.05 «Дзяржаўная мяжа». Сэрыял. Фільм 7-ы «Салёны вецер» («Беларусьфільм»). 2-я сэрыя.
14.35 «Сцэнары мастацтва». Дак. сэрыял. Заключная сэрыя.
15.15 «Далікатны ўзрост». Сэрыял.
15.45 Да 30-годзьдзя беларускай анімацыі. «Асьцярожна! Карасі». Мультфільм («Беларусьфільм»).
15.55 Маст. фільм «Братухна».
19.05 Камэдыя «Пяшчотнае каханьне» (Францыя).
20.45 Калыханка.
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Навіны рэгіёну.
22.50 Зона Х.
23.15 «Сола для саксафона». Канцэрт Аляксандра Сярова.
0.15 Камэдыя «Мужчынскі санаторый» (Германія).

● СТВ

6.30 «Паўэр рэйнджэрз, ці Магутныя рэйнджэры». Тэлесэрыял.
6.55, 15.25 «Гаджэт і Гаджэціны». Мультсэрыял.
7.20, 17.55 «Меншчына. Людзі, падзеі, факты».
7.30, 13.30, 16.00, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
7.50, 19.55 «СТВ-спорт».
8.00 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
8.05 «Менск і менчукі».
8.10, 22.50 «Тэхналёгія».
8.20 Кіно: баявік «Замкнёнае кола-2».
9.55 «Турпаход».
10.05, 23.15 Праект «Адлюстраваньне»: «Камікадзэ». Дак. фільм.
10.50, 20.35 «Аўтапанарама».
11.05 «Тэатральныя гісторыі».
11.25 «Шалёны сьвет». Дак. фільм.
12.00 «Віно каханьня». Тэленавэла.
12.55 «Капітан Праўда». Сэрыял.
13.50, 18.35 «Ніна». Тэлесэрыял.
14.45 Мультфільм.
15.00 «Чалавек-павук». Мультсэрыял.
16.20 Кіно: «Вечны покліч», 19-я сэрыя.
18.05 «Філярманічны тыдзень».
18.10 «Сьвецкая хроніка».
18.20 «Менск і менчукі».
18.25 «Тэма дня».
20.10 «Рэактыўны бокс».
20.25 «Добры вечар, маленькі».
20.50 Кіно: камэдыя «Пасьля тусоўкі».
23.00 «Навіны СНД».
0.00 Кіно: баявік «Меч прынцэсы». Японія, 2001.

● Першы музычны канал

7.00 «Пад'ёмнік».
9.00, 16.00 Рухач.
14.00 «V.I.P.онія».
17.00, 19.40, 22.10 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
22.00 «120/80».
22.30 «20-ка Першых».
23.30 МэгаМікс.

● АНТ

8.00, 9.00, 18.00, 20.30, 23.15 Нашы навіны.
8.05 Тэлеканал «Добрай раніцы».
9.05, 19.00 «Зямля каханьня, зямля надзеі». Сэрыял.
9.50 «Ня толькі пра футбол».
10.10 Шматсэрыйны фільм «Алмазная сьцежка». 5-я сэрыя, заключная.
11.05 Сэрыял «Твінісы».
15.10 Трылер «Зьзяньне». ЗША.
17.00 «Вялікае мыцьцё».
18.10 «Жарт за жартам».
20.00 Час.
21.00 «Поле цудаў».
22.10 Сэрыял «Пяты вугал», заключная сэрыя.
23.30 Выпускны баль.

● РТР

7.45 Тэлесэрыял «Тэатральны блюз».
8.45 Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Сындыкат кілераў».
9.45, 18.50 Весткі. Дзяжурная часьць.
10.00, 19.00 Весткі.
17.50 «Аншляг».
19.30 Мясцовы час. Весткі — Масква.
19.50 «Дабранач, дзеці!».
19.55 Камэдыя «Не будзіце сабакі, які сьпіць». 1991 г.
22.30 Юбілейны канцэрт Сімона Асіяшвілі.

● Культура

15.15 Р.Штраўс. «Жыцьцё героя».
16.05 «Парыскі часопіс».
16.35 «Рай для бамжоў». Дак. фільм.
17.30, 23.00 Навіны культуры.
17.50 «Парадак слоў». Кніжныя навіны.
17.55 Дзёньнік фэстывалю «Зоркі Белых начэй».
18.25 «Вайна сьвяшчэнная». Дак. сэрыял. Фільм 6-ы. «Масква».
18.55 Ток-шоў «Аркестравая яма».
19.35 «Пакуль мы не сустрэнемся зноў». Маст. фільм. 1-я сэрыя.
21.15 «Лінія жыцьця».
22.10 Блеф-клюб.
22.45 «Кастрама». Мультфільм для дарослых.
23.25 «Хто там...».

● НТВ

9.00 «Сёньня раніцай».
9.20 Надвор'е на заўтра.
9.25 «Найноўшая гісторыя. З камэры сьмяротнікаў на Лубянку».
10.15 «Без рэцэпту».
11.00, 16.00 «Сёньня» з Кірылам Паздняковым.
14.35 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.30 Сэрыял «Хуткая дапамога».
17.25 «Каманда.ru».
18.00 «Сёньня» з Тацянай Мітковай.
18.35 «Свабода слова».
19.55 Дэтэктыў «Жар гораду».
22.00 Супэрбокс. Ленакс Льюіс супраць Олівэра Макола.

● Эўраспорт

9.30 Ветразевы спорт. Паўтор.
10.00 Конны спорт. Кубак нацый. Ахен. Паўтор.
11.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Паўфінал. Францыя. Паўтор.
13.45 Мота Гран-пры. Нідэрлянды. Жывая трансьляцыя.
17.15 Футбол. Кубок Лібэртадорэс. Фінал. Паўтор.
19.15 Бокс. Паўтор.
19.45 Сьпідвэй. Гран-пры. Вялікабрытанія. Паўтор.
21.00 «Формула». Часопіс.
21.30 Ралі. Чэмпіянат сьвету. Кіпр. Агляд.
22.45 Самы дужы чалавек. Гран-пры. Гаваі.
23.45 Самы дужы чалавек. Гран-пры. Фінляндыя.
1.00 Сэрыі. Аўтамотаспартовы часопіс.
1.30 Аўтагонкі. Монц.
2.00 Экстрэмальныя віды спорту. Паўтор.

28 чэрвеня субота

● БТ

7.00, 12.00, 23.50 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 «Не зявай!».
8.15 Існасьць. Духоўная праграма.
8.50 «Усё нармальна, мама!».
9.30 Экран індыйскага кіно. «Мяцежная душа». 1-я сэрыя.
11.05 Здароўе. Тэлечасопіс.
11.35 «Сьпявай, душа!» Фальклёрныя калектывы Слуцкага раёну.
12.15 Вясёлая сямейка.
12.45 Падарожжа дылетанта. «Галоўчыцы. Вотчына Горватаў».
13.00 Сола для дэбютанта. Арцём Шышкоў (скрыпка).
13.10 Плянэта АРТ.
13.35 «Ёсьць толькі міг...».
14.05 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства».
15.15 «Трагедыя ў Хатыні».
15.35 Камэдыя «Без аніводнай улікі».
17.20 КВК. 1/4 фіналу Эўралігі.
18.55 «На скрыжаваньнях Эўропы». Нацыянальны тэлефэстываль песьні.
19.20 Драма «Сілай зброі» (ЗША).
21.00 Панарама. Інфармацыйны канал.
21.45 Дэтэктыў «Казыно».
0.00 Музычны этэр.

● СТВ

7.25 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
7.50 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.15, 19.55 «СТВ-спорт».
8.25 «Рэактыўны бокс».
8.40 «Запрашаем паскардзіцца».
8.50 «Плянэта людзей».
9.10 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
9.35 «Кіно — дзецям»: тэлефільм «Прыгоды Электроніка». СССР, 1979. 3-я сэрыя.
10.45 «Разам».
11.15 «Рамонт».
11.30, 20.15 Кіно: «Д'Артаньян і тры мушкетэры». СССР, 1978. 1-я сэрыя.
13.05 Кіно: «Іронія лёсу, ці Лёгкі дух!». СССР, 1976. 1-я сэрыя.
15.20 «Клюб «Белы папугай». Найлепшае.
16.15 «Вовачка-2». Сэрыял.
16.50 «Найлепшыя шоў сьвету з Урмасам Отам».
17.45 Кіно: «Жандар у Нью-Ёрку».
19.30 «24 гадзіны».
21.50 Кіно: камэдыя «Дзевяць ярдаў». ЗША, 2000.
23.35 «Навіны СНД».
23.50 Кіно: мэлядрама «Кроў і пясок».

● Першы музычны канал

8.00 Рухач.
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20 «Ералаш».
8.25 Грай, гармонік любы!
9.00 Слова пастыра.
9.15 Здароўе.
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Смак».
10.30 «Смак зьмяі».
10.55 Дак. фільм «Агент, якому верыў Сталін».
11.35 Сьмехапанарама.
12.15 «Падарожжы натураліста».
12.45 «Каб памяталі...».
13.20 «Ералаш».
13.35 Дыснэй-клюб: «Геркулес».
14.10 «Расейская рулетка».
14.55 Выратавальнікі. Тэрміновы выклік.
15.20 Новыя цуды сьвету. «Вена. Прывіды старога гораду».
15.45 Баявік «Адлюстраваньне».
17.20 Прэм'ера дак. фільму «Шаалінь. Шлях воіна».
18.00 Маст. фільм «Сын француза».
20.00 Час.
20.30 Нашы навіны.
20.55 «Хто хоча стаць мільянэрам?».
21.55 Камэдыя «Шчырая размова».
23.30 Паваро́ці. Апошні канцэрт у Маскве.
0.10 Дзёньнік Маскоўскага кінафэстывалю.
0.20 Трылер «Лялькаводы».

● РТР

8.45 «Ранішняя пошта».
9.20 «Сто да аднаго».
10.15 «Сам сабе рэжысэр».
11.15 «У пошуках прыгод».
12.10 «Клюб сэнатараў».
13.00 Весткі.
13.20 Дэтэктыў «Пярсьцёнак з Амстэрдаму».
15.00 Футбол. Чэмпіянат Расеі. «Зэніт» (Санкт-Пецярбург) — ЦСКА. Жывая трансьляцыя з Санкт-Пецярбургу.
17.00 «Мая сям'я».
18.00 «Аншляг».
19.00 Весткі.
19.25 «Люстра».
19.50 Маст. фільм «Сьвяты».
22.10 Маст. фільм «Непрыстойная прапанова».

● Культура

11.05 ГЭГ.
11.20 «Графаман».
11.45 Да 95-годзьдзя з дня нараджэньня актрысы. «Шчырае мастацтва Марыны Ладынінай».
12.25 «Казаньне пра Зямлю Сібірскую». Маст. фільм.
14.00 «Прыстасаваны да жыцьця ў прыродзе». «Савана».
14.30 «Пасажыр з мінулага стагодзьдзя». Дак. фільм.
15.50 «Гузі Да Мэзі». Прэм'ера тэлевэрсіі спэктаклю.
17.00 «Вяртаньне блуднага папугая». Мультфільм.
17.30 Магія кіно.
18.00 «У вашым доме».
18.40 «Сфэры».
19.20 «Пакуль мы не сустрэнемся зноў». Маст. фільм. 2-я сэрыя.
21.00 Навіны культуры.
21.20 «Вялікія раманы дваццатага стагодзьдзя».
21.50 Упершыню на экране. «Эмі і Ягуар». Маст. фільм.
23.40 «Ква ў ква». Мультфільм для дарослых.

● НТВ

9.00 «Кулінарны паядынак».
9.55 «Кватэрнае пытаньне».
10.50 Спорт. «Лято 6 з 49».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня».
11.15 «Жыцьцё іначай». Прафэсія — рэпартэр.
11.40 «Служба выратаваньня».
12.10 Камэдыя «Прыватны дэтэктыў, ці Апэрацыя «Каапэрацыя».
14.05 Свая гульня.
15.20 «Жаночы погляд».
16.00 Драма «Гановэр Стрыт».
18.05 «Зусім сакрэтна. Шпіёны сутарэньняў».
18.50 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі. Легіён».
20.00 «Асабісты ўнёсак».
21.00 Баявік «Рэдкая адвага».
23.15 «Усё адразу!».

● Эўраспорт

9.30 Прыгоды. Часопіс. Паўтор.
10.00 Супэргоначны ўік-энд. Часопіс. Паўтор.
11.00 Футбол. Легенды кубку сьвету 1970—86 гг. Паўтор.
12.00 Футбол. Легенды кубку сьвету 1986—98 гг. Паўтор.
13.00 Мота Гран-пры. Галяндыя. Жывая трансьляцыя.
17.45 «Формула-3000». Нюрбургрын.
19.00 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Жывая трансьляцыя.
21.00 Супэргоначны ўік-энд. Данінгтон.
21.30 Баявыя адзінаборствы. ТВА.
23.30, 1.45 Экстрэмальныя віды спорту.
0.45 Пляжны валейбол. Сусьветнае турнэ. Фінал. Жанчыны. Германія.

29 чэрвеня нядзеля

● БТ

7.00, 12.00, 15.00 Навіны.
7.15 «Крыс Каларада». Мультсэрыял.
7.40 5 цудаў.
7.50 Мультыклюб.
8.30 Арсэнал.
9.00 Алхімія слова.
9.05 «Сузор'е надзей». Нацыянальны тэлевізійны конкурс юных талентаў.
9.35 Экран індыйскага кіно. «Мяцежная душа». 2-я сэрыя.
11.15 Сад мары.
11.40 Музэюм. «Шэдэўры беларускага іканапісу».
12.15 «Усё нармальна, мама!».
13.00 «Ваша лято».
13.40 Сьвятыні Беларусі. «Жыровіцкі Сьвята-Ўсьпенскі манастыр».
14.10 Сэрыял «Чыста ангельскае забойства».
15.15 Лёс чалавека.
15.40 Сэрыял «Барацьба за выжываньне».
16.45 Камэдыя «Пераходны ўзрост».
18.05 Кліп-абойма.
18.45 Маст. фільм «Дачка Д'Артаньяна».
21.00 Панарама: падзеі тыдня.
21.55 Тэлебаромэтар. Прагноз надвор'я.
22.15 Прэм'ера. Маст. фільм «У руху».

● СТВ

7.25 «Дэніс-непаседа». Мультсэрыял.
7.50 «Дыназаўры». Мультсэрыял.
8.15 «СТВ-спорт».
8.30 «Філярманічны тыдзень».
8.35 «Менск і менчукі».
8.40 «Партрэт у інтэр'еры».
8.55 «Добры дзень, доктар!».
9.10, 19.35 «Аўтапанарама».
9.35 «Кіно — дзецям»: камэдыя «Ласкава запрашаем, ці Пабочным уваход забаронены».
10.50 «Сьнеданьне зь Інай Афанасьевай».
11.15 «Сьвецкая хроніка».
11.25, 20.40 Кіно: «Д'Артаньян і тры мушкетэры». СССР, 1978. 2-я сэрыя.
13.05 Кіно: «Іронія лёсу, ці Лёгкі дух!». СССР, 1976. 2-я сэрыя.
15.05 Арт-экспрэс. Культурнае жыцьцё сталіцы.
15.20 Кіно: «Сябар». СССР, 1988.
16.50 «Усё для цябе».
17.15 «Мэтафізыка Пецярбургу».
18.15 «168 гадзін».
19.05 «Пакуль гарыць сьвечка...».
19.55 «Асабісты інтэрас».
22.20 «Турпаход».
22.30 «Навіны СНД».
22.45 Кіно: камэдыя «Няма вестак ад Бога».

● Першы музычны канал

8.00, 13.45 Рухач.
12.00 «Чарнасьліў».
13.00 «Пра Fashion».
17.00 Музыка.RU.
18.00, 19.40 УльтраМікс.
19.30 People-mix.
23.00 МэгаМікс.

● АНТ

8.00 Сэрыял «Твінісы».
8.20, 13.25 «Ералаш».
8.30 Армейскі магазын.
8.55 Дыснэй-клюб: «Легенда пра Тарзана».
9.15 «У сьвеце жывёл».
10.00, 14.00 Навіны (з субтытрамі).
10.10 «Юкі адкрывае Дыснэйлэнд».
10.15 «Падарожныя нататкі».
10.35 Пакуль усе дома.
11.15 Дог-шоў.
11.55 «Крылы».
12.20 «Клюб падарожнікаў».
12.55 Разумніцы й разумнікі.
13.35 Дыснэй-клюб: «Мышчын дом».
14.10 «Валадар смаку».
15.05 «Куміры».
15.35 Ток-шоў «Выбар».
16.15 Маст. фільм «Хто, калі ня мы».
17.45 Жывая прырода. «Баляда пра Вялікага Ала».
18.45 «Сьмешныя людзі».
20.30 Контуры.
21.10 Баявік «Антыкілер».
23.10 Цырымонія закрыцьця XXV Маскоўскага міжнароднага кінафэстывалю.
0.10 Часы.

● РТР

9.15 «Ранішняя размова».
9.45 «Гарадок».
10.20 Камэдыя «Самы дурацкі карабель у войску» (ЗША). 1960 г.
12.00 «Вакол сьвету».
13.00 Весткі.
13.20 «Сьвет на мяжы».
13.50 «Пакой сьмеху».
14.55 Чэмпіянат сьвету па аўтагонках у клясе «Формула-1». Гран-пры Эўропы. Жывая трансьляцыя з Нюрбургу.
17.00 Маст. фільм «Эйр Амэрыка» (ЗША). 1990 г.
19.00 Весткі тыдня.
20.10 Камэдыя «Шосты элемэнт» (ЗША). 2001 г.
22.05 Прэм'ера. Драма «Фатаздымак Клэр» (ЗША). 2001 г.

● Культура

11.35 «Рыцары сьмеху». Майстры раньніх кінакамэдый.
12.05 Нядоўгія гісторыі.
12.20 Прагулкі па Брадвэі.
12.45 «Кракадзіл Гена», «Чабурашка», «Шапакляк», «Чабурашка ідзе ў школу». Мультфільмы.
13.55 «Прыстасаваны да жыцьця ў прыродзе». «Пустыня».
14.25 «На незнаёмым вакзале». Дак. фільм.
15.45 «Час музыкі». Тэлечасопіс.
16.10 «Шэдэўры сусьветнага музычнага тэатру». Дж.Вэрдзі. Опэра «Двое Фаскары».
18.20 «Старая пласьцінка». Мультфільм.
18.40 Зорныя гады «Ленфільму».
19.20 «Пакуль мы не сустрэнемся зноў». Маст. фільм. 3-я сэрыя.
21.00 «Больш чым каханьне». Фільм 2-і.
21.45 «Культ кіно». «Турэцкія лазьні». Маст. фільм.
23.25 «Джазафрэнія».

● НТВ

9.10 Сэрыял у нядзелю. «Каханьне ўдаўца».
10.05 «Вы будзеце сьмяяцца!».
10.15 «Расьліннае жыцьцё».
10.50 Гуляем у «Кено».
10.55 Надвор'е на заўтра.
11.00, 15.00 «Сёньня».
11.15 «Уплыў».
12.00 Маст. фільм «Шосты».
13.50 Смачныя гісторыі.
14.05 Свая гульня.
15.20 «Гісторыі паляўнічага на кракадзілаў. Востраў Фрэзер».
15.50 Ток-шоў «Прынцып даміно».
16.55 Баявік «Кікбаксэр-2».
18.50 Сэрыял у выхадныя. Баявік «Агент нацыянальнай бясьпекі. Доктар Фаўст».
20.00 «Надоечы» зь Леанідам Парфёнавым.
21.30 Трылер «Імітатар».

● Эўраспорт

9.30 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Паўтор.
11.00 Супэргоначны ўік-энд. Чэмпіянат сьвету. Данынгтон.
12.00 «Формула-3000». Нюрбургрын. Паўтор.
13.00, 14.30, 15.45, 17.15 Супэргоначны ўік-энд. Чэмпіянат сьвету. Данінгтон. Жывая трансьляцыя.
13.30, 16.15 Пляжны валейбол. Сусьветнае турнэ. Паўфінал. Мужыны. Германія. Жывая трансьляцыя.
14.45 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Францыя. Паўфінал. Спэцыяльны агляд.
18.15 Рэгбі. Кубак сьвету. U-21. Фінал. Англія. Жывая трансьляцыя.
20.00 Супэргоначны ўік-энд. Чэмпіянат сьвету. Данынгтон. Спэцыяльны агляд.
21.30 Футбол. Кубак Канфэдэрацыі. Фінал. Францыя. Жывая трансьляцыя.
0.15 Аўтагонкі сэрыі Наскар. Санама.
1.15 Індыкар.

Найхарашэйшая кніга году

Пытайцеся кнігу
Ўладзімера Арлова і Зьмітра Герасімовіча
«Краіна Беларусь. Ілюстраваная гісторыя»
ў кнігарнях і незалежных распаўсюднікаў.

Прэзыдэнт Беларусі Аляксандар Лукашэнка ўручыў гэтую кнігу ў якасьці прызу шасьцідзесяці самым таленавітым школьнікам краіны.

Тэлебачаньне «ў мажоры»

Гарадзенскае тэлебачаньне вяшчае трынаццаць з паловай гадзінаў замест ранейшых пяці. Абласное радыё — пятнаццаць замест шасьці. За валам прадукцыі пра якасьць думаць няма часу.

Нядаўна ў Горадні зьбіралі подпісы пад лістом, адрасаваным Лукашэнку і Пуціну. Дзьве тысячы падпісантаў абурыліся дзеяньнямі Ягора Рыбакова, які заявіў, што перадатчыкі ў сямі гарадах Беларусі пераключаць з рэтрансьляцыі каналаў «Россия» і «Культура» на перадачы мясцовых тэлерадыёаб'яднаньняў. (Два перадатчыкі, дарэчы, знаходзяцца на Гарадзеншчыне — у Смургонях і Слоніме.) Мне такія дзеяньні нагадалі час, калі «актывісткі» зь ліку баявых жонак расейскіх вайскоўцаў змагаліся тут супраць беларускай мовы.

Сёньня студыя тэлебачаньня Горадні павялічыла час вяшчаньня з пяці да 13 з паловай гадзін. Абласное радыё — з шасьці да 15. Трансьляцыя перадачаў «Маяка» каштуе 600 тыс. даляраў. Перамовы з маскоўскімі калегамі вядуцца зь леташняга жніўня. Сума прымушае беларусаў весьці дыялёг настойліва і канкрэтна. За паслугі трэба плаціць.

Што да мясцовага тэлесыгналу, то яго на канале «Культура» прымаюць 50% насельніцтва вобласьці. Аднак гэта не перашкаджае перакрываць блёкі расейскай рэклямы на «Культуры» ўласнай рэклямай. Такія правы тэлерадыёаб'яднаньне набыло ў агенцтва «Відэа Інтэрнэшнл — Менск».

Але Мінсувязі выдаткоўвае сродкі для ўзьвядзеньня на Гарадзеншчыне перадатчыка для абласной студыі тэлебачаньня. Значыць, не пацерпяць ні «Культура», ні РТР. Дзьве тысячы падпісантаў могуць спаць спакойна. «Аб'ектыўнай» расейскай інфармацыяй яны будуць забясьпечаны трывала і надоўга.

Так было

Рэйтынг абласнога тэлерадыёаб'яднаньня, паводле дасьледаваньняў лябараторыі «Новак», складае 3,4%. Яшчэ нядаўна гэтая лічба была роўная 0,8%. Ад таго часу тэхнічная база студыі абнавілася на 10%, а калектыў — на 20%. Будзем лічыць, што выпускнікі гарадзенскага філфаку здолелі сваім талентам узьняць рэйтынг мясцовага ТБ, які, паводле словаў старшыні абласнога тэлерадыёаб'яднаньня Ўладзімера Пярцова, упаў быў «ніжэй калена».

Гарадзенцы добра памятаюць цыклы тэлепраграмаў «Толькі па пятніцах», «Гарадніца», «Тэлекабінэт улады», «Неруш», «Вячэрняя Горадня», «Па сутнасьці», «Размова з нагоды», «Жывём на зямлі адной», «Кола думак». З канца перабудовачных 80-х да другой паловы 90-х гэтыя перадачы мелі вялікі посьпех. Дый У.Пярцоў прызнаўся, што ў яго родным Віцебску вучыліся тэлемайстэрству, праглядаючы відэакасэты з запісамі работ гарадзенскіх калег.

У 1990 ці 1991 г., напярэдадні развалу СССР, з Масквы прыяжджалі спэцыялісты-ідэолягі, якія вывучалі ўзаемаадносіны жыхароў Гарадзеншчыны розных на-

Старшыня тэлерадыёаб'яднаньня Ўладзімер Пярцоў прыехаў у Горадню зь Віцебску, дзе працаваў на мясцовым радыё.

цыянальнасьцяў. Цікавіліся ўплывам на гэтыя стасункі тэле- і радыёперадач. Выявілася, што рэйтынг мясцовага ТБ дасягаў амаль двух (!) працэнтаў. А вяшчалі ж адну гадзіну ў дзень — з 17.00 да 18.00! Гледачы падчас апытаньняў упэўнена называлі прозьвішчы журналістаў Кацярыны Шрубейкі, Надзеі Сакаловай, Ігара Лякіна, Аляксандра Ласьмінскага, Алы Бяловай, Лілеі Кумкі...

«Ніжэй калена» якасьць тэлестудыі ўпала ў канцы 90-х. Тады на кіраўнікоў тэлерадыёаб'яднаньня аблвыканкам пачаў «сватаць» дзялкоў ад культуры, якія ведалі, як арганізаваць сельскі фэст, але баяліся заходзіць у студыю, бо нічога не разумелі ў тэлежурналістыцы. На бяду, якраз гэтым часам сышлі ці былі прымушаны пакінуць студыю ключавыя журналісты.

Гавораць і паказваюць

Цяпер раніцай у этэр выходзіць праграма «Утро в мажоре». Маладыя людзі гутараць, як умеюць, з гасьцямі. Паўзы запаўняюцца відэакліпамі. Тэмпарытм падмяняецца надуманай весялосьцю, якой прыкрываецца разгубленасьць і недастатковая падрыхтоўка. Іншы раз ад спробы вядучага (вядучай) сфармуляваць пытаньне да ўдзельніка размовы ці выказаць уласную думку становіцца ніякавата, калі ня сорамна. Хто ж ня ведае, што добры экспромт — гэта загадзя падрыхтаваны варыянт. Зусім вусьцішна, калі вядучая заблытваецца, называючы нумар тэлефону, які не супадае з нумарам, пададзеным «бягучым радком». Спроба перавесьці «пракол» у «прыкол» выглядае вартай жалю. Прафэсійны журналіст ніколі гэткага не дапусьціў бы. Кіраўнік ці яго намесьнік правялі б «крутую разборку», зрабілі аргвывады. «Трох гадоў расстрэлу» вінаваты пазьбег бы, але ганарару не далічыўся б.

Праграму «Утро в мажоре» напаткала й іншая небясьпека. На паралельных каналах працуюць «ранішнікі» зь Менску, Масквы, Варшавы. Шкада, што ніхто ў Горадні не цікавіцца рэйтынгам польскай праграмы «Kawa czy herbata». Там ёсьць чаму павучыцца — ад афармленьня студыі, работы тэлеапэратараў, трапнасьці інтэрвію да сьціплага, але з густам, адзеньня вядучых — дарэчы, чамусьці асобаў толькі сярэдняга веку. Гэта дасьведчаныя і цікавыя суразмоўцы для любога спэцыяліста, запрошанага ў студыю.

Трынаццаць з паловай гадзінаў гарадзенскага вяшчаньня, за выключэньнем чатырох, адведзеных на трансьляцыю ўласнай творчасьці, запаўняюцца кіна- і відэафільмамі. Ня ўсе дрэнныя. Аднак агульны ўзровень невысокі. Гаворым пра недахоп вольнага часу ў дзяцей — і самі цягнем да экрану, прапануем далёка не найлепшыя ўзоры мастацтва.

WWW.TVR.GRODNO.BY

У студыі «Губернии». Праграму вядуць Галіна Карынідзі і Мікалай Мельячэнка.

Цяжка прыйдзецца абласным рэпартэрам, калі раптам улада на справе захоча павесьці ідэалягічную работу паводле напрацовак, прынятых на нарадзе з удзелам прэзыдэнта. Тут нахрапам ня возьмеш, кліпамі не абмяжуешся. Фільмамі-баевікамі не прыкрыешся. Патрэбна добрая падрыхтоўка кадраў, прафэсійны падыход, валоданьне тэмай. Пакуль што рэпартэры не гатовы да такой работы. Іх творчасьць накіравана на забесьпячэньне патрэб вытворчасьці. Пануе яго вялікасьць вал. Няма ўласных цікавых знаходак пры распрацоўцы тэмы, няма глыбіні аналітычных высноў.

Губэрнскі горад Г.

Праграма «Губерния» прэтэндуе на адметнасьць. Але чаму менавіта «Губерния»? У Канстытуцыі Беларусі не зафіксавана такой тэрытарыяльнай адзінкі. Назва папросту правакуе беларускага чалавека. Шматнацыянальная і шматканфэсійная Гарадзеншчына — не расейская глыбінка. Не пераканала тлумачэньне Ўладзімера Пярцова, маўляў, стваральнікі самі выбралі такую назву, яны маюць на гэта права. На тое ж і ёсьць кіраўнік, каб падначаленыя трымаліся літары закону, ня траціліся на безгустоўшчыну.

Абласныя тэленавіны засмучаюць звужанасьцю тэматыкі. Дастаткова зазірнуць на гарадзенскія сайты ў Інтэрнэце, каб даведацца куды больш, чым прапануе аб'яднаная служба навін тэлебачаньня і радыё. Відэасюжэты зацягнутыя, тэкставе суправаджэньне гучыць як дзяжурная фраза. Часьцяком рэпартэры тлумачаць тое, што глядач бачыць на экране, а не прапануюць зьвесткі, якія засталіся «за кадрам». Няма штодзённага журналісцкага расьсьледаваньня. Але дзе шукаць тых журналістаў!..

Нядаўна начальнік упраўленьня інфармацыі аблвыканкаму Ўладзімер Амелька добра-такі ўпікнуў студыю за няўменьне расставіць правільна акцэнты. Па Горадні пракацілася хваля мэнінгіту. А тут прыехаў высокі чыноўнік зь Міністэрства аховы здароўя. Вось бы яго запрасіць на «простую лінію» з гледачамі! Былі б зьнятыя многія пытаньні. Ды не, замест грунтоўнай гаворкі абмежаваліся 20-сэкундным сюжэтам. Ня выкарысталі моманту…

Сорак працэнтаў беларускасьці

Уладзімер Пярцоў вызначыў беларускамоўнасьць тэлерадыёаб'яднаньня ў 40%. Магчыма, і сам шчыра ў гэта верыць. Але дастаткова паглядзець праграму хоць бы аднаго дня, каб у гэтым засумнявацца. Раней гарадзенскія тэле- і радыёжурналісты на чале з Іванам Граблеўскім славіліся сваёй беларускай мовай. Той час мінуўся. Па-расейску загаварылі рэпартэры, якія нядаўна вялі перадачы на роднай мове. Так часьцяком бывае, калі ў кабінэтах кіраўнікоў гучыць толькі адна расейская. У будучым няведаньне дзяржаўнай беларускай мовы можа прынесьці рэпартэрам праблемы. Пункты кантракту зьменлівыя…

Зь нядаўняга часу студыя займела сваю старонку ў Інтэрнэце (www.tvr.grodno.by). Большая частка разьдзелаў гэтага густоўна афармленага расейскамоўнага сайту пакуль «знаходзіцца ў стадыі распрацоўкі». Пра гісторыю ўстановы зьвесткі падаюцца больш чым скупа, пачынаюцца з 1999 г. Між тым першая тэлеперадача ў Горадні выйшла ў этэр пры канцы сьнежня 1968 г. Сёлета той падзеі спаўняецца 35 гадоў. Добрая нагода сустрэцца журналістам розных пакаленьняў з рэпартэрамі новай хвалі. Пагаварыць ёсьць аб чым. Не памэнтарску, а зацікаўлена, для ўсіхнай карысьці.

Антон Лабовіч, Горадня

Сухата на Ўсходнім Палесьсі

IREX-PROMEDIA

У цэнтральным і ўсходнім Палесьсі — моцная засуха. Пасьля 16 траўня на тэрыторыі ад Століна да Добрушу выпала ўсяго некалькі мілімэтраў ападкаў. Дзе-нідзе прайшлі дваты невялічкія дожджыкі, але яны толькі пыл прыбілі.

Сытуацыя ўскладняецца невялікай колькасьцю ападкаў у першай палове траўня, які выпалі ў нашых мясьцінах, хоць па ўсёй краіне былі ліўні.

На глебе месцамі ўтварыліся трэшчыны, праз якія выпараецца апошняя вільгаць. Асабліва пацярпелі ячмень, авёс і жыта. У Лельчыцкім, Ельскім і Брагінскім раёнах значную плошчу гэтых культур ужо пакасілі на кармы для быдла. Што будуць рабіць далей, пакуль ня вырашылі. Прыехала камісія з адпаведнага міністэрства, каб падлічыць страты ды сьпісаць пэўны працэнт пазыкі ў сувязі зь цяжкім становішчам.

Пры канцы траўня тэмпэратура месцамі даходзіла да +33 °С, а ў ноч на 4-га чэрвеня на глебе было ад 0 да –2 °С. Пацярпелі прыватныя гаспадаркі, бо паліваюць амаль кожны дзень, а вось як уберагчыся ад маразоў?

Хаця Белгідрамет і абяцае кароткачасовыя дажджы, сытуацыю яны могуць палепшыць толькі часткова.

Юры Фралоў, Гомель

Былі мовы і няма

Кожны дзень зьнікаюць 182 віды птушак. Пад пагрозай 180 відаў сысуноў. Але разам зь імі ў «Чырвоную кнігу» варта запісаць і 438 чалавечых моў.

Эколягі б'юць трывогу: усё больш і больш відаў расьлін і жывёл апынаюцца пад пагрозай зьнікненьня. Тым часам значна больш за «зялёных» павінны непакоіцца мовазнаўцы. Мовы зьнікаюць з нашай плянэты куды хутчэй, чым жывёлы, лічыць Уільям Сазэрленд, біёляг-эвалюцыяніст з Усходнеанглійскага ўнівэрсытэту ў Норвічы (Вялікая Брытанія). З дасьледаваньняў навукоўца вынікае, што для моваў характэрныя тыя самыя заканамернасьці, што і для папуляцыяў жывёл.

Пагутарыць на ідага

Лінгвісты падлічылі, што сёньня ў сьвеце існуе 6809 моў. Аднак пад 90% зь іх маюць менш за 100 тысячаў носьбітаў. «У трохсот пяцідзесяці сямі моваў — менш чым па пяцьдзясят носьбітаў! — выгукае Сазэрленд. — І яны зьнікаюць найхутчэй».

Якой наканавана быць першай у гэтым сьпісе? Можа, ужыванай некалі на Алясцы мове эяк? Бо адзіны чалавек, які сёньня ёю гаворыць, — 57-гадовая Марыя Сьміт-Джоўнз — можа размаўляць хіба сама з сабой. А можа, індзейская мова айдаха? Толькі пяць чалавек у сьвеце здольныя перакінуцца парай словаў на ёй.

У справаздачы міжнароднай арганізацыі «Worldwatch», апублікаванай два гады таму, мовазнаўцы прагназуюць, што да канца гэтага стагодзьдзя зьнікне палова з наяўных цяпер моў. І гэты прагноз яшчэ самы аптымістычны. Першыя месцы ў чарзе на зьнікненьне сярод эўрапейскіх моваў займаюць ірляндзкая, валійская, карнійская, брэтонская, правансальская, гасконская, каталёнская, верхня- і ніжнялужыцкая ды фрызыйская. «У выніку войнаў, генацыду, асыміляцыі нацыянальных меншасьцяў зь лінгвістычнай карты сьвету беззваротна зьнікла безьліч моваў. А цудадзейныя ўваскрэсеньні зь мёртвых здараюцца надзвычай рэдка», — кажа аўтар справаздачы «Worldwatch» амэрыканскі мовазнавец Пэал Сэмпэт.

Мовы зьнікаюць хутчэй за птушак

Некаторыя навукоўцы бачаць у выміраньні моваў праяву больш глябальнага працэсу. Антраполяг Дэніэл Нэтл і мовазнаўца Сьюзан Рамэйн у сваёй кнізе «Галасы, што зьнікаюць: сьмерць моваў сьвету» цьвердзяць, што лінгвістычная дэградацыя — частка біялягічнага спусташэньня, якое адбываецца пад уплывам дзейнасьці чалавека.

Дасьледаваньні Ўільяма Сазэрленда гэта пацьвярджаюць. Параўноўваючы мовы паводле парамэтраў, якія прынята выкарыстоўваць для вызначэньня небясьпекі зьнікненьня птушак і сысуноў, навуковец выявіў, што і ў дачыненьні да моваў можна гаварыць пра падобныя фактары.

«На колькасьць відаў птушак і сысуноў галоўным чынам уплывае навакольнае асяродзьдзе: клімат, лясістасьць, вышыня над узроўнем мора», — удакладняе Сазэрленд. Там, дзе сустракаецца шмат відаў жывёл, — на тэрыторыях з багатай расьліннасьцю, што ляжаць у трапічным клімаце, — жыве і больш людзей, якія гавораць на розных мовах. Сазэрленд зьвяртае таксама ўвагу, што за апошнія паўтысячагодзьдзя на Зямлі зьнікла 306 моваў (4,5% ад агульнай колькасьці). Для параўнаньня: за той самы час загінула 125 відаў птушак (1,3%) і 87 відаў сысуноў (1,9%). «Мовы вымяраюць хутчэй, чым жывёлы!» — перасьцерагае Сазэрленд. Паводле ягоных падлікаў, сёньня пад пагрозай знаходзіцца 7,1% усіх моў, у той час як для сысуноў гэты паказьнік роўны 4,1%, а для птушак — 1,9%.

Эфэкт Элі

У зьнікненьні моваў істотную ролю адыграў працэс калянізацыі. «Тут як у прыродзе: мацнейшыя выцясьняюць слабейшых», — камэнтуе навуковец. У пацьвярджэньне сваіх словаў ён гаворыць пра 176 моваў, якія ўжываліся ў Паўночнай Амэрыцы яшчэ ў 1600 г. На сёньня зьніклі 52 зь іх. З 235 моў, ужываных аўстралійскімі абарыгенамі, не існуе ўжо трыццаці адной.

Калянізацыя, аднак, не адзіная прычына. Апісваючы мовы, якім пагражае небясьпека, Сазэрленд зьвяртаецца да экалягічных аналёгій: «У моўных супольнасьцях, якія налічваюць няшмат носьбітаў, узьнікае зьява, падобная да апісанага ў прыродзе эфэкту Элі, — кажа Сазэрленд. — Зьмяншаецца колькасьць прадстаўнікоў тых відаў, якія знаходзяцца пад пагрозай. Проста зь цягам часу ім робіцца ўсё цяжэй знаходзіць партнэраў для прадаўжэньня роду».

З мовамі амаль гэтаксама: чым менш носьбітаў, тым менш знаходзіцца ахвотнікаў тыя мовы вучыць, што, у сваю чаргу, яшчэ больш звужае кола носьбітаў — і гэтак далей. Так, навошта штудыяваць леца — мову індзейцаў, што жывуць у балівійскіх Андах, калі імавернасьць сустрэць суразмоўніка, для якога гэтая мова родная, імкнецца да нуля? На леца сёньня размаўляюць пад 20 чалавек. Падобнае становішча і ў камбап — мовы з Камэруну, што ў Цэнтральнай Афрыцы, якая мае сёньня ўсяго 30 карэнных носьбітаў.

Моўныя магілы

А тым часам навукоўцы з трывогай кажуць, што страта некаторых моў можа значна зьбядніць нашу культуру. Бо хто, апроч тых навукоўцаў, будзе памятаць, што, напрыклад, у мове убых, якая практычна зьнікла пры канцы XIX ст., было больш галосных, чым у любой з сучасных моў? Альбо хто здолее вымавіць гукі афрыканскіх «чмякальных» моў, калі памруць апошнія людзі, якія імі карыстаюцца? Хто будзе памятаць пра ўсе тыя разнавіднасьці рыбаў, што зьніклі разам з апошнімі людзьмі народу паляўян, які і даў ім назвы?

Калі ў 1992 г. група лінгвістаў прыехала ў Турцыю, каб запісаць і зьберагчы ад забыцьця мову убых, дасьледчыкі засьпелі сьвежую магілу, а на ёй надпіс: «Тут ляжыць Тэўфік Эсэнц. Ён быў апошнім чалавекам, які размаўляў на мове убых». Сёньня ў сьвеце ёсьць 46 моваў, якімі валодаюць адзінкі.

СП; «Worldwatch», «Gazeta Wyborcza»

Мовы Беларусі

	Колькасьць асобаў нацыянальнасьці	Колькасьць асобаў, якія размаўляюць дома на мове сваёй нацыянальнасьці
Усё насельніцтва	10.045.237	4.512.722
Беларусы	8.159.073	3.373.276
Расейцы	1.141.731	1.092.685
Палякі	395.712	18.720
Украінцы	237.014	14.562
Жыды	27.810	109
Армяне	10.191	2090
Татары	10.146	77
Цыганы	9927	6576
Літоўцы	6387	978
Азэрбайджанцы	6362	1485
Немцы	4805	22
Малдаване	4267	134
Грузіны	3031	351
Чувашы	2242	14
Латышы	2239	32
Мардва	1677	8
Узбэкі	1571	40
Казахі	1239	17
Башкіры	1091	7
Іншыя нацыянальнасьці	14.876	1443

Зьвесткі паводле статыстычнага зборніку «Вынікі перапісу насельніцтва Рэспублікі Беларусі 1999 г.»

Сярод цікавостак перапісу варта адзначыць, што па-беларуску дома размаўляюць 98 казахаў, 100 мардоўцаў, 117 узбэкаў, 146 башкіраў, 159 грузінаў, 328 немцаў, 466 армянаў, 571 цыган, 1064 жыды, 48.548 расейцаў, 227.846 палякаў. Украінскай як «хатняй» карыстаюцца (апроч саміх украінцаў) 1 чуваш, 2 башкіры, 2 азэрбайджанцы, 3 літоўцы, 5 грузінаў, 6 немцаў, 12 жыдоў. Польская сталася «побытавай» ня толькі для палякаў, але і для 1 азэрбайджанца, 2 немцаў, 6 армянаў.

Смачное мышам беларускае слова

Колькі словаў у беларускай мове? На такое пытаньне адразу і не адкажаш. Ёсьць словы, якімі карыстаешся штодня, — такіх тысячы. Ёсьць словы, якімі карыстаюцца рэдка, — такіх дзясяткі тысячаў. А ёсьць жа яшчэ сьціжмы нэалягізмаў, аказіяналізмаў, дыялектызмаў... Агульны лік зь імі ідзе на мільёны.

Усё гэтае багацьце зьбіраюць і апрацоўваюць у Інстытуце мовазнаўства Акадэміі навук.

Дзесяцігодзьдзямі працавалі ўручную: на картку запісвалі слова, ягонае значэньне, выпадак ужываньня. Гэткай тытанічнай працай складаліся 5-тамовы «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы», «Гістарычны слоўнік беларускай мовы» ды інш. Паводле словаў вядучага навуковага супрацоўніка аддзелу лексыкалёгіі й лексыкаграфіі Мікалая Крыўка, толькі слоўнікавы запас ТСБМ склалі тры мільёны картак, якія захоўваюцца ў 22 шафах (у сярэднім больш за 130 тыс. картак у кожнай).

«Разабраная на словы» і падшыўка «Нашай Нівы» за 1906—15 гады. Поўны збор картак з усімі словамі (варыянтамі й апісаньнямі), якія ўжываліся ў газэце, заняў цэлую шафу. Загадчыца аддзелу лексыкалёгіі й лексыкаграфіі Валянціна Лемцюгова засьведчыла, што апрацоўвалі гэтае мора матэрыялу толькі шэсьць чалавек.

Шэсьць гадоў таму Інстытут мовазнаўства пераехаў на новае месца жыхарства, і плошчы пад усе карткавыя зборы бракавала. Таму цяпер у самім Інстытуце захоўваюцца толькі працоўныя матэрыялы. Вялізны масіў «адпрацаваных» картак — задакумэнтаваны скарб беларускай мовы — складзены ў будынку на тэрыторыі Батанічнага саду. Адзіны пакой на чацьвертым паверсе, выдзелены пад архіў Інстытуту мовазнаўства, спрэс застаўлены шафамі з карткамі. Там захоўваюцца матэрыялы, выкарыстаныя пры падрыхтоўцы ТСБМ, «Гістарычнага слоўніка», дыялекталягічнага і лексычнага атлясаў, «Слоўніка мовы твораў Якуба Коласа».

Вокны глядзяць на поўнач, таму ў архіў ніколі не зазірае сонца. Затое часта наведваюцца мышы. М.Крыўко паказаў шуфляды, пашкоджаныя грызунамі: «Лезуць яны з сутарэньняў: там захоўваецца насенны фонд Батанічнага саду. У суседніх пакоях мышэй няма, а сюды яны ідуць, бо тут ім ёсьць корм — папера. Грызуць шуфляды, спрабавалі грызьці карткі. Сыпалі ім атруту — ня дужа дапамагае. Вось цяпер будынак рамантуюць, дык папрашу ў рабочых цэмэнту, замажу шчыліны ў падлозе». На першым паверсе, паводле словаў М.Крыўка, бачылі й пацукоў.

Як ратаваць моўныя багацьці, сабраныя за дзесяцігодзьдзі? Ясная рэч, тыя словы, што ўжо ўвайшлі ў слоўнікі ды манаграфіі, канчат-

ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Ангельская — гэта мова, якая часьцей за ўсё ўжываецца ў якасьці другой мовы. Лічыцца, што апроч карэнных носьбітаў (якіх 322 мільёны) ёю карыстаюцца яшчэ 350 млн.

Кітайская — мова з найбольшай колькасьцю носьбітаў. Па-кітайску ў сьвеце гавораць 1125 млн. Спакойна могуць спаць таксама карыстальнікі гішпанскай — іх аж 332 млн, арабскай — 220 млн, а таксама хіндзі, бэнгальскай, партугальскай, расейскай, японскай, францускай і нямецкай.

110 моваў захавалася на маленькім архіпэлягу Вануату ў Ціхім акіяне амаль бязь зьменаў, якія звычайна прыносіць цывілізацыя. Палінэзія ды Мікранэзія — рай для моўных «жывых акамянеласьцяў»: там захоўваюцца надзвычай старажытныя формы.

Палова наяўных моў сьвету ўжываецца ўсяго ў васьмі краінах — Папуа Новай Гвінэі (832 мовы), Інданэзіі (731), Нігерыі (515), Індыі (400), Мэксыцы (300), Камэруне (300), Аўстраліі (300) і Бразыліі (234).

Карнійская — мова, ужываная кельтамі, — свайго апошняга носьбіта страціла ў 1777 г. А праз сто гадоў яна «ўваскрэсла зь мёртвых», каб дажыць да сёньня з амаль дзьвюма тысячамі карыстальнікаў. Падобную гісторыю мае габрэйская мова — іўрыт. Яшчэ сто гадоў таму на ёй ніхто не размаўляў, існавала толькі пісьмовая форма, якая «ажывала» выключна ў набажэнствах. З узьнікненьнем у 1948 г. Ізраілю іўрыт зрабіўся там дзяржаўнай мовай — і сёньня ім гавораць звыш пяці мільёнаў габрэяў.



Мікалай Крыўко фактычна стаўся галоўным захавальнікам скарбаў беларускай мовы.

кова ня згубяцца. Але ці лепей захоўваюцца яшчэ нявыкарыстаныя запасы?

Навуковы сакратар Інстытуту Валянціна Русак кажа, што цяпер архівы кампутарызуюцца: «Вядома, мы ня можам сёньня перавесьці ў кампутарны выгляд усе зробленыя карткі, але новыя напрацоўкі мы ўводзім у кампутары». У кампутарным выглядзе захоўваецца фанэтычны фонд сучаснай беларускай мовы. Узоры беларускага літаратурнага й дыялектнага вымаўленьня, апрацаваныя лічбавым спосабам, зьберагаюцца на электронных носьбітах. «Усе заходнія краіны маюць такія базы, і ў Расеі ёсьць некалькі», — зазначае В.Русак. Апроч таго, бліжэйшым часам маюць выйсьці перакладныя беларуска-польскі, беларуска-чэскі, беларуска-баўгарскі слоўнікі, «Слоўнік мовы «Нашай Нівы» і г.д. Матэрыялы для іх зьбіраліся пераважна на картках, але цяпер ужо ёсьць і на электронных носьбітах.

Усе кампутарныя напрацоўкі мовазнаўцаў захоўваюцца толькі ў будынку Інстытуту. Месца на захаваньне дыскетаў і кампактаў хапае, дый мышы іх не ядуць. Аднак невядома, калі ўдасца цалкам перавесьці на кампутары ўсе сабраныя карткі. «Калі б мы мелі грошы пасадзіць за апрацоўку картак пяць-шэсьць чалавек, тады была б карысьць. Праз 20 гадоў мы закончылі б перавод на кампутарны варыянт. Гэта праца не для аднаго чалавека», — канстатуе В.Русак.

Адам Воршыч

«Спадчына» today

Працяг са старонкі 1.

У нумары няма ніводнага артыкулу на «тарашкевіцы», хоць выданьне па-ранейшаму дэкляруе павагу да ўсіх формаў правапісу. Сябар рэдкалегіі Валянцін Голубеў абяцае ў далейшым «цэлыя нумары на тарашкевіцы, бо ёсьць аўтары, для якіх гэта прынцыпова».

«Канструктарскай асновай» для новай канцэпцыі «Спадчыны» стаўся ангельскі часопіс «History today».

У новай канцэпцыі «Спадчына» атрымала і новы статус. Цяпер яна сталася навуковым выданьнем, прызнаным Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй (ВАК).

АВ

ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

«Чаму навуковае мусіць падавацца нецікава? Наш часопіс пры ўсёй ягонай большай скіраванасьці на папулярызацыю ўсё адно патрабуе ад чытача пэўных ведаў, пэўнай падрыхтаванасьці», — гаворыць Алесь Белы (справа). У працы над часопісам актыўны ўдзел браў новы намесьнік галоўнага рэдактара Валянцін Голубеў.

Зьмест нумару:

«Дай мне булку на паўзлоты, ды прыпраў мне селядца...» Сьціплая рыбка таксама можа быць сымбалем беларускай культуры, сьцьвярджае Алесь Белы ў кароткім нарысе гісторыі селядцоў у Беларусі. **«Граф зь піўной этыкеткі, або Пераўтваральнік Менску»**. Захар Шыбека аналізуе дзейнасьць Караля Чапскага. **«Прыбытак ці ўратаваньне душы»**. Ігар Марзалюк — пра крэдыт і ліхварства ў Беларусі XVI—XVII ст. **«Панамі будзеце, панамі!..»** Андранік Антанян узнаўляе маршрут Дзядзькі Антося па Вільні. **«Беларусь на вузкай каляіне».** Андрэй Кіштымаў вяртае зь нябыту імя будаўніка чыгункі Сьвянцяны—Беразьвеч. **«Над дахамі Віцебску»**. Захар Шыбека спрабуе ўбачыць віцебскія цэхі вачыма Марка Шагала. Ірына Кітурка піша пра супярэчнасьць рэформаў Тызэнгаўза, Юрась Бохан — пра арганізацыю найманых аддзелаў у ВКЛ, Ігар Цішкін пра месцазнаходжаньне Віцебскай царквы Сьв.Мікалая «ў рынку» ды інш. Тэл. рэдакцыі (017) 266-07-97.

Ліцэй ідзе на вуліцу

Пятро Брыгадзін у прыватнай размове сказаў, што Ўладзімер Колас дырэктарам ня будзе ні пры якіх умовах. Але кандыдатуру Шчарбачэвіч перагледзець можна.

Абарона Ліцэю перайшла ў наступную фазу: супрацоўніцтва зь Міністэрствам адукацыі цяпер выглядае немагчымым. Такое ўражаньне засталося пасьля сустрэчы ў Ліцэі зь міністрам П.Брыгадзіным 13 чэрвеня. Яна нагадвала размову сьляпога з глухім. Міністар зазначыў, што прызначэньне Тамары Шчарбачэвіч «было зробленае абдумана». На довады, што У.Колас выдатна кіруе і няма патрэбы яго зьмяняць, міністар адказваў адно: «Мы трымаемся палітыкі ратацыі кадраў». Адказу на пытаньне «Чаму ж пры такіх добрых пэдагагічных якасьцях Вы паніжаеце Коласа з дэ-факта дырэктара да намесьніка?» прысутныя так і не пачулі. «Мы чакалі міністра, а да нас прыехаў клерк, ад якога нічога не залежыць», — кажа Вінцук Вячорка, сын якога Франак вучыцца ў ліцэі.

У тую пятніцу 13-га ў Ліцэі чакалі і намесьніка кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Алега Праляскоўскага. Не дачакалі. Таму вырашылі зьвярнуцца ў Адміністрацыю асабіста: 17 чэрвеня туды занесьлі зварот ліцэісты, 18-га — іхныя бацькі. Хоць вялікага спадзеву на звароты яны ня маюць. У.Колас паведаміў, што Мінадукацыі рыхтуе ліквідацыю «бунтоўнай» установы. Гэта нібы пацьвярджае чутка, што гарадзкія ўлады зьбіраюцца рабіць з школы №22 гімназію імя Якуба Коласа.

Ідэя ператварэньня Ліцэю ў недзяржаўную навучальную ўстанову набывае ўсё большы падмацунак. «Няма ніякага жаданьня супрацоўнічаць з гэтым Міністэрствам адукацыі», — канстатуе У.Колас. «Мы зрабілі што маглі. Цяпер можа вырашыць справу толькі голас шырокай грамадзкасьці», — зазначыў Лявон Баршчэўскі. Да яе бацькі й ліцэісты маюць намер зьвярнуцца праз вулічныя акцыі. Гарадзкія ж улады традыцыйна дазволілі ім пікетаваць Бангалёр заміж пляцоўкі перад Міністэрствам адукацыі ды Міхайлаўскага сквэру ў цэнтры гораду. Куды пойдуць даведзеныя да роспачы абаронцы Ліцэю, на той час, калі пішацца гэты артыкул, яшчэ невядома. Ясна адно — пакуль газэта будзе друкавацца, яны ўжо выйдуць на вуліцы.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Лявон Баршчэўскі, Уладзімер Колас і Ірына Сідарэнка шукаюць спосабаў зрабіць Ліцэй недзяржаўным

Аркадзь Шанскі

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Бохан Ю. Узбраеньне войска Вялікага Княства Літоўскага другой паловы XIV — канца XVI ст. / Ін-т гісторыі НАН; Магілёўскае таварыства інтэлектуальн. і культурн. ініцыятываў «Брама». — Менск: УП «Экапэрспэктыва», 2002. — 336 с.: іл. 300 ас.

Прылбіцы й шаломы, кісьцяні й перначы, кляўцы й чаканы... Аналіз і тактыка-тэхнічныя характарыстыкі баявой зброі ды рыштунку ваяроў. Не застаўся па-за ўвагай і «конскі дасьпех». Цана выданьня ў «Акадэмкнізе» — каля 6000 руб.

Выхаваньне, сьвядомасьць, хрысьціянскія ўплывы / Пад рэд. П.Фенрыха, У.Хільмановіча. — Шчэцін, 2002. — 50 с.

Грамадзянская адукацыя ў Польшчы і Беларусі / Пад рэд. П.Фенрыха, У.Хільмановіча. — Шчэцін, 2002. — 50 с.

Зь беларускага боку свае артыкулы прадставілі Л.Карповіч («Настаўнік у беларускай сыстэме адліку») ды Ю.Пацюпа («Выхаваньне патрыятызму на занятках літаратуры»).

Дамовы па-беларуску: Дапаможнік для няўрадавых арганізацыяў / АНДА. — Смаленск, 2003. — 98 с.

Збор беларускамоўных узораў на афармленьне дамоваў, зь якімі найчасьцей сутыкаюцца ў сваёй практыцы грамадзкія аб'яднаньні. Матэрыялы выданьня могуць быць скарыстаныя таксама камэрцыйнымі юрыдычнымі й фізычнымі асобамі. Каб бясплатна атрымаць дапаможнік, зьвяртайцеся па т.: 206-59-09, 225-51-10.

Лідэрства і моладзевыя арганізацыі / Пад рэд. П.Фенрыха, У.Хільмановіча. — Шчэцін, 2002. — 50 с.

Беларускія ды польскія аўтары разважаюць над фэномэнам лідэрства. У прыватнасьці, А.Пачобут разглядае моладзевы рух у Беларусі: «Малады фронт», «Зубр», «Чырвоны жонд», БПС, «Край», БПСМ.

Трацяк Я. Біблія ў кантэксьце беларускай культуры. — Горадня, 2003

Кніжка разьлічаная на вучняў і студэнтаў, выйшла ў друкарні Гарадзенскага ўнівэрсытэту. Яна сталася друкаваным дадаткам да спэцкурсу, які Янка Трацяк чытае на тамтэйшым філфаку. Аглядаюцца ўсе пераклады Бібліі на беларускую мову.

Падрыхтавалі Т.Вабішчэвіч, АМ

Добры мэдычны слоўнік

Воронец В.И. Русско-белорусский медицинский словарь. — Горадня: ГДМУ, 2003. — 98 с. 500 ас.

У выданьне ўвайшло больш за 4000 лексычных адзінак — як уласна тэрміны, так і пашыраныя ў мэдычнай сфэры агульнаўжывальныя словы. Аўтар імкнуўся пазьбегнуць асноўнай хібы папярэдніх слоўнікаў — бяздумнага калькаваньня паняткаў з лаціны, грэцкай і расейскай моваў. Спробы адшукваць тэрмінам уласнабеларускія эквіваленты далі добры плён. Прыдбаць кнігу можна ў Горадні, у шапіку мэдычнай кнігі ГДМУ.

Чарнуха ў тэатры

У Опэры зноў ёсьць галоўны дырыжор. Ім стаў 40-гадовы Вячаслаў Чарнуха. Упершыню ў гісторыі на гэтай пасадзе апынуўся беларус, ды яшчэ й зь вёскі родам (Сьвятая Воля Івацэвіцкага раёну, слаўная старажытнымі могілкамі). Дырыжорскую адукацыю Чарнуха атрымаў у Беларусі.

Прафэсіяй ён авалодваў пад кіраўніцтвам Генадзя Праваторава, Аляксандра Анісімава і Аляксандра Сасноўскага. З 1994 г. В.Чарнуха пачаў працаваць у Опэры. Сьпярша атрымаў у поўнае распараджэньне «Травіяту», неўзабаве — «Яўгена Анегіна».

Бывалі ў кар'еры маладога дырыжора і кур'ёзныя моманты. 20 лістапада 1995 г. у Філярмоніі граў піяніст Леанід Кузьмін (надзвычайна модны). Дырыгаваў Чарнуха — колішні яго аднакляснік. Заля была паўнюткая. Гралі Пяты канцэрт для фартэпіяна з аркестрам Бэтговэна. Калі гастралёр «зьеў» паўзу, Чарнуха ня здолеў пакіраваць аркестрам, і надышоў хаос. Выкананьне спынілі — выпадак беспрэцэдэнтны. Потым абодва, гледзячы ў ноты, дыскутавалі, што здарылася, хто вінаваты і што рабіць далей. Па-анёльску цярплівая публіка моўчкі чакала, калі ж гэта скончыцца.

Пасьля залічэньня ў штат Опэры Чарнуха быў прызначаны памочнікам галоўнага дырыжора. Ён ажыцьцяўляў «выканаўчую ўладу», калі сп.Анісімаў гастраляваў за мяжой. Усе пастаноўкі, якія ў той час намінальна ажыцьцяўляў Анісімаў, фактычна рыхтаваў Чарнуха; маэстра толькі надаваў ім лоску. В.Чарнуха таксама шмат працаваў у Турцыі — паставіў тамака «Эрнані» Вэрдзі і «Сэвільскага цырульніка» Расіні.

Чарнуха добра глядзіцца за дырыжорскім пультам: высокі, мажны, але адначасова зграбны, рукі — як быццам без касьцей, гнуткія і незвычайна сьпеўныя. Спачатку каньком яго былі дробязі кшталту вальсаў Штраўса, дзе яму ставала і лёгкасьці, і жвавасьці, і прыроднага густу. З часам, дзякуючы інтэнсіўнай працы, даліся і рэчы больш сур'ёзныя, у якіх Чарнуха колісь саступаў свайму равесьніку Андрэю Галанаву. Тым ня менш, да сёньня Чарнуха часта дырыгаваў добра, але ніколі — геніяльна.

У конкурсе ўдзельнічалі сем прэтэндэнтаў — пяць менчукоў і два масквічы. В.Чарнуха атрымаў 75% галасоў конкурснай камісіі. Зь ім падпісалі кантракт на год. Час пакажа, ці здолее галоўны дырыжор адстойваць свае мастацкія прынцыпы ў творчым саюзе з уплывовай кіраўнічкай Опэры спн.Ізворскай. Ад гэтага залежыць лёс ня толькі сп.Чарнухі, але й ягонага тэатру.

Юлія Андрэева

АЛЯКСАНДАР ДЗЬМІТРЫЕЎ

Опэра шукае тэнара

Самыя цікавыя падзеі ў Опэры адбываюцца тады, калі асноўная частка трупы зьяжджае на гастролі. Вось і сёлета: ледзьве тэатар выправіўся ў Нямеччыну, як 12 чэрвеня ў будынку на Траецкай гары адбыўся канцэрт «Маладыя галасы Беларускай опэры».

Маладосьць у мастацтве — гэта стан, калі актор ці сьпявак яшчэ чакае на свае галоўныя ролі. У гэткім сэнсе маладымі апынуліся далёка ня ўсе ўдзельнікі канцэрту.

37-гадовая Вікторыя Курбацкая дэбютавала ў 1991 г. Сёньня яна сьпявае амаль усе сапранавыя партыі першага пляну. Падчас канцэрту Курбацкая засьпявала змрочную арыю Леаноры з «Трубадуру» Вэрдзі і грацыёзны моцартаўскі дуэт Цэрліны і Дон Жуана. У арыі яна знарок рабіла голас цяжэйшым, дзеля большага драматызму. Затое Моцарта сьпявала ў чвэрць сілы, каб прыстасавацца да сьціплых магчымасьцяў свайго партнэра — барытона Ўладзімера Громава. Можна спадзявацца, што з часам і ён здолее запоўніць сваім голасам прастору опэрнае залі. І тады яго музычнасьць, артыстызм, пранікнёнасьць сьпеву будуць належным чынам ацэненыя.

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК
Вікторыя Курбацкая

37-гадовая **Алена Бундзелева** засьпявала ў сцэне з «Паяцаў» з барытонам Аляксандрам Краснадубскім. Побач зь ім спн.Бундзелевай не было чуваць. Голас Краснадубскага — моцны, выразны і цёплы — цаляў проста ў сэрцы. Шкада, што гэтага сьпевака недастаткова выкарыстоўваюць у опэрах Вэрдзі і Пучыні.

Мэцца-сапрана **Эльвіра Рыжановіч** сьпявала арыю Кармэн, што прагучала ў яе выкананьні ня дужа пераканаўча. Тая роля больш пасавала б маладзенькай **Вользе Кажгаліевай**, у якой надзвычайны голас — сакавіты, тэмбрысты, палётны, амаль безь вібрата. У Опэры багата таленавітых мэцца-сапрана. Апрача Кажгаліевай, у канцэрце ўдзельнічалі **Алена Сало** і **Аксана Якушэвіч**. Сало, да нядаўняга часу больш вядомая як выканаўца народных песень і духоўнай музыкі, разам з Краснадубскім засьпявала дуэт Разіны й Фігара. Прыгожа, хоць і крыху «застаранна», акадэмічна. Аксану Якушэвіч мы зусім нядаўна бачылі ў ролі Марфы на прэм'еры «Хаваншчыны». На «Маладых галасох» яна засьпявала песьню Азучэны з «Трубадура». Мусаргскага Аксана выконвала як студэнтка, Вэрдзі — як майстар. Для яе палкага тэмпэрамэнту музыка Вэрдзі — родная стыхія. Мусаргскі — чужая.

Голас **Тацяны Гаўрылавай**, прыгожа афарбаваны, звонкі, з надзвычай пекнымі верхнімі нотамі, яе вытанчанае майстэрства сьпеву, інтэлігентнасьць і тонкасьць інтэрпрэтацыі вельмі прыдаліся ў арыі Разіны з «Сэвільскага цырульніка». Зрабіла ўражаньне й прыгожае лірычнае сапрана **Настасьсі Масквіной**. Але ёй не заўжды стае прафэсіяналізму.

Абодва басы, што ўдзельнічалі ў канцэрце, таксама выбралі для выканаьня расейскую музыку: больш дасьведчаны **Зьміцер Капілаў** засьпяваў арыю Мельніка з опэры Даргамыжскага «Русалка», судэнт **Андрэй Кулінковіч** — арыю Алека з аднайменнай опэры Рахманінава, скарыстаўшы цудоўную нагоду паказаць усю прыгажосьць свайго аксамітнага голасу.

У Опэры ёсьць шматабяцальныя галасы, найперш жаночыя, але няма маладога тэнара, гатовага ўзяць на свае плечы ўвесь цяжар бягучага рэпэртуару. Прычыны варта шукаць у Акадэміі музыкі. Бо гэта адзіная навучальная ўстанова, якая рыхтуе сьпевакоў для галоўнага тэатру краіны.

ЮА

ДЫСКАГРАФІЯ

Спадчына нежывых вёсак

Іван Кірчук, West Records, 2003

Альбом быў запісаны ў Галяндыі. Кірчук вандраваў па Эўропе з сваім тэатрам «Батлейка», атрымаў прапанову ад нідэрляндзкай студыі і за чатыры дні адзін запісаў 31 песьню. Кірчук варожыць, ваюе, косіць, б'е ў бубны і званы, водзіць карагоды, спраўляе каляды, хрысьціць, сватае і хавае. «Спадчына...» розьніцца ад альбомаў «Тройцы»: тут няма экспэрымэнтаў з гукам і інструмэнтамі, усе песьні пададзеныя ў арыгінальным выглядзе, выкарыстоўваюцца толькі традыцыйныя беларускія інструмэнты (ліра, акарына, дуда і інш.). Песьні ў асноўным малавядомыя, хоць ёсьць і «гіты» — «Зялёны дубочак», «Ішла Каляда», «Купала на Йвана».

Чырвоны кальсоны

Ляпіс-Трубяцкой, West Records, 2003

Сынгл прэзэнтуе дзьве новыя песьні «ляпісаў». Першая — усходнеэўрапейскае рэгі «Ласточки». Другая — «Курвы» — вядомая шчэ з канцэртнага альбому 1996 г. «Сьмяротнае вясельле». Цытата з «Курваў» сталася назвай сынглу. Музыкі патлумачылі, што зьбіраюцца выходзіць на музычны рынак Сярэдняй Эўропы, таму ўлічылі асаблівасьці мэнталітэту слухачоў. «Чырвоны кальсоны», паводле «ляпісаў», — «сымбаль перамогі, радасьці і шмінкі». Паўнацэнны альбом «Трубяцкога» выйдзе ўвосень. А пры канцы чэрвеня пабачыць сьвет другі дыск «Крамбамбулі» — «Каралі раёну». Міхалок засьпяваў там колькі беларускамоўных кампазыцыяў.

Диагноз

Аляксей Шадзько і гурт «Сястра», «Сестра», 2003

Шадзько застаўся ў рамках лірычнага тэкставага року: павольныя мэлёдыі, што трымаюцца на майстэрстве гітарыста Сяргея Анцішына ды саксафаніста Ігара Лютага; простыя рыфмы кшталту «блюз-шлюз». Галоўная функцыя такой музыкі — стварэньне ўтульнай атмасфэры. У альбоме кожны можа знайсьці свой гіт: хтосьці ўпадабае энэргічную «Расстреляйте меня», вядомую з канцэртаў «Сястры», хтосьці — ціхія ды разважлівыя кампазыцыі кшталту «За горизонтом».

Сяргей Будкін

Конкурс каралевы Элізабэты

У Брусэлі адбыўся чарговы музычны конкурс імя каралевы Элізабэты — самае аўтарытэтнае піяністычнае спаборніцтва ў сьвеце. Сёлета ў ім упершыню змагаліся і беларусы. Паводле яго ўмоваў, піяністы-фіналісты мусяць граць 15-хвілінную п'есу для фартэпіяна з аркестрам, якая за некалькі дзён да таго здабыла найвышэйшую ўзнагароду на кампазытарскім спаборніцтве. Фіналісты вучаць яе самастойна. З гэтай мэтай іх пасьля паўфіналу замыкаюць на тыдзень у асобных пакоях з раялямі. Сёлета абавязковая п'еса звалася «Dreams» («Мары»). Яе склаў аўстралійскі піяніст і кампазытар Іан Манро.

Ніводны з нашых піяністаў у фінал ня трапіў, хоць у першым туры ўдзельнічалі аж пяцёра: Канстанцін Красьніцкі, Віталь Стахіевіч, а таксама Кацярына Папова і Расьціслаў Крымер, якія цяпер вучацца ў Нямеччыне, ды Ганна Шыбаева — студэнтка Амстэрдамскае кансэрваторыі.

Першую прэмію здабыў 24-гадовы немец Сэвэрын фон Экардштайн.

ЮА

З запазухі

Рыгор Барадулін

Працяг. Пачатак у «НН» № 19, 21.

Акушор

Шаснаццацігадовы хлопец прыняў у дарозе роды ў маладзіцы. І мусіў пакінуць калгас. На пытаньне, чаму пакінуў, казаў:

— Не хацеў кідаць, але ўсе мяне дражняць Жорам-акушорам. А як ня дражняць, сьмяюцца, калі я йду.

Так гэта ці ня так, а з калгасу ўцёк.

Толькі мічыць...

У ваднага вушацкага была дужа гультаяватая жонка. Пра яе казалі:

— Грудзі мужык дастаець, каб дзіцёнка пасасіла, а яна толькі мічыць…

А можа, яна прывучала мужа гадаваць сына.

Каб...

Дзьве вушацкія маладзіцы стаяць у чарзе па малако. Нешта не вязуць. Гавораць, успамінаюць, абмяркоўваюць сучасную моду. Адна ўздыхае:

— Каб мне тую парусінавую спадніцу, што пасьля вайны, і здароўе тое.

І неяк зусім нечакана ўсплываюць блокаўскія радкі:

Какая ложь, какая сила
Тебя, прошедшее, вернет!

На голай сцэне

Марыя Рыгораўна самотна сядзіць ды сама сабе кажа:

— Ня знаю радзін сваіх, ня знаю мянін сваіх. Кавалераў сваіх ня бачу. Раней кавалеры былі, зубы ж былі. І каторыя кавалеры паўміралі. Маладзік ужо ў другую палавіну ў мароз не пайшоў, а стаў цяплець…

Сьціслы маналёг на голай сцэне жыцьця.

Усё паводле рытуалу

Песьня падахвочвае застольнікаў есьці:

Ядуць госьці, ядуць,
Як мяцёлачкай мятуць:
На стале ні крошачкі,
Пад сталом ні костачкі.

Хлеб мусяць крышыць на стале, костачкі кідаць пад стол — там ці каты, ці сабакі чакаюць сваю долю.

І я там...

Пан сустрэў парабчанку й пытае:
— Куды ты?
— У пуню.
— Чакай, Марыля, і я там буду.
Сугучча пал навеяла.

Здалося...

У лякарні ў вялікай палаце адпаведна й шмат хворых. Маладзейшых чамусьці болей. Болей за ўсіх крэкча дзед. А малады вазьмі дый пажадай яму:

— Дзед, каб ты жыў сто гадоў і памёр на цёплай печы!

Ды пажаданьне гэтае так ушкурыла дзеда, што да паўночы сварыўся з маладым веселуном.

Ці, можа, мала, здалося, гадоў было зычана, ці цёплага не любіў. Ніхто ня ведаў!

Лірыка

У даваеннай Вушачы дробны саўслужбачок, пераходзячы зь яўрэйскае мовы на расейскую, пісаў сваёй Дульсынэі такія вершы:

Пишу тебе четыре строчки
И целую тебя
Во все четыре щечки.

Лірыка прабірае на любой мове.

Цьвёрдасьць характару

Перад закрыцьцём вінарні стомлены ад будаўніцтва сьветлага заўтра вушацкі малец выпрасіў у прадавіцы аж чатыры пляшкі чарніла. Чарнілам не пісалі, чарнілам звалася таннае віно, альбо чарвіўка, бо часьцяком ціснулі яго ў раённых саматужнях з чарвівых яблыкаў.

Чатыры пляшкі чамусьці ўзяў па дзьве пад кожную паху амаль пацыркавому.

Няўпэўнена выйшаў зь вінарні, і на цэмэнтовы пашчарбачаны ганак выпала адна пляшка. Тады было шчасьлівы пакупец разьбіў аб ганак тры астатнія й вярнуўся, каб купіць зноў чатыры пляшкі.

Каб паказаць цьвёрдасьць характару. Ці, можа, верыў у лічбу 4, якая сымбалізуе цалюткасьць і грунтоўнасьць.

Такі ня трэба...

Як пачалася так званая перабудова, партыйцы спачатку разгубіліся (потым ужо ажылі ў камэрцыі). Інструктар райкаму прыходзіць да старшыні калгасу прасіцца на працу. А перад гэтым на кожнай пасяўной не даваў жыць старшыні сваімі ўказаньнямі, як сеяць, дзе сеяць, што сеяць, калі сеяць…

Старшыня, каб адвесьці душу, пытаецца:

— Адукацыя?
— Вышэйшая партшкола.
— Дзе працаваў?
— Інструктарам у райкаме.

Вытрымаўшы паўзу, старшыня як адсёк:

— Мала таго, што ты без адукацыі, дык яшчэ нідзе й не працаваў. Такія мне ня трэба!

Смачнае запрашэньне

Запрашаюць гасьцей частавацца, як бы тлумачачы рэцэпт:

— Есьце, госьці, капусту. Капуста тлуста: сем п.зд варылася, восьмая ўвалілася, а дзявятая самаволь ходзіць, пана х.яя за хахол водзіць.

Наагул, капуста традыцыйная страва. І ў вясельнай песьні пяецца:

У хату сваты лезуць,
Аб вушак зады чэшуць,
Дзьверы падпіраюць,
У кацёл зазіраюць:
Ці тлуста капуста,
Ці вялік кацёл кашы,
Ці пад'ядуць сваты нашы.

А часам гаспадыня пытае:
Госьцікі мае дарагія,
Чым жа вас частаваць,
Чым жа вас вельмаваць?
Качан капусты на лясе,
Верабеечка — у страсе.
Капуста — добрая страўка,
Верабеечка — добрая запраўка.

Умелі гасьцей і запрасіць, і пачаставаць смачна.

Любілі й вясёлыя запросіны ды адказы.

— Чым жа вас частаваць, госьцейкі дарагія?
— Чым вароты падпіраюць.

— Тата, тата, ідзі есьці — мама ўжо грыбы адставіла.

Адставіць грыбы — значыць узлавацца, надзьмуцца. Ды яшчэ й іншы сэнс сам прасіўся.

Мера заможнасьці

Тарэнта багаты: тры катлы калатухі на загнеце кіпіць.

(Калатуха — закалочаная мукой вада.)

Яшчэ сьпявалі пра багатыра-модніка:

Пры галёшах, пры часах,
З калатухай на вусах.

І так зь бедняка самі беднякі кпілі: «Багатыр такі, язык ад шчаўлю паскіпаўся…»

І малому хацелася адчуць сябе багатыром, прасіў: «Ня рэж, мамачка, яечка, вары цэлае. Хай усе думаюць, што мы багатыя…»



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Як прайсьці?..

Вушацкія дужа любяць любое слова перавярнуць на брахлівы, як у нас кажуць, лад. І вёску далекаватую ад мястэчка называлі Срачынцы. Пры тым, стараючыся падкрэсьлена ўжыць расійскія словы, пыталіся:

— Зьвініці, як прайсьці ў дзярэўню Ж.пінцы?

Як першапачаткова называлася вёска, ці Страчанцы, ці Срачыцы (стараславянскае сръчыца — сарочка), ніхто ня помніў.

Афіцыйна Срачынцы сталі Судзілавічамі. Але яшчэ доўга карэнныя вушацкія Судзілавічы называлі Срачынцамі.

Надабень

Быў абразьлівы звычай. Калі дзеўка доўга не выходзіла замуж, пасьля Зьмітраўскіх Дзядоў яе садзілі ў сані й вазілі па вёсках, пытаючыся:

— Каму надабень трэба?

І прыслоўе ёсьць: да Зьмітры дзеўкі хітры, а пасьля Зьмітры хоць сраку вытры.

Ужо...

Сынок кліча бацьку:

— Тата, тата, ідзі есьці — мама ўжо грыбы адставіла.

Адставіць грыбы — значыць узлавацца, надзьмуцца. Ды яшчэ й іншы сэнс сам прасіўся.

Затое...

Дзед прадае пеўня. І просіць за яго ня так і мала. Падыходзіць маладзіца, прыцэньваецца. Хоча скінуць цану:

— Ён жа ў цябе худы.

Дзед не ўступае цану ды тлумачыць:

— Не глядзі, што худы, затое ё.кі…

Яно праўда...

У бабкі была адна курка й тая здохла. Прыйшла бабка да пана й бядуе. А потым сама сябе суцяшае:

— Але, паночку, яно праўда — дзе няма статку, там няма ўпадку…

Абразілася

Мама неяк запярэчыла сваёй сьвекрыві: «Ай, брэшаце вы, мама». Вострая на язык, дасьціпная весялуха Грышчыха доўга не магла супакоіцца: «Ці я табе сучка, што брашу?..»

Калі нявестка гаворыць, пра сэмантыку слова сьвякроў ня думае.

Упрэцца

Чалавек немаладога веку кожны год стагнаў, што памрэ. А ўсё жыў і жыў. Сусед яму неяк і кажа:

— Стары, стары, а як памрэць, вечка не накрыюць — падыміць вечка сваім матавілам. Упрэцца.

Націск

На Вушаччыне ў слове «курыца» націск падае на другі склад. І яўрэі, якіх да вайны было багата ў мястэчку, карысталіся беларускай мовай з усімі мясцовымі асаблівасьцямі. Таму яўрэйка й пыталася ў беларускай сялянкі ў рыфму, не зважаючы на граматыку:

— Маладзіца, маладзіца,
Што ты хочаш за курЫца?

Па часе

Як толькі ласкава не называюць залётак, нарачонак. І «ягадка ты мая», і «сунічка», і «равінка».

І сама сябе маладзенькая называе ў папеўцы:

Не глядзіце на мяне,
Што я невялічка.
Надзенуся, прыбяруся —
Буду як брусьнічка.

І ў замужжы параўноўваюць маладзіцу зь ягадкай, але зь іншым прыдыханьнем, іншым адценьнем:

— Яе мужык абабіў — сядзіць як чарнічына.

Тут ужо ягада не на смак бярэцца.

На разьмін

Пра вясну й восень кажуць: сок ёсь, хлеба нетуці, хлеб ёсь, соку нетуці.

Так і не сустрэнуцца.

Дадумаўся...

Калі ў старшыні аднаго з вушацкіх калгасаў у жахлівыя 30-я гады пыталіся, пра што ён думае, любіў адказаць жартам:

— Думаю калгас распусьціць…

Некалькі разоў так пажартаваў — і зьнік бясьсьледна.

Блёкі

У савецкія часы ўсё трэба было даставаць, выбіваць. Загадчык аддзелу культуры Вушацкага раёну Леў Рыгоравіч Міхайлаў дужа рупіўся пра сваю дзялянку. Рамантавалі мэмарыял «Прарыў» (спараджэньне савецкай гігантаманіі), трэба было дастаць ці асфальт, ці бітум. Паехаў Міхайлаў у Менск. У прыймовай адпаведнага міністра завозна, як на млыне да калектывізацыі. Усьміхаецца наш просьбіч сакратарцы, каб дапусьціла да бугра. Яна пытаецца:

— А ў вас блёкі ёсьць?
— Ёсьць, жалезабэтонныя.

Кіслы твар. Ад варот паварот. Блёкамі называлі падпіску на зборы твораў.

Ды што блёкі! Адзін вушацкі камандзіровачнік ня мог выпрасіць у Маскве ў сакратаркі, каб яна паставіла пячатку і даты прыезду й ад'езду. Усё круціла, задумвалася. А ў камандзіровачніка не засталося падарункаў. Нарэшце ўбачыла ў яго на пінжаку значок. Зацікавілася. Аддаў значок — паставіла пячатку й познаткі. Масква чужака ня бачыць безь ясака. А зь яе прыклад бралі астатнія.

Працяг будзе

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Віншуем Марыю Салаўёву і Аляксея Ігнатовіча, што пабраліся шлюбам! Жывеце ў шчасьці!

Нашаніўцы

ТАМАДА

Шукаю маршалка (тамаду) і музыкаў на вясельле, якое адбудзецца 5 ліпеня ў Менску. Т.: 263-23-89, 8-029-637-46-91

ВІТАНЬНІ

Шаноўны дарагі Васіль Быкаў! Зь вялікай радасьцю вітаю Вашае вяртаньне на Радзіму — нашу дарагую Беларусь. Віншую з Днём народзінаў! Зычу Вам здароўя і добрага настрою. Я Вас памятаю, люблю, чытаю. Памагай Вам Усёмагутны Бог! Яўгенія Казлова

Дачушку Янку Хмялеўскую віншуем з 16-годзьдзем! Шчасьця, посьпехаў, радасьці табе, няхай спраўдзяцца твае мары! Бацькі

Віншуем з 16-годзьдзем. Заставайся прыгожай, вясёленькай, разумнай. Ясі ад усіх сяброўак

Віншуем Марыю Салаўёву й Аляксея Ігнатовіча з пабіраньнем шлюбу! Тацяна і Ігар Роўды

Зычым любай матулі Аўгіньні Гучак добрага настрою ў Дзень народзінаў, здаровага доўгага жыцьця, цудоўных унучак. Тацяна Малашчанка, Юры Гучак

Віншуем даражэнькую Маці й бабулю Аўгіньню Гучак з 58-й гадавінай. Родныя

Любую сяброўку Ірышу віншую зь першым паўстагодзьдзем. Жывуць Беларусь і спэлеалёгія!

Кветка-Гануся, Лорд Алесь і Кавалачак Сонца, трымайцеся! Зычу вам спакою і цьвёрдасьці ў змаганьні з апошнімі цмокамі, годнай перамогі і хутчэйшага вяртаньня дадому. Ваша С.М.

НЕРУХОМАСЬЦЬ

Тэрмінова здыму аднапакаёвую кватэру з мэбляй (тэлефон не абавязкова) у любым раёне Менску на доўгі тэрмін для сябе. 8-029-755-80-01 (Алёна)

Купім кватэру без пасярэднікаў. Т.: 234-46-06

Здыму лецішча на ліпень, жнівень. Т.: 264-75-41

КНІГІ, МУЗЫКА

Кнігі — поштай. Замаўляйце каталёг: праз пошту — п/с 333, 220050, Менск; праз e-mail: exlibris@tut.by; праз Internet: http://exlibris.cjb.net; праз тэлефон: 8-029-643-57-33

Кнігі — поштай. Новае: часопіс «Спадчына» №4/2002

Прадам часопісы «Роднае слова» за 1996—2001 г. (35 тыс. руб.). Т.: 270-45-64

Набуду 1-ы том (Менск, 1996) з 4-тамовага збору твораў Р.Барадуліна. Т.: 270-45-64

Беларускія кнігі і часопісы, відэа і CD цяпер і ў Барысаве. Т.: (01777) 96-059

Olsa.by.ru — сайт беларускай сярэднявечнай музыкі

КАНТАКТЫ

Беларускія дзяўчаты! Напішэце, калі ласка, адзінотнаму беларускамоўнаму вайскоўцу (даруйце за банальнасьць). В/ч 92504-«Б», п/а Старое Сяло, 225039, Берасьце. Сяржук Матузка

Усё, Наталечка! Больш я цябе не кахаю. І больш я табе ніколі не патэлефаную. Сяржук

Будзь маёй жонкай! Безнадзейны

Цнянская рада «Маладога фронту» зьбірае сваіх сабраў штосерады ў 19.30 ля помніка Якубу Коласу

ПРАДАМ

Кампутарныя дыскі з гульнямі. Танна (2500). Т.: 235-01-65. Алесь

Электронную друкарку «Gabrielle 110 DS»: кірыліца і лацінка, дысплей (30 знакаў), памяць ды іншыя штукі. Т. (у працоўны час): 223-34-79. Крысьціна

CD з гербамі краінаў сьвету (і мапамі). Танна. E-mail: alehiv_st@tut.by

ПРАЦА

Дзяўчына, 24 гады (досьвед — 2 гады мэнэджэрам у сэрвісным цэнтры Samsung) шукае працу ў падобнай галіне. Т. 275-18-61, 8-029-750-22-83

Масажыст прапануе свае паслугі; масаж танны, але вельмі якасны. Т.: 8-029-756-81-99

Патрэбныя паслугі сумленнага сантэхніка. Замена трубаў каналізацыі ў доме пад Менскам. Т.: 223-34-79 (у працоўны час). Крысьціна

Пераклад зь нямецкай на расейскую/беларускую мовы альбо праца, з гэтым зьвязаная. А/с 250, 220005, Менск

Адказы на крыжаванку, зьмешчаную ў №22

ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 2. Такса. 6. Галіфэ. 7. Плютон. 9. Колер. 10. Крыт. 11. Гаць. 12. Вітажэнец. 14. Малекула. 16. Схованка. 19. Жабрак. 20. «Ікарус». 23. Кандыцыя. 25. Барвенак. 28. Антановіч. 29. Ліст. 31. Арда. 32. Тракт. 33. Ажэшка. 34. Эмісар. 35. Рытар.

ПА ВЭРТЫКАЛІ: 1. Плыт. 2. Тэкстыль. 3. Каложа. 4. Апранаха. 5. Стог. 6. Гарыла. 8. Націск. 12. Віктарына. 13. Цьвікевіч. 14. «Мужык». 15. Любан. 17. Нэрон. 18. Адсек. 21. Дыктатар. 22. Фарватэр. 24. Адліга. 26. Анадыр. 27. Інфант. 30. Трэк. 31. Аюсь.

«Наша Ніва» дзякуе за падтрымку А.З-чу і В.К-ву зь Менску.

ЦЫТАТНІК

Стаіць пад Грунвальдам Алёша

Амсьціслаў. Адзіны ў вобласьці гісторыка-археалягічны музэй, які знаходзіцца ў Амсьціславе, налічвае звыш паўтары тысячы экспанатаў. Унікальную знаходку зрабіў нядаўна на дне ракі Віхры былы вучань дырэктара музэю, які захапляецца падводным плаваньнем. Ён знайшоў шлем-шышак рускага воіна XIV ст. Цяпер шлем суседзіць у экспазыцыі з раней знойдзеным у рацэ шлемам эўрапейскага воіна XV ст. Па вызначэньні навукоўцаў Інстытуту гісторыі і археалёгіі Нацыянальнай акадэміі навук, шлем трапіў на Амьсцілаўшчыну з поля бою Грунвальдзкай бітвы.

«Магілёўскія ведамасці»

НЕЗНАРОК

Удасканалім моўныя недахопы!

Адна літара здольная ператварыць нудны тэкст у гумарэску. *Слонікавы запас школьнікаў* замест слоўнікавага, *дурналісты* замест журналістаў, *вялікая аўчынная вайна* замест айчыннай, *двухбыковае пагадненьне* заміж двухбаковага, *новае рыданьне кнігі* заміж новага выданьня, *фінанасавы* заміж фінансавага, *страшыня камісіі* (бываюць і такія), *Бедарусь*, урэшце... Здрыганецца рука падчас набору, націсьнецца «л» заміж «д» (яны побач на кампутарнай клявіятуры), і выйдзе *васьмігаловая дачушка*. А бывае, націскаюцца гэтыя літары абедзьве разам. І выходзіць *першага лістападла.* (Не шанцуе таму, у каго на календары вечна гэты месяц.)

А часам, ідучы за расейскай традыцыяй, людзі пішуць «е» там, дзе мусіць быць «ё»: *Пакуль есьць Купала — жыве Беларусь.* (Прачытаеш першую частку сказу, захочацца выправіць і другую — «жуе...».)

Амаль усе абдрукі — сапраўдныя, з сур'ёзных публіцыстычных або навуковых тэкстаў — я спаткала ў часе сваёй карэктарскай дзейнасьці.

Сэнсавыя памылкі часам такія яскравыя, што ня хочацца выпраўляць. Іх прычыны — шматзначнасьць выбранага слова, няправільнае словаўжываньне, уплыў расейскай мовы.

Выступоўцы ўдасканальвалі недахопы ў выказваньнях. Або: *У зборы твораў у чатырох тамах апошні радок адсутнічае. На месцы пропуску — купюра.* (Так і хочацца бегчы ў бібіятэку ды замаўляць збор твораў, у якім купюры ляжаць.) *Апэратар здымаў сьцяг, які вывешвалі воіны-вызвольнікі.* (Хто ні пачуе гэты выраз, дае загаловак — «Антымірон».) *Дасьледчык глыбока й прафэсійна разабраўся з паэзіяй М.Багдановіча.* Калі гэта пра Лукаша Бэндэ, дык чаму адзін толькі Максім згадваецца? І яшчэ крыху літаратурнага: *Размова пойдзе пра жыцьцядзейнасьць пісьменьніка на тэрыторыі Беларусі.* (Хочацца дадаць: і прадукты жыцьцядзейнасьці — ягоныя творы.)

А вось гісторыя: *Барбара за кароткі час свайго яднаньня з каралём ашчасьлівіла яго, а пасьля яе сьмерці Жыгімонт клапоціцца пра каралеўства й народ.* (Мо й добра, што Барбара Радзівіл памерла: кароль пра дзяржаву пачаў дбаць.)

Музыка: *Нейкі злы рок перасьледуе беларускі кінэматограф.* Уявілі сабе Кулінковіча й Вольскага, якія руйнуюць нашу кінастудыю?..

Невычэрпную фантазію й каўчукавыя языкі маюць тэледыктары. У гіт-парадзе моўных ляпаў яны назаўжды прыбітыя да першага месца. Тут камэнтары залішнія. *Сёньня былі ўскладнены кветкі да помніка Перамогі; Сьпявачка пакарала Парыж сваім голасам* (БТ). *...пачынаючы зь перацягваньня канату і шахматаў* (СТВ).

Назьбірала Крысьціна Курчанкова

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

Тэкст _____

_____

Імя і прозьвішча _____

Адрас, тэлефон _____

Менчукі!

Найтаньнейшая падпіска на «НН» — у «Менгарсаюздруку». Каштуе такая падпіска на месяц усяго 1360 рублёў (2043 рублі — калі падпісвацца празь «Белпошту»). Забіраць сваю газэту можна ў любой зручнай для Вас гандлёвай кропцы «Белсаюздруку». Друкуем адрасы пунктаў, дзе можна аформіць падпіску «Да запатрабаваньня».

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Участак падпіскі «Белсаюздруку»	
вул.Валадарскага, 16, пак.302	227-88-41
Пункты прыёму падпіскі:	
вул.Жукоўскага, 5, корп.1	224-32-03
пр.Скарыны, 113	264-22-91
вул.Раманаўская Слабада, 9	220-83-04
вул.Кашавога, 8	230-29-20
Крамы	
№1 вул.Жукоўскага, 5	224-03-76
№2 пр.Скарыны, 44	284-83-59
№3 пр.Скарыны, 76	232-46-23
№4 вул.Леніна, 15	227-11-92
№6 вул.Філімонава, 1	235-63-11
№7 вул.Коласа, 69	288-30-20
№8 вул.Сурганава, 40	232-45-10
№9 пр.Ракасоўскага, 140	247-30-15
№10 бульвар Шаўчэнкі, 7	233-74-88
№11 пр.Пушкіна, 77	255-80-71
№12 вул.Кіжаватава, 80	278-77-61
№13 вул.Каліноўскага, 82, корп.2	264-06-42
№14 вул.Валадарскага, 22	227-75-55
№15 вул.Танка, 16	223-82-39
№16 вул.Харужай, 24	234-27-25
№17 вул.Някрасава, 35	231-03-28
№18 мэтро «Плошча Перамогі»	284-31-06
№19 пр.Машэрава, 51, корп.1	223-81-66
№20 вул.Ясеніна, 16	271-87-21
№21 мэтро «Пушкінская»	255-57-20
№22 вул.Ілімская, 10, корп.2	243-16-83
№23 вул.Славінскага, 39	264-36-33
№24 вул.Жылуновіча, 31	245-05-74
№25 вул.Маркса, 21	227-08-52
Шапікі	
№2 Лінгвістычны ўнівэрсытэт, вул.Захарава, 21	
№18 Тэхналягічны ўнівэрсытэт, вул.Сьвярдлова, 13/4	
№18 Пэдагагічны ўнівэрсытэт, вул.Савецкая, 18	
№78 Гатэль «Юбілейны», пр.Машэрава, 19	
№95 Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, вул.Мясьнікова, 39	
№136 мэтро «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі фізвыхаваньня	
№187 Гатэль «Беларусь», вул.Старажоўская, 15	
№18 Аўтавакзал «Маскоўскі»	
№198 Эканамічны ўнівэрсытэт, пр.Партызанскі, 26	
№209 Прахадная МАЗу, вул.Сацыялістычная, 2	
№228 Унівэрсытэт культуры, вул.Рабкораўская, 17	
№232 Менскі завод халадзільнікаў, пр.Машэрава	
№245 Больніца хуткай дапамогі, вул.Кіжаватава, 56	
№259 Менскі дзяржаўны гандлёвы каледж, вул.Усходняя, 183	
№260 пр.Скарыны, 169	
№262 Гатэль «Плянэта», пр.Машэрава, 31	
№298 пр.Машэрава, 75/1	
№302 9-я больніца, вул.Сямашкі, 8	
№313 Слабадзкі праезд, 24	

КОНКУРС «НН»

Нянаскае «ф»

Справа з «спэктрам» крыху тармазнула, бо гэта задача ня з простых.

Строга кажучы, у нашай мове наагул няма словаў на літару «ф». Ці ня ўсе яны запазычаныя, а таму большасьць — з мудрагелістымі канчаткамі, якія вымушаюць рыфмаваць іх з гэткімі ж у словах на «ж» або «з». А гэта нават не для дзіцячага вуха гучыць ня надта каб гладка. Але гэта зусім не азначае, што мы мусілі б адмовіцца ад самой ідэі. Нехта, глядзіш, і прапануе тое, што «прыліпне да языка».

З другога боку, вы прапануеце арыентавацца на дзіцячае ўспрыманьне. Але парадак колераў у спэктры мусяць запамінаць у старэйшых клясах. Праўда, цяпер з гэтым паняткам знаёмяць ужо ў курсе «Сусьвет» (5—6 кл.). Дарэчы, тут уводзіцца і само слова «спэктар», і нават тлумачыцца залежнасьць колераў спэктру ад частаты выпраменьваньня, зруху спэктральных лініяў — ад хуткасьці крыніцы сьвятла і г.д.

Таму, мусіць, выйграе той, хто прапануе вырыянт, дзе спалучаліся б і лёгкасьць запамінаньня, і даступнасьць розным узростам, калі ж з навуковымі тэрмінамі, то каб без мудрагелістасьці. Ня выключана, што студэнты выберуць больш «дарослы» варыянт, а «ясельнікі» — просьценькі.

Тое, што дасылаю сам, не прэтэндуе на эталён. Проста хочацца запэўніць, што вашыя чытачы не забыліся на «фазана», а настойліва шукаюць «залатое зярнятка».

Чалавек, **А**валодай/**П**ацікаўся **Ж**ыцьцёвым **З**аконам — **Б**удуюцца **С**пэктры **Ф**атонам! **Ч**ас **А**бвяшчае/**П**адыходзіць, **Ж**онка **З**аенчыла, **Б**ацька **С**ьпяшаецца **Ф**эльчара. **Ч**орны **П**арыжанін **Ж**ан **З** **Б**эльвэдэру **С**краў **Ф**антан. **Ч**акае **А**браньніцу/**П**рыяцельку **Ж**ак, **З**апэцкаў **Б**укетам **С**вой **Ф**рак. **Ч**ыжыку — **П**рынадачку/**А**ладачку, **Ж**аўруку — **З**агадачку, **Б**елабока-**С**арока — **Ф**ыр-р!

Антон Бубала, Верхнядзьвінск

IN MEMORIAM

5 чэрвеня на 46-м годзе жыцьця адышоў Тамаш Вацка, кіраўнік Нарвэскага Хельсынскага камітэту, вялікі сябар Беларусі, які шмат рабіў, каб наша краіна захавала незалежнасьць. Яго будуць памятаць над Нёманам і Дзьвіною.

Знаёмцы

АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Наша Ніва
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі	Наста Бакшанская
галоўны рэдактар	Андрэй Дынько
выпускны рэдактар	Сяргей Ёрш
карэктар	Сяргей Петрыкевіч
карэктарка	Галіна Рабянкова
нам. галоўнага рэдактара	Андрэй Скурко
тэхнічны рэдактар	Андрэй Чык
выдавец і заснавальнік	Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Менск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32.
E-mail: nn@promedia.by
On-line: www.nn.by

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 8 палос фарматам А2. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а.

Наклад 3509.

Нумар падпісаны ў друк 18.06.2003.

Замова № 3116.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а